№ 7 (413) 18 лютага 2005 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы



**Найбольшыя за апошнія гады**
Акцыі пратэсту прадпрымальнікаў: «толькі без палітыкі».
старонка 2

**Наша страва**
Новая рубрыка «НН»: усё пра ежу традыцыйную і нетрадыцыйную.
старонка 16

**Ідэал мужчыны сёньня**
Лёлік Ушкін пра Сьвята сярэдняга бізнэсмэна.
старонка 24

СУЧАСЬНІКІ

### Кася

Пяць гадоў ёй забаранялі выступаць. Бог ты мой, як яны — прарасейскія халуі — баяцца беларускага слова, нашай песьні. Яны не дазваляюць нам выступаць па радыё і на тэлебачаньні, яны публічна зьневажаюць нашу культуру і мову. А мы? Чакаем, сьцяўшыся да болю, чакаем, бо верым у сваю праўду. **Старонка 20.**

СУДЫ

### Рыбачкова доля

«Рыбачок» — так клікалі былога дырэктара на БТ — слухаў прысуд, напружана пагойдваючыся на абцасах. **Старонка 3.**

ПАЛІТЫКА

### «Мілінкевіч фюрэрам ня будзе»

Партыя БНФ вылучае Аляксандра Мілінкевіча кандыдатам на прэзыдэнцкія выбары. **Старонка 14.**

ВЕРА

### Апошняя сьведка Панны Марыі

Памерла тая, каму Маці Божая расказала пра лёсы сьвету і Расеі. **Старонка 2.**

КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

### Пусты дом

Маўклівы юнак пранікае ў чужыя пустыя дамы. Там ён адпачывае, мые гаспадарскую бялізну, рамантуе зламаныя рэчы. Раніцай зьнікае, нічога ня ўзяўшы. У адной з кватэр юнак сутыкаецца зь пекнай фотамадэлькай. **Старонка 23.**

### Дык падпісвайся!

Падпісны індэкс «Нашай Нівы» 63125. Падпіску прымаюць на любой пошце, а ў Менску — і на шапікі «Белсаюздруку». Цана на месяц — 3820 рублёў на поштах або 3530 рублёў на шапікі «Белсаюздруку». «Наша Ніва» — гэта 24 старонкі без чужога слова штотыдзень. Чытай сваё!

# Рызыкоўная барацьба намэнклятуры

Ці можна было ўратаваць Беларусь ад сталінскага генацыду? Так, калі б яе да 1930 году ўдалося адарваць ад СССР. **Алесь Аркуш** мяркуе: беларускім нацыянал-камуністам проста не хапіла на гэта часу. Ён даказвае, што змова дзеля здабыцьця для Беларусі поўнае незалежнасьці ўсё ж існавала. А цэнтар яе быў не ў асяродку інтэлігенцыі, а ва ўрадзе БССР. 75 гадоў таму, 17 лютага 1930 году, пачалася справа «Саюзу вызваленьня Беларусі», якую можна лічыць пунктам адліку сталінскага генацыду ў Беларусі.

З арышту Пятра Ільлючонка 17 лютага 1930 году пачаўся разгром нацыянальнае эліты сталіністамі. Па справе «СВБ» воля да супраціву была зломленая. Пасьля 17 лютага будуць толькі арыштоўваць і арыштоўваць. Межы закрыліся, абцугі сьціснуліся, машына дэзінфармацыі будзе працаваць гэтаксама эфэктыўна, як машына масавага забойства. У Курапаты паедуць камуністычныя душагубкі, у Варкуту — цягнікі. А ахвяры, нібы каларадзкія жукі ў вядры, падзеляцца на тых, хто пакорліва чакае выраку на дне, і тых, хто вылазіць па галовах братоў, як многія будучыя народныя паэты і акадэмікі. Сталіністы сьвядома і мэтанакіравана выбівалі самых энэргічных, самых адукаваных, самых-самых... Беларусь страціла 200 тысячаў жыхароў.

У позьнесавецкі пэрыяд дасьледчыкі выстаўлялі «СВБ» зь яго 108-мю сябрамі прыдумкай чэкістаў.

Працяг на **старонцы 13**.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Жонкі палітыкаў

**На фота: Сьвятлана Лябедзька.**

Пакажы мне тваю жонку, і я скажу, хто ты. Так можна перафразаваць вядомы афарызм. Жонкі палітыкаў першага эшалёну аўтаматычна ператвараюцца ў публічных асобаў. Магчыма, лёс выбараў-2006 вырашыць менавіта кандыдатка ў першыя лэдзі... Што ўжо казаць пра палітыкаў, жонкі якіх не ўспрымаюць мужавага занятку ўсур'ёз? Фотакарэспандэнтка «НН» сустрэлася з жонкамі папулярных беларускіх палітыкаў — тымі, якія «ўсур'ёз». **Старонка 12.**

## 50 РАДКОЎ РЭДАКТАРА

ПАЛІТЫКА. Міністарка замежных справаў Швэцыі заявіла ў Рыксдагу аб праве беларусаў жыць у эўрапейскай сям'і народаў (**старонка 11**). Беларусь — суб'ект сусьветнай палітыкі. Яшчэ 50 гадоў таму ўсё было зусім інача. Малалікія нацыянальныя асяродкі лічылі посьпехам любую згадку назвы «Беларусь» на дыпляматычным узроўні — пра гэта апавядаецца ў новай кнізе А.Надсана пра біскупа Сіповіча. Ніколі не было такой спрыяльнай каньюнктуры для рэалізацыі ідэалаў нацыянальнага адраджэньня, як цяпер. Верыцца, што палітычныя сілы не збаёдаюць 2006 год. Інакш, што чакае краіну? Лукашэнка недвухсэнсоўна намякнуў сваім загадам будаваць лядовы гіпэрпалац і дабіцца правядзеньня ў Менску сусьветнага чэмпіянату па хакеі ў 2010 годзе. Якраз пад выбары 2011-га.

ДУША. Пачуцьці сучасных беларусаў і іх веру перадае Адам Глёбус у сваім пранікнёным апісаньні канцэрту Касі Камоцкай (**старонка 20**). Не прапусьцеце сёньняшняй падборкі «Сучасьнікаў».

ЖАНКІ. Хочацца, каб наш палітычны выбар быў асэнсаваным. Хочацца параўноўваць праграмы, чуць палітыкаў. Дзяржаўныя СМІ не даюць такой магчымасьці. Улады зноў мабілізуюць тэлебачаньне на «інфармацыйную вайну». А «НН» прапануе ўчытвацца, углядацца і быць адказнымі грамадзянамі сваёй дзяржавы. Жонкі палітыкаў — **старонка 12**.

## ПОШТА РЭДАКЦЫІ

### Азаранку — у глянец

Пасьля перамогі Вікі Азаранкі ў юніёрскім разрадзе на Australian Open міжволі падумалася, як добра глядзелася б гэтая дзяўчына на вокладцы якога-небудзь глянцавага часопісу. Аднак нават нуглянцавых спартовых часопісаў у нас няма. Усё спрэс чужое. Перадусім расейскае. Мы запраграмаваныя на каляніяльную сьвядомасьць, пакуль падлеткі будуць чытаць расейскія «Cool» і «OOPS». Аднак мяне не пакідае надзея, што і нашы зоркі зьявяцца на глянцавых вокладках.

**Зьміцер Панкавец, Кастрыца**

## ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

### Вечар з Вольскім і Русяй

**18 лютага** (пт) у клюбе «Рэактар» — канцэрт «Дзень Зялёнага дрэва». Гэта патройная прэзэнтацыя: «Indiga» прадстаўляе альбом «Dni», «Zet» — «Чорны альбом», а «IQ-48» — «Вар'яты». Пачатак у 18.00. Даведкі па т.: 228-61-60, 268-61-07.



## Дзеяслоў №13

У новым нумары часопісу «Дзеяслоў» — лісты Уладзімера Караткевіча да Ларысы Геніюш, вершы Ігара Бабкова, п'еса Аляксандра Ірванца ў перакладзе Уладзімера Арлова, аповесьць Уладзімера Някляева «Мірон ды Мірон». Пытайцеся ў незалежных распаўсюднікаў.

# Найбольшыя за апошнія гады

акцыі пратэсту прайшлі пад эканамічнымі лёзунгамі. Малы беларускі бізнэс стварае ўраду вялікія праблемы: 10 лютага 70 тысяч рынкавых гандляроў правялі папераджальныя страйкі ды мітынгі. Новая сыстэма сплаты ПДВ падрывае іх бізнэс. Прадпрымальнікі не гатовыя перайсьці да палітычных патрабаваньняў. Тым часам падатковыя службы ня здольныя ўпарадкаваць новую сыстэму збору падаткаў. Рэпартаж **Алеся Кудрыцкага** з плошчы Незалежнасьці.

Ленін на плошчы Незалежнасьці даўно ня меў такой кампаніі. 10 лютага пад сьцены парлямэнту сышоўся «бізнэс-пралетарыят» — найдрабнейшыя з малых прадпрымальнікаў, рынкавыя гандляры-палатачнікі, карацей — «вашывыя блохі». Сталічныя рынкі зачыніліся — усе пайшлі на страйк. Ад Міністэрства эканомікі, па вузкім праходзе між кратэрам «Падземнага гораду» ды гмахам Дому ўраду, дзьве-тры тысячы чалавек рушылі да Міністэрства падаткаў і збораў і заблякавалі галоўны ўваход.

Міліцыя ды ахова ў цывільным трымалася ціха. Сакратаркі, рагочучы, прыціскалі да шыбаў носікі, а важныя начальнікі асьцярожна выглядалі адным вокам, адсунуўшы фіранкі. «Далоў ПДВ!» — адбівалася рэхам ад міністэрскіх сьцен.

Хоць грамада глядзелася досыць унушальна, вынасу адмены ПДВ на спадачку яна не дачакалася. Праз ахову перадалі: аніякіх перамоў, пакуль ня сыдзеце з уваходу. Людзі паслухмяна зрабілі крок назад, але потым зноў заблякавалі выхад.

Працяг на старонцы 5.

# Мальцаў у Мюнхене



Афіцыйны Менск паступова прыходзіць да разуменьня, што з Захадам неабходна ня проста суіснаваць, але і супрацоўнічаць. Але прызнаць гэта публічна ўлады яшчэ не гатовыя, піша **Раман Якаўлеўскі**.

Беларуская дэлегацыя на чале зь міністрам абароны Леанідам Мальцавым упершыню ўзяла ўдзел у 41-й Мюнхенскай канфэрэнцыі па пытаньнях палітыкі бясьпекі. У гэтым мерапрыемстве ўдзельнічалі кіраўнікі абаронных і замежнапалітычных ведамстваў, прыметныя палітыкі з 40 краін. Вельмі дзіўным выглядала магільнае маўчаньне дзяржаўных СМІ Беларусі, якія практычна праігнаравалі трохдзённую работу Мюнхенскай канфэрэнцыі.

У Менску ніхто толкам ня мог сказаць, што рабіў у Мюнхене міністар абароны. У ягоным ведамстве, ва ўпраўленьні міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва, нехта маёр Калодкін на поўным сур'ёзе адказваў, што пералік мюнхенскіх сустрэч кіраўніка генэрала Мальцава не падлягае абвяшчэньню. Зрэшты, падкрэсьлю той жа маёр, як і акалічнасьці нечаканага зьяўленьня міністра ў Варшаве, дзе ён, будучы праездам у Нямеччыну, сустрэўся зь дзяржаўным падсакратаром міністэрства нацыянальнай абароны Мацеем Гурскім. Такі няроўны ўзровень (падсакратар — намесьнік намесьніка міністра) удзельнікаў сустрэчы ў Варшаве таксама выклікаў пэўную цікавасьць. Асабліва калі стала вядома, што гэтая сустрэча адбылася па ініцыятыве беларускага боку.

Тым ня менш, гутарка з панам Гурскім, трэба меркаваць, аказалася карыснай. Паводле неафіцыйнай інфармацыі, чакаецца, што новы ваенны аташэ Польшчы зьявіцца ў Менску ў першай палавіне сакавіка.

У апошнія гады Мюнхенская канфэрэнцыя праходзіць пад лёзунгам «Мір з дапамогай дыялёгу» і ахоплівае як ключавыя глябальныя праблемы і канфлікты, так і прадстаўнікоў усіх рэгіёнаў сьвету. Шчыры абмен думкамі адбываецца як у шматбаковым афіцыйным, так і ў шматлікіх канфідэнцыйных фарматах.

Паводле слоў каардынатара Беларускага эўраатлянтычнага форуму Андрэя Фёдарава, прысутнасьць беларускага міністра абароны на такой фундамэнтальнай канфэрэнцыі, як мюнхенская, можа азначаць толькі тое, што пры ўсім унутраным непрыманьні Захаду — і асабліва яго палітыкі ў сфэры бясьпекі — афіцыйны Менск паступова прыходзіць да разуменьня, што зь ім трэба ня проста суіснаваць, але і супрацоўнічаць.

# Апошняя сьведка Панны Марыі



не жыве. Гісторыя касьцёлу ведае шмат візіянэрскіх культаў. У мінулым стагодзьдзі найбольшую славу здабылі падзеі ў партугальскім мястэчку Фатыма. У сераду Партугалія хавала апошнюю сьведку зьяўленьня Маці Божай у Фатыме.

«Я ня ведаю, хто ў гэтай краіне ня бачыць відзежаў», — напісаў партугальскі пісьменьнік Жазэ Сарамага.

Візіянэрства можна лічыць часткай партугальскага нацыянальнага характару. Само ўзьнікненьне Партугаліі як дзяржавы зьвязваюць са зьяўленьнем крыжа ў небе, сьведкам чаго быў першы партугальскі кароль Афонсу Энрыкеш. Калі ж у XVI ст. Партугалія страціла незалежнасьць, шырокае распаўсюджаньне атрымала легенда пра схаванага караля. Так называлі Сэбасьцьяна I (1554—1578), прадстаўніка Бургундзкай дынастыі. Яго зьнікненьне ў Марока — партугальскае войска разам са шматлікімі вяльможамі і ўсімі інфантамі было зьнішчана мусульманамі — стала непасрэднай прычынай страты краінай самастойнасьці. У краіне не засталося прадстаўнікоў каралеўскай дынастыі, здольных працягнуць род.

Вера ў вяртаньне дона Сэбасьцьяна аказалася надзвычай моцнай.

Працяг на старонцы 11.

# Наша страва

**АЛЕСЬ БЕЛЫ**



Беларуская кухня не сфармуляваная як канон. Якую нацыянальную страву, апроч дранікаў, зможа назваць выпадковы мінак? Кулінарная глябалізацыя разгортваецца ва ўсе бакі, і кухня кожнай нацыі робіць свой унёсак у гэты сусьветны кірмаш. Змагацца з гэтай глябалізацыяй можна, толькі ўдзельнічаючы ў ёй. Што можа даць сьвету беларуская кухня? Больш няма смаргонскіх абаранкаў, дубровенскіх пернікаў, літоўскага сыру, дзісенскага масла, вязынскага портэру. Ніхто ня ведае культурнай гісторыі страў, якія стагодзьдзямі былі на сталах нашых продкаў. Што знае сёньняшні беларус пра лазанкі, верашчаку, вэнджаных паўгусак, калдуны патышкевічаўску, балероны ды кіндзюкі? Хто пячэ на 25 Сакавіка славутых галёны? Куды прасцей звыкла наракаць на падступных суседзяў, чым спрабаваць адваяваць у іх гістарычнае права на адны і тыя ж стравы, рэцэпты ды рытуалы спажываньня.

Дзе можна сёньня знайсьці абы-якую традыцыйную беларускую карчму і што гэта ўвогуле такое? Страўня, слова, невядомае ніводнаму слоўніку, сёньня кідае сарамлівы да прыхаваны выклік афіцыёзнаму «беларускаму бістро» — хаця за абедзьвюма канцэпцыямі, вельмі дрэнна распрацаванымі ў эстэтычным ды гістарычным аспэктах, стаяць, як правіла, прадпрымальнікі, вельмі блізкія да афіцыёзу — аднак мала абазнаныя ў гісторыі матэрыяльнай культуры.

Палітычныя катаклізмы XX ст. цалкам зьнішчылі цэлыя сацыяльныя клясы былой Беларусі — шляхту і мяшчанства, носьбітаў высокай матэрыяльнай і духоўнай культуры, а з тым ліку кулінарнай. Ідэя пра існаваньне ці магчымасьць стварэньня беларускай нацыянальнай кухні ўзьнікла толькі пасьля II сусьветнай вайны, і да канца XX ст. адзінай крыніцай яе магчымай рэканструкцыі лічылася этнаграфічная спадчына былога прыгоннага сялянства, зафіксаваная ў пэрыяд распаду яго традыцыйнага ладу жыцьця. Задача стварэньня паўнавартаснай беларускай нацыянальнай кулінарнай і гастранамічнай культуры, якая абапіраецца як на «народныя», так і на «высокія» традыцыі, дагэтуль застаецца актуальнай.

Новую рубрыку «НН» адкрывае артыкул гісторыка Алега Дзярновіча пра апэльсін. Спаўняецца 500 гадоў, як ён трапіў на беларускія сталы.

**Старонка 16.**

# Рыбачкова доля

Былому кіраўніку НДТРК далі 11 год калёніі

11 лютага завяршылася яшчэ адна гучная антыкарупцыйная справа. У Вярхоўным Судзе абвясьцілі прысуд Ягору Рыбакову, былому старшыню Белтэлерадыёкампаніі. Экс-начальнік НДТРК атрымаў 11 год калёніі строгага рэжыму, канфіскацыю маёмасьці ды забарону займаць кіраўнічыя пасады цягам пяці год. Да красавіка Рыбакоў павінен кампэнсаваць 213 млн рублёў страт, якія ён нанёс тэлебачаньню. Судовая пошліна таксама немалая — 10% ад сумы гэтых страт. Такіх суровых прысудаў былым людзям Лукашэнкі яшчэ не давалі.

Рыбакову 33 гады, аднак ён заўсёды выглядаў маладзейшым за свой узрост. Праўда, пасьля гадавой адседкі ў сьледчым ізалятары здаровы сібірацкі румянец (Рыбакоў нарадзіўся ў Новасібірску) зьнік. Словы судзьдзі Рыбакоў слухаў напружана, пагойдваючыся на абцасах. У залі былі спрэс журналісты — былыя суседзі Рыбакова па высокіх тэлевізійных кабінэтах на зачытаньні прысуду не прысутнічалі. Выклікаць да сябе падазрэньне празьмернай цікавасьцю да лёсу былога боса нікому не хочацца: так і ў «распрацоўку» патрапіць нядоўга.

Рыбакоў любіў ня толькі грошы, але й рэчы і ніколі гэтага асабліва не хаваў. Калі судзьдзя пачаў пералічваць маркі канфіскаваных у Рыбакова наручных гадзіньнікаў, па залі прабегла ажыўленьне. «Рыбачок» — так за вочы клікалі былога дырэктара на тэлебачаньні — слухаў прысуд у добрым пінжаку ды нятаннай на выгляд блакітнай кашулі. На жаль, гальштукі вязьням не дазваляюцца. Дарагая вопратка заўжды была ягонай слабасьцю, а гальштукі — асобнай тэмай для размоў у тэлевізійных курылках. Казалі, што Рыбакоў гэты аксэсуар гардэробу падбіраў асабліва старанна і на гальштукі, таньнейшыя за сто даляраў, нібыта нават глядзець не хацеў.

За Рыбаковым слова «рэйтынг» было сьвятым. На БТ існавала ўстаноўка на атрыманьне максымальных прыбыткаў ад рэклямы. Таму чуткі, што менавіта тут робіцца галоўныя шэрыя грошы, хадзілі даўно.

Серабрысты «мэрсэдэс», які раней падвозіў да шклянога ўваходу на Макаёнка Рыбакова, цяпер возіць Уладзімера Мацьвейчука. Панятак «рэйтынг» для цяперашняга дырэктара БТ мала знаёмы, як, дарэчы, і слова «журналістыка». Прафэсійны ідэоляг


PHOTO.BYMEDIA.NET

з полацкага «Шкловалакна», ён нашмат больш ахвотна займаецца бягучымі кадравымі пытаньнямі, чым творчымі тэлеэкспэрымэнтамі.

У адказ на просьбу пракамэнтаваць прысуд Рыбакоў адмоўна пахітаў галавой і пачаў перамаўляцца з адвакатам праз клетку. У ягоных вачах выразна праглядалася разгубленасьць, калі не сказаць роспач. Цяпер ягоная справа папоўніць сухую статыстыку.

Надоечы Мінстат выдаў зьвесткі па эканамічных злачынствах за мінулы год. Як выявілася, у параўнаньні з 2003 г. іх колькасьць скарацілася на 11%. Ці то красьці пачалі радзей, ці то робіць гэта больш прафэсійна. Летась распачалі больш за дзесяць тысяч крымінальных справаў «за эканоміку». Цікава, што статыстыка пайшла ўніз за кошт злоўжываньняў службовым становішчам — колькасьць такіх выпадкаў скарацілася на 11%. А вось хабарніцтва расквітнела. У 2004 г. міліцыя засьпела на гарачым 1046 хабарнікаў — на 13% больш, чым летась.

Буйныя антыкарупцыйныя справы апошніх месяцаў хоць і маюць розгалас, але не прымаюць у дзяржаўных мэдыях фармату чарговай антыкарупцыйнай кампаніі. Лукашэнку яна цяпер нявыгадная: нашто паказваць, што і празь дзесяць год ягонага прэзыдэнцтва карупцыя квітнее пышным цьветам.

**Алесь Кудрыцкі**

# «Шанцы большасьці вылучаных блізкія да нуля»

Першыя крокі кампаніі прэзыдэнцкіх выбараў камэнтуе палітоляг **Андрэй Казакевіч**, галоўны рэдактар часопісу «Палітычная сфера».

**«НН»: Поўным ходам ідзе вылучэньне прэтэндэнтаў на адзінага кандыдата ў прэзыдэнты. Ці сапраўды выбараў можна чакаць ужо ў 2005-м?**

**Андрэй Казакевіч:** З імавернасьцю 60—65% можна сьцьвярджаць, што выбары адбудуцца ў 2006 г. Хоць некаторыя экспэрты адзначаюць, што для Лукашэнкі найлепей пераабрацца ў найбліжэйшай будучыні, пакуль добрая эканамічная каньюнктура і моцныя палітычныя пазыцыі ўлады. Але няма падстаў меркаваць, што спрыяльныя для Лукашэнкі ўмовы праз паўтара году пагоршацца.

**«НН»: Вашы ацэнкі пачатку кампаніі па вызначэньні «адзінага» ад дэмакратаў? Наколькі прафэсійна дзейнічаюць вылучаныя кандыдаты?**

**АК:** Пра сур'ёзнае вылучэньне адзінага кандыдата я б пакуль што не казаў. Партыі толькі заяўляюць пра свае пазыцыі. Пакуль усё праходзіць дастаткова цывілізавана і спакойна.

**«НН»: У чым плюсы і мінусы кандыдата ад партыі і кандыдата незалежнага?**

**АК:** Кандыдат ад партыі, на маю думку, пры іншых роўных умовах, менш прымальны. Рэпутацыя партый добра запэцкана дзяржпрапагандай. Але галоўны момант — рэўнасьць з боку іншых партый. Партыям лягчэй пагадзіцца на ўмоўна нэўтральную фігуру і такім чынам паразумецца. Зь незалежнага кандыдата лягчэй зьляпіць што хочаш. Партыйны кандыдат ужо сфармаваны, у яго свой імідж, і пазыцыю яму зьмяніць ня так проста.

**«НН»: Якія пэрспэктывы вымалёўваюцца перад прарасейскімі палітыкамі?**

**АК:** Расейскі фактар не прынцыповы. Большасьць выбарцаў арыентуюцца на ўнутраныя праблемы і шукаюць выйсьця са складанай эканамічнай сытуацыі ў межах Беларусі. Значыць, тут няма перавагі з электаральнага гледзішча, але ёсьць палітычны момант: прарасейскі кандыдат можа атрымаць падтрымку Захаду як дэмакратычны і адначасова падтрымку Расеі, што за-


АРЦЕМ ЛЯВА

бясьпечыць максымальна спрыяльную заменжапалітычную сытуацыю падчас выбараў. У той жа час большасьць палітыкаў усьвядомілі, што на экспарт дэмакратыі з Расеі спадзявацца не выпадае. З мэтай дэмакратызацыі Беларусі Расея ня будзе падтрымліваць нікога.

**«НН»: Кандыдатаў вылучылі АГП, камуністы, БСДГ, кааліцыя «Свабодная Беларусь», Беларуская партыя зялёных, БНФ. Як ацэньваеце іх шанцы?**

**АК:** Шанцы большасьці зь іх я ацэньваю блізкімі да нуля. Пра мінусы партыйнай прыналежнасьці я ўжо казаў. Нават той жа Мілінкевіч пасля вылучэньня ад партый будзе жорстка асацыявацца з партыйнымі структурамі, ня кажучы пра Лябедзьку, нефармальнага лідэра апазыцыі. Да Статкевіча нават у межах «Пяцёркі» мала даверу, ня кажучы пра шырокія колы. Калякін пэўны час разглядаўся ў якасьці асобы, якая магла б задаволіць шырокія дэмакратычныя колы. Але імідж камуніста яго моцна абмяжоўвае.

**«НН»: Людзі галасуюць у значнай ступені за асобу, а не за палітычную пазыцыю. Хто, на Вашу думку, у гэтым сэнсе самы яскравы канкурэнт прэзыдэнту?**

**АК:** Асоба ствараецца падчас кампаніі. Спачатку мы будзем мець нейкую пэрсону, зь якой будзе ствараца асоба (імідж, вобраз). Яна мусіць выйгрышна выглядаць на фоне Лукашэнкі. Гатовых асоб з усталяваным іміджам, электаральнымі пазыцыямі, як Ючшанка ва Ўкраіне, у нас няма. І мая шанцаў, што нехта зь іх раптам зьявіцца ў будучыні. Для стварэньня асобы патрэбен час. Гэта праблема беларускай апазыцыі і прычына таго, што перамога ў 2006 годзе малаімаверная. Калі кампанія будзе пасьпяховай, большасьць людзей будуць галасаваць ня столькі за асобу, колькі за пазыцыю, якая будзе апаніраваць пазыцыі ўлады. Выбарчая кампанія ў Беларусі вызначаецца моцнай палярызацыяй у параўнаньні зь іншымі большменш дэмакратычнымі краінамі. Асабістыя якасьці асобы кандыдата будуць адыгрываць другасную ролю. На першым месцы — палітычная пазыцыя.

**«НН»: Ці маюць нейкія шанцы такія палітыкі, як А.Клімаў, П.Краўчанка, З.Пазьняк, А.Вайтовіч, «вылучэнец Байнэту» У.Мацкевіч?**

**АК:** Андрэй Клімаў — вельмі карысная фігура. Ён істотна ажывіў палітычны ляндшафт сваімі кнігамі, экоцэнтрычнымі паводзінамі. Але разьлічваць, што ён будзе сур'ёзным кандыдатам, ня варта. Своеасаблівы фальстарт, зроблены Клімавым, дазволіў праверыць пэўныя хады гульцоў на палітычным полі, нешта падказаў у дзеяньнях. Кніга пра паўстаньне актуалізавала для абмеркаваньня важную праблематыку ў колах апазыцыі.

**Працяг на старонцы 14.**

## СЬЦІСЛА

### Дзень Сымана

Беларускі біятляніст Аляксандар Сыман сэнсацыйна завяваў у сераду «золата» ў спрынце на 10 км у славенскай Паклюцы ў рамках восьмага этапу Кубку сьвету. Гэта першая перамога Сымана на этапах. Раніцай 16 лютага Аляксей Айдараў таксама стаў першым у спрынце на 10 км на чэмпіянаце Эўропы па біятлёне ў расейскім Новасібірску.

### Як адстаяць Дом літаратара

Адміністрацыя прэзыдэнта папярэдзіла Саюз пісьменьнікаў, што неўзабаве канчаткова выселіць яго з Дому літаратара. Такі адказ прыйшоў на ліст шасьці пісьменьнікаў-вэтэранаў з прапановай стварыць у былым кабінэце М.Танка мэмарыяльны пакой ягонага імя. Цяпер СП займае гэты кабінэт, палову бібліятэкі й тры пакоі для захаваньня архіваў. З СБП таксама зьбіраюцца спагнаць 113 млн руб. запазычанасьці за камунальныя паслугі. Апошнія спадзевы на сход Літфонду 25 лютага. Хіба яшчэ на публічны пратэст і дзяжурствы літаратараў у сваім кабінэце.

### Чарговая справа за паклёп

У дачыненьні да дэпутата Маларыцкага райсавету ад БНФ Уладзімера Малея заведзена крымінальная справа за паклёп на старшыню райвыканкаму Казімера Лапіча. На думку пракуратуры, ганебныя зьвесткі ўтрымліваліся ў дэпутацкім лістку «Наша слова». Там вялося пра перадачу службовае кватэры былому старшыні выканкаму.

### Падатковая запрашае

Поўным ходам ідзе кампанія падачы падатковых дэклярацыяў. З 10 лютага інспэкцыі сталіцы павялічылі працоўны дзень: у будні — з 8:45 да 20:00, у выходныя — з 9:00 да 15:00.

### Беды студэнтаў ЭГУ

Экс-студэнтам ЭГУ, навучэнцам Вышэйшай школы адміністрацыі ў Беластоку, бракуе грошай. 10 студэнтаў вучацца задарма і маюць льготны інтэрнат. А трэба ж есьці, апранацца. Дапамогу абяцаюць Беларуская асацыяцыя студэнтаў і мэр.

### 7 сакавіка — выходны

Саўмін перанёс працоўны дзень з панядзелка, 7 сакавіка, на суботу, 12 сакавіка. Такім чынам, 8 Сакавіка можна пачаць адзначаць ужо 5 сакавіка.

### Ючшанка пераглядае вынікі прыватызацыі

Украінскія суды разгледзяць акалічнасьці прыватызацыі 3000 прадпрыемстваў. Адпаведнае рашэньне прынята Генпракуратурай пасьля праверкі прыватызацыі за апошнія 5 гадоў.

**АВ, АГ; svaboda.org**

# Бігборды ў цемры,

## альбо Няхай сабе паклёпнічаюць

За кожнай жа з савецкіх рэспублік былі замацаваныя свае патрыятычна–прамысловыя брэнды. У Беларусі гэта былі плошча Перамогі, МАЗ, трактары, вырабы з саломкі й партызанскі імідж. За 14 гадоў незалежнасьці краіна зьмянілася непазнавальна. Але плякаты з каўбоямі Мальбара, аўтамашынамі «Форд» і швайцарскімі гадзіньнікамі ўсё яшчэ глядзяцца чужародна на агульным фоне. Пра сёньняшні беларускі брэндынг разважае **Віталь Тарас**.

Адна паважная беларуская газэта скрытыкавала нейк яшчэ больш паважную брытанскую «Таймс». Праўда, крытык, пэўна, ня ведаў, што ад нядаўняга часу гэтая газэта добраахвотна перайшла ў разрад «жаўтаватых». Але ня ў тым рэч. Аўтар паважнай газэты сьцьвярджае, што брытанскі журналіст нібыта напісаў пра Менск няпраўду, прычым тройчы. Па-першае, што аэрапорт «Менск-2» амаль не асьветлены, бо там эканомяць электрычнасьць. Па-другое — нібыта абапал дарогі з аэрапорту ў Менск зусім мала бігбордаў. І па-трэцяе — на вуліцах беларускай сталіцы зусім мала аўтамашын.

Не зьбіраюся палемізаваць зь беларускім выданьнем і тым больш абараняць лёнданскую «Таймс». Зазначу толькі, спаслаўшыся на асабісты досьвед: калі прыяжджаеш у менскі аэрапорт гадзіны да шостай раніцы, там вельмі проста можна зламаць нагу ў цёмных калідорах і на эскалятарах, якія амаль заўсёды адключаны — відаць, таксама дзеля эканоміі. Што да бігбордаў, дык кожны, хто хоць аднойчы выяжджаў у Латвію, Літву ці Польшчу, павінен прызнаць, што на тамтэйшых дарогах іх значна болей, чым у Беларусі. Таксама як і машын на вуліцах. Асабліва калі параўноўваць Менск з такім мэгаполісам, як Лёндан зь яго транспартнымі праблемамі. Дый дзякаваць богу, урэшце!

Трэба ўзяць пад увагу, што які-небудзь сярэдні брытанец, прачытаўшы нешта падобнае, наўрад ці зьменіць сваё стаўленьне да Беларусі, калі яно ўвогуле ў яго было. Мяне больш цікавіць тое, што апошнім часам прынята называць модным словам «брэнд».

Што можна лічыць брэндам сучаснай Беларусі? Ці дбае нехта пра яго ўвогуле? Што, на думку тых, ад каго залежаць у пэўнай ступені тыя самыя брэнды або імідж краіны, можа быць прыцягальным для замежніка?

Гэта можа быць і тэмай асобнай дысэртацыі для кагосьці. Але ж я абмяжуюся ўсяго толькі некаторымі развагамі. За савецкім часам усё было вельмі проста. Для Савецкага Саюзу ў цэлым замежніку ў якасьці брэнду прапаноўваліся Красная плошча разам з маўзалеем і пэрманэнтнымі вайсковымі парадамі, Вялікі тэатар і матрошкі. За кожнай жа з савецкіх рэспублік былі замацаваныя свае, так бы мовіць, патрыятычна-прамысловыя брэнды. У Беларусі гэта былі плошча Перамогі, МАЗ з эмблемай-зубром на капоце, трактары і вырабы з саломкі. Ну і, зразумела ж, імідж рэспублікі-партызанкі. Замежнік, на думку тагачаснага партыйнага прапагандыста, мог прыехаць у краіну толькі й выключна дзеля таго, каб паглядзець, як сыходзяць новыя машыны з канвэеру, ускласьці кветкі да помнікаў ІІ сусьветнай вайны і на разьвітаньне купіць сабе сувэнір.

Яшчэ нейк у «ЛіМе» на пачатку 1980-х гадоў я атрымаў заданьне напісаць пра нейкіх прафсаюзных актывістаў, якія наведалі сталіцу Беларусі, і пра тое, што іх тут уразіла. Заданьне я выканаў, але больш нуднай працы ў жыцьці ніколі не даводзілася рабіць. Па-першае, незразумела, чаму сам факт прыезду замежнікаў у Менск павінен быў зацікавіць беларускага чытача — а трэба ж было гэта нейк абгрунтаваць! Па-другое, самі прафсаюзныя актывісты, якія прыехалі аднекуль з Уэльсу, яўна не былі надта ўражаны ўбачаным — ва ўсякім разе, гатэлем «Турыст», дзе іх пасялілі і дзе раніцай не было гарачай вады, дакладна. Большасьць гасьцей былі людзьмі пэнсійнага або перадпэнсійнага ўзросту. Па іх выглядзе, вопратцы і манерах адчувалася, што ў Менск гэтых турыстаў прывяло не жаданьне ўбачыць усходнюю экзотыку і тым больш не інтэрнацыянальны абавязак, а проста сьціплыя магчымасьці для нармальнага, камфортнага адпачынку. Ну і яшчэ, можа, там у іх былі нейкія цэхавыя, прафсаюзныя абавязкі, накшталт — мінулым разам да нас прыяжджалі таварышы з Малдаўскай ССР, а гэтым разам мы павінны наведаць нашых сяброў у БССР.

Чаму я так падрабязна спыняюся на гэтым малацікавым эпізодзе? Ды таму, што такімі замежнікамі і іхнімі нікому не цікавымі ўражаньнямі быў спрэс забіты этэр савецкага тэлебачаньня й радыё, а таксама газэты — у тым ліку і паважная беларуская газэта, якую я згадваў напачатку. Прамовы першага сакратара ЦК КПСС, а таксама начальнікаў розных рангаў лічыліся самай цікавай падзеяй, у тым ліку для замежнікаў. А ўжо адкрыцьцё якога-небудзь заводу вэнтыляў — увогуле падзеяй сусьветнага маштабу. Таму пад рубрыкай накшталт «Савецкі Саюз вачыма замежных гасьцей» увесь час ішлі так званыя водгукі працоўных усяго сьвету на апошнія «міралюбівыя ініцыятывы» ці запуск заводаў.

Здавалася б, Беларусь за 14 гадоў свайго незалежнага існаваньня павінна была зьмяніцца непазнавальна, у тым ліку і ў сэнсе брэндаў. У людзей жа зьявілася магчымасьць свабодна езьдзіць за мяжу, і ў Беларусь таксама сталі прыяжджаць больш замежнікаў. Зьявіліся тым часам і новыя тэхнічныя магчымасьці, мэдыйныя тэхналёгіі — тыя самыя бігборды на вуліцах беларускіх гарадоў. Але плякаты з каўбоямі Мальбара, аўтамашынамі «Форд» і швайцарскімі гадзіньнікамі ўсё яшчэ глядзяцца нечым чужародным на агульным фоне. А яшчэ больш уражваюць сваім убоствам памкненьні айчынных вытворцаў і рэклямістаў рабіць рэкляму, як на Захадзе. Але з аглядкай усё-такі на тутэйшае начальства. Жаночая бялізна, напрыклад, хоць і рэклямуецца, але зь нейкай сарамлівасьцю — быццам гэта нейкія штуцэры, ці вэнтылі, ці яшчэ нешта такое, зусім не сэксуальнае. Бо ў Беларусі, як і некалі ў СССР, сэксу дагэтуль, як вядома, няма. Ёсьць толькі дазволенае вышэйшым начальствам і недазволенае.

Ёсьць нават адмысловая дзяржаўная ўстанова пад дзіўнаватай назвай «рэгістар». Можа, яна паходзіць ад слова рэгістраваць? Але ж установа займаецца зусім не рэгістрацыяй, а цэнзурай. Яна дбае, каб на экраны кіно і тэлебачаньня ці на відэа выходзіла толькі правераная прадукцыя, у якой няма прапаганды гвалту й парнаграфіі. Дык вось, як запэўніў кіраўнік гэтай установы, нехта Цьвяткоў, беларуская дзяржава зусім ня супраць эротыкі, калі яна выхоўвае ў грамадзянах пачуцьцё прыгожага. І ў якасьці шэдэўру, рэкамэндаванага да прагляду дарослай аўдыторыі, назваў фільм «Грэцкая смакоўніца». Фільм, калі мне ня здраджвае памяць, выйшаў у савецкі пракат недзе ў годзе 1987-м і ўжо тады ўражваў сваёй бяздарнасьцю й пошласьцю… Пра густы не спрачаюцца. Паспрабуйце паспрачацца, калі іх дыктуе дзяржава.




PHOTO.BYMEDIA.NET

На ўсе выпады заходніх журналістаў, на любую крытыку заўсёды прыхаваны забойчы аргумэнт — вы паглядзіце, як у нас чыста на вуліцах.

Тое ж тычыцца і брэндаў. Ну чаму, напрыклад, Беларусь раптам павінна стаць гарналыжнай краінай? Толькі дзеля таго, каб менш людзей езьдзілі на замежныя курорты на лыжах катацца? Але ж тыя, у каго ёсьць грошы, усё адно будуць езьдзіць у Аўстрыю ці Францыю. А тыя, у каго іх няма, — ім і ў Сілічах катацца не па кішэні.

Галоўны прынцып, відаць, застаўся ранейшы — «у советских собственная гордость».

Тэма чысьціні й парадку чамусьці застаецца вельмі актуальнай для начальства. На ўсе выпады заходніх журналістаў, на любую крытыку заўсёды прыхаваны забойчы аргумэнт — вы паглядзіце, як у нас чыста на вуліцах. Аргумэнт, канечне, моцны. Але ж няўжо мы ўсё яшчэ жывём у XIX стагодзьдзі? І хіба не ў Эўропе жывём? Вось жа пабудавалі аэрапорт на самай далёкай адлегласьці ад гораду на ўсім эўрапейскім кантынэнце. Праўда, калі зайсьці ў прыбіральню ў нацыянальным (!) аэрапорце, дык пачынаеш разумець, што недахоп асьвятленьня іншым разам дапамагае ня бачыць розныя іншыя недахопы.

Нядаўна на расейскіх інтэрнэт-сайтах, дый ня толькі на іх, прайшла інфармацыя пра новы аэрапорт у Таліне. Публікацыя суправаджалася зьедлівымі камэнтарамі. Журналісты навыперадкі зьдзекаваліся з жаданьня эстонцаў пабудаваць новы, звышсучасны аэрапорт. Асабліва іх насьмяшылі словы аднаго з эстонскіх кіраўнікоў аб тым, што ў аэрапорце абавязкова павінны быць самыя сучасныя, чыстыя прыбіральні, бо гэта першае, з чым часам сутыкаюцца замежныя госьці на тэрыторыі іншай дзяржавы. Таксама, калі хочаце, брэнд. У Беларусі, як і ў сёньняшняй Расеі, такая праблема ніколі б не паўстала. Ёсьць жа ў аэрапорце заля для vip-пэрсон! Там заўсёды чыста. А замежнікі… Успамінаецца савецкі анэкдот. У нейкі занядбаны калгас раптам прыехалі журналісты радыё «Свабода». Прыехалі — і адразу на мэхдвор. Усе ў паніцы. Адзін старшыня спакойна ўсьміхаецца: «Ды няхай сабе паклёпнічаюць…»

# Найбольшыя за апошнія гады

акцыі пратэсту прайшлі пад эканамічнымі лёзунгамі

**Працяг са старонкі 2.**

Нарэшце групу перамоўшчыкаў пусьцілі ў міністэрства. Пачаліся перамовы, якія цягнуліся амаль тры гадзіны.

«Слухай, у мяне сьпіна ўжо зьмерзла!» — застагнала кабетка ў пухавіку. «Якая сьпіна? Будзем стаяць да перамогі!» — грозна адазваўся яе спадарожнік. Каб неяк сагрэцца, людзі тупалі нагамі, згадвалі нядобрым словам уладу, а таксама дзяліліся досьведам блуканьняў па пякельных колах падатковых інспэкцый.

Маральны дух мітынгоўцаў падтрымлівалі выступы. Большасьць кіраўнікоў грамадзкага аб’яднаньня «Пэрспэктыва» знаходзіліся ў міністэрстве. Анатоля Шумчанку, лідэра «Пэрспэктывы», арыштавалі за дзень да мітынгу — нібыта за наезд на чалавека (у выніку яго пасадзілі на 10 сутак за арганізацыю несанкцыянаванага шэсьця). Таму да людзей пачалі выходзіць апазыцыянэры са стажам. «Абараняйце свае правы, абараняйце свайго лідэра!» — заклікаў прадпрымальнікаў Мікола Статкевіч. «Гэта хто такі?» — пачалі пытацца ў натоўпе. «Ат, стары баец, бээнэфавец нейкі!» — адказаў хтосьці. «Яно й відаць, гаварыць умее!»

Анатолю Лябедзьку пашчасьціла менш. Прамову ён пачаў зь фірмовага жарту пра новы прэзыдэнцкі дэкрэт, які абавязаў грамадзян мець рост мэтар сорак. «Каб выканаць гэтае патрабаваньне, трэба ці стаць на калені, ці схіліць галаву!» Большасьці людзей жарт спадабаўся — яго сустрэлі дружным рогатам. Але тут жа ззаду панесьліся крыкі «Хто яго запрасіў?» ды «Без палітыкі!». Рэшта прамовы безнадзейна патанула ў воклічах «Далоў ПДВ!», якія апантана падтрымлівала група «апалітычных» мітынгоўцаў.

«Правільна! Нашто нам палітыка?» — прамовіла кабета перадпэнсійнага ўзросту. «Ды куды ж вы ад палітыкі падзенецеся? У нас што эканоміка, што палітыка — усё адно!» — не згадзіўся зь ёю маладзейшы прадпрымальнік, злосна зьбіваючы сьнег са сваіх ботаў.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Тайга скончылася

Дык што так разззлавала бізнэсоўцаў? Сёлета Расея ды Беларусь перайшлі на спагнаньне ПДВ паводле прынцыпу краіны прызначэньня. Раней беларускія гандляры набывалі ў Расеі тавар, у цану якога расейскія прадаўцы ўключалі гэты падатак, роўны 18%. Дзякуючы дзіравай расейскай падатковай сыстэме, часта ніякі падатак ня сплачваўся. Цяпер падатак павінны плаціць самі беларусы, у беларускі дзяржбюджэт. І тут паслабленьняў няма.

Урад разьлічвае такім чынам атрымаць дадаткова каля 200 млн даляраў штогод. А прадпрымальнікі ўзбунтаваліся. Натуральна, яны не жадаюць траціць 18% свайго прыбытку. У ідэале іх расейскія партнэры павінны былі б зьнізіць цэны на 18%. Але калі гэтага не зрабіў нават «Газпром» для ўраду, тым больш ня зьнізіць цэны Ахмет з «Чаркізаўскага», які найчасьцей ня мае ўвогуле ніякіх папер на свае панчохі ці DVD-плееры, якія вязуць кантрабандай з-пад Шанхаю празь некантраляваную сібірскую тайгу.

«Паводле маіх падлікаў, з кожнага пункту на рынку прадпрымальнік штомесяц плаціць каля 150 даляраў, — кажа Лявон, гандляр з Цэнтральнага рынку будматэрыялаў ва Ўруччы. — Звычайна прадпрымальнік мае трыпяць пунктаў. Калі дадаць сюды транспартныя выдаткі, дык выходзіць, што даводзіцца плаціць 600—1000 даляраў толькі за здавальненьне мець свой бізнэс! А трэба ж яшчэ інвэставаць грошы ў тое, каб набываць новы тавар, дый сям’ю карміць-апранаць! А тут яшчэ й гэты ПДВ. Дарэчы, каб яго плаціць, трэба мець безьліч папер. Ніхто ў Маскве мне іх ня дасьць. Дый каму апрацоўваць тыя дакумэнты, калі мой асартымэнт — 2 000 найменьняў? А мне, як прыватнаму прадпрымальніку, дазваляецца наймаць ня больш за трох работнікаў!»

> Анатоля Лябедзьку перабілі крыкі «Хто яго запрасіў?» ды «Без палітыкі!». Рэшта прамовы безнадзейна патанула ў воклічах «Далоў ПДВ!», якія апантана падтрымлівала група «апалітычных» мітынгоўцаў.

## Чаканьне да 25 лютага

Перагаворшчыкі выйшлі зь міністэрскіх кабінэтаў без асаблівых ілюзій. ПДВ не адмянілі, але стварылі працоўную групу для вырашэньня прадпрымальніцкіх праблем. «Карацей, дамовіліся: распрадаём тавар, «адбіваем» адзіны падатак за люты, а з сакавіка сыходзім у адпачынак», — паведамілі грамадзе.

Акрамя адмены ПДВ прадпрымальнікі патрабуюць увесьці накапляльную сыстэму выплаты пэнсійных узносаў у Фонд сацыяльнай абароны, зьменшыць арэндную плату, а таксама ўвесьці

**Працяг на старонцы 6.**

СЬЦІСЛА

### Папяровыя інвэстыцыі

Іран укладзе $400 млн у будаўніцтва заводу па вытворчасьці газэтнай паперы. Збудаваць яго мяркуюць у Шклове. Крэдытаваць праект будуць іранскія банкі. У сваю чаргу, на поўначы Ірану пабудуюць завод, на якім будуць зьбіраць трактары «Беларус». Праўда, у выпадку перамены палітычнай сытуацыі ў Іране гэтыя напалеонаўскія праекты чакае лёс аналягічных, заключаных з Садамам.

### Брытанцы расчараваліся

Амбасада Вялікабрытаніі ў Беларусі зачыніла камэрцыйны аддзел. Рашэньне аб ліквідацыі аддзелу прыняло Міністэрства гандлю Аб’яднанага Каралеўства. Праца аддзелу зрабілася бессэнсоўнай, бо мала хто з брытанцаў жадае рабіць бізнэс у Беларусі зь яе непрадказальнымі законамі, зьменамі ў падаткаабкладаньні ды прыдзірлівымі фінансавымі кантралёрамі. «Брытанскіх бізнэсоўцаў ня вабяць рынкі, на якіх ім ставяць палкі ў колы», — заявіў пасол Браян Бэнэт у інтэрвію БелаПАН.

### «Гарызонт» для кулінараў

Сёлета ўлетку «Гарызонт» распачне выпуск мікрахвалевых печак. Першая ЗВЧ-печ сыдзе з канвэеру 1 чэрвеня. Выраблядь іх будуць на заводзе «Беліт» у Паставах, які ўваходзіць у склад ААТ «Гарызонт». На заводзе мараць давесьці аб’ём прадукцыі да паўмільёна пячэй штогод.

### Экападатак

Урад зацьвердзіў стаўкі экалягічнага падатку. Датычаць яны найперш «брудных» прадпрыемстваў. Так, права зьліваць у раку прамысловыя адкіды можна будзе набыць за 207—3500 рублёў за кубамэтар, у залежнасьці ад канцэнтрацыі атрутных рэчываў.

### Грошы ёсьць грошы

Калі касір у пункце абмены валют адмаўляецца ўзяць у вас зашмальцаваны даляр — не адчайвайцеся. Лепш папрасіце яго яшчэ раз перачытаць апошнюю інструкцыю Нацбанку, якую разаслалі па ўсіх «абменьніках». Згодна зь ёй, адмовіцца ўзяць у вас замежную банкноту могуць толькі тады, калі вы склеілі яе з кавалачкаў, густа залілі фарбай ці намалявалі вусы на партрэце.

**АК, АФН**

### КУРСЫ ВАЛЮТ

на **17 лютага:**

1 амэрыканскі даляр — 2167 рублёў
1 эўра — 2820,13 рубля.
1 латвійскі лат — 4051,22 рубля.
1 літоўскі літ — 816,78 рубля.
1 польскі злоты — 708,59 рубля.
1 расейскі рубель — 77,39 рубля.
1 украінская грыўна — 409,25 рубля.

**Паводле Нацбанку**

# Найбольшыя за апошнія гады

Працяг са старонкі 5.

спрошчаную сыстэму сэртыфікацыі тавару. Калі ж будзе арыштаваны яшчэ адзін прадпрымальніцкі лідэр, страйк распачнецца аўтаматычна.

Адказу чакаюць да 25 лютага. Калі яго ня будзе — рынкі зачыняцца. У найгоршым выпадку ўсе гандляры скасуюць сваю рэгістрацыю ды стануць чэргамі на біржы працы. «Няхай самі за сябе падаткі плацяць!» — радасна вітала рашэньне грамада. Цалкам справядліва — яшчэ да ўводу ПДВ малы беларускі бізнэс даваў штогод пад 200 млн даляраў у бюджэт.

### Без палітыкі

Прэвэнтыўная стратэгія «органаў» не спрацавала: нават «абезгалоўленыя», прадпрымальнікі прадэманстравалі нечаканую здольнасьць да самаарганізацыі. Унікальнасьць акцыі пратэсту ня толькі ў тым, што гандляры выйшлі на плошчу перад Домам ураду, куды апазыцыя ўжо нават не спрабуе дабрацца. Пратэсты былі нечакана шырокімі — яны пракаціліся па тузіне гарадоў ды мястэчак па ўсёй краіне. Гарадзенцы далі фору нават менчукам: на плошчы Леніна ў цэнтры места сабраліся 4000 чалавек, праравўшы шэрагі АМАПу.

Паводле зьвестак МУС, на мітынгі выйшлі 20 тысяч чалавек, спынілі працу 63 рынкі. «Пэрспэктыва» ўвогуле сьцьвярджае, што страйкавалі ці не 70 тысячаў гандляроў.

Апазыцыйныя палітыкі далучыліся да мітынгоўцаў. Аляксандар Мілінкевіч, кандыдат на прэзыдэнцтва, падтрыманы «зялёнымі» ды БНФ, кажа: «Прадпрымальнікі — адна з самых магутных пратэстных груп. Яны праходзяць складаны працэс пераходу ад эканамічных да палітычных патрабаваньняў. Мы павінны гэта выкарыстаць».

Прадпрымальнікі ніколі не даруюць Лукашэнку параўнаньне сябе з вусякамі-крывасмокамі. На Лябедзьку ды Статкевіча, якія падтрымалі іх у мароз, яны таксама не забудуцца. Дый зь Мілінкевічам Лукашэнку тут супернічаць цяжкавата: многія бізнэсоўцы добра ведаюць кандыдата ад БНФ яшчэ па працы ў гарадзенскім гарвыканкаме. «Тады прадпрымальнікі ў Гародні мелі самыя лепшыя ўмовы ў Беларусі, — кажа Мілінкевіч. — Адзін толькі факт: у нас на пасяджэньні гарвыканкаму заўсёды быў старшыня гарадзкога аб'яднаньня прадпрымальнікаў. Ён, праўда, паводле закону ня меў права галасаваць, але дарадчы голас у яго заўсёды быў. У іншых гарадах такога не было. Проста мы разумелі, што бізнэс — гэта будучыня».

Рынак — гэта вам не палітычная партыя. Сябры гэтай прадпрымальніцкай суполкі зьбіраюцца ня раз на месяц, а шэсьць дзён на тыдзень. У поўным складзе. Усе маюць сваё сталае месца працы, ва ўсіх мабільныя тэлефоны і — немалаважна — сякія-такія сродкі. «Незалежная рэспубліка «Ждановічы» пры патрэбе магла б вытрымаць працяглую аблогу нават зімой — вопраткі хапіла б, харчоў таксама. Нясьпешчаныя палітагітацыяй прадпрымальнікі ахвотна чытаюць улёткі «Пэрспэктывы», яны лёгкія на ўздым ды маюць ідэальную матывацыю, бо бароняць грошы, за якія даводзіцца карміць сям'ю. Да таго ж, страйк на рынку — гэта не галадоўка палітыкаў, якую народ можа проста не заўважыць. Шараговы грамадзянін апранаецца не ў бутыках і харчуецца не з рэстаранаў.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

### Ці вытрымае ўрад

Прадпрымальнікі не выстаўляюць палітычных патрабаваньняў, бо баяцца разьюшыць уладу. Найслабейшы бок прадпрымальніцкага руху ў тым, што надта лёгка набыць яго ляяльнасьць: дастаткова ўраду зрабіць невялічкія саступкі — і пратэстаў як не было. Але ў выпадку з ПДВ дзяржава сама загнала сябе ў кут. Новы прынцып спагнаньня падатку ўвялі ў адпаведнасьці зь міждзяржаўнай дамовай. Яе прэзыдэнцкім дэкрэтам не адменіш. Як тут выкруціцца? Складаная сытуацыя ў прадпрымальнікаў, але й ураду не пазайздросьціш. Нават калі прадпрымальнікі скарацца з новай сыстэмай ПДВ, цэны на рынках падскочаць на 18%. Ці хопіць кабінэту цьвёрдасьці, каб давесьці падатковую міні-рэформу да канца?

Толькі рамантык можа лічыць, што прадпрымальнікі зробяць рэвалюцыю. Але й прагматык мусіць пагадзіцца: з году ў год прадпрымальніцкі рух мацнее, набіраецца досьведу ды траціць ілюзіі. І ўжо многія гандляры думаюць, як Аляксандар Талстыка — адзін з прадпрымальніцкіх актывістаў, які таксама прамаўляў на мітынгу: «З гэтай уладай нічога нармальнага для нас ня ўладзіцца».

Застаецца канстатаваць, што самыя значныя за апошнія гады акцыі пратэсту мелі пад сабой эканамічныя, а не палітычныя прычыны.

## Таптаньне на ганку

Зьнізу была маленькая прыпіска старшыні каардынацыйнай рады прадпрымальнікаў каапэратыўнага рынку Алега Пашка. Той выступіў з заяваю ад сваіх калег, пратэстуючы супраць карцінкі, паказанай НТВ. Паводле яго слоў, да прадпрымальнікаў прымазаліся апазыцыянэры, але прадпрымальнікі выступаюць толькі за адмену ПДВ.

У Баранавічах 10 лютага каля гарвыканкаму сабралася каля тысячы дробных прадпрымальнікаў. Гэта была найбуйнейшая гарадзкая несанкцыянаваная акцыя за апошнія гады. Міліцыянты патрабавалі разысьціся, зьвярталіся да былога і дзеючага старшынь незарэгістраваных свабодных прафсаюзаў рынку, даючы мікрафон з просьбаю заклікаць разысьціся. Але мікрафона ніхто ня браў, бо не хацеў пасьля несьці адказнасьці за арганізацыю несанкцыянаванага мітынгу.

Старшыня гарвыканкаму Віктар Дзічкоўскі сустрэўся з прадстаўнікамі прадпрымальнікаў, якія перадалі зварот да выканкаму і дэпутатаў. Мэр сказаў людзям, каб тыя ішлі спакойна працаваць, бо пакуль іх ніхто чапаць за няўплату ПДВ ня будзе. І гэтае пытаньне вырашаецца ня тут. Аднак калі і як хутка тое «пакуль» скончыцца, адказу прадпрымальнікі так і не атрымалі.

Народ таптаўся на ганку гарвыканкаму і патрабаваў сустрэчы з чыноўнікамі. Да іх выйшаў адзін з намесьнікаў мэра, сказаў прыкладна тое самае, што раней Дзічкоўскі, і людзі паціху разышліся, на палёгку пераляканым гарвыканкамаўцам. Застаўся стаяць толькі бронзавы Ленін, гледзячы на выканкам і трымаючы нешта ў кішэні.

А ўжо ў суботу ў дзяржаўнай газэце «Наш край» перадавіцай быў зьмешчаны артыкул «Рашэньне можна знайсьці ў дыялёгу», передрукаваны з «Рэспублікі». Зьнізу была маленькая прыпіска старшыні каардынацыйнай рады прадпрымальнікаў каапэратыўнага рынку Алега Пашка. Той выступіў з заяваю ад сваіх калег, пратэстуючы супраць карцінкі, паказанай НТВ. Паводле яго слоў, да прадпрымальнікаў прымазаліся апазыцыянэры, але прадпрымальнікі выступаюць толькі за адмену ПДВ. «Гэта быў ня страйк, а акцыя пратэсту супраць увядзеньня ПДВ. І ня трэба палітыканам карыстацца сытуацыяй дзеля дасягненьня сваіх благіх мэтаў. Мы за ўзаемаразуменьне, за спакойную і стабільную працу».

Паводле слоў прадпрымальнікаў, ніхто і чуць ня чуў пра тую каардыцыйную раду. Больш-менш ведаюць толькі старшыню незарэгістраваных свабодных прафсаюзаў рынку Міколу Чарнавуса. Відаць, улады ствараюць арганізацыю, якая будзе лабіраваць іх інтарэсы.

**Руслан Равяка, Баранавічы**

## У Слуцку прадпрымальніцы жабруюць

У Слуцку раней з прадпрымальніцкай кансалідацыяй справы былі дрэнь: Саюз прадпрымальнікаў разваліўся, лідэрку задавілі праверкамі ды штрафамі так, што кабета практычна разарылася ды моцна падарвала здароўе. Леташні страйк Слуцак праігнараваў. Цяпер арганізацыйную справу даводзіцца пачынаць спачатку. Першыя вынікі ўжо навідавоку. 10 лютага баставалі ўсе.

Цікавы пэрформанс правялі 13 лютага дзьве дзяўчыны-прадпрымальніцы. Надвор'е было кепскае — завіруха. Усё замятаецца сьнегам. Пакупнікоў мала. Гандаль дрэнны. Дык дзяўчаты паслалі пакрывала на зямлю ды селі жабраваць з капелюшом, накшталт жабракоў з усходніх краін. Толькі жабравалі на ПДВ. Горкага сьмеху было шмат. Акцыю падтрымлівалі як прадпрымальнікі, кідаючы тысячы, так і выпадковыя пакупнікі, якія кідалі драбязу. З праблемай ПДВ змагаецца хто як толькі можа. Адна прадпрымальніца нават хадзіла да варажбіткі, паваражыць на кававай гушчы. Ёй наваражылі, што праз месяц удасца дабіцца свайго і праца прадпрымальнікаў адновіцца. З 1 сакавіка чакаецца агульнанацыянальны страйк. Пажывём — убачым.

**Сяржук Кут, Слуцак**

## Пазьняк пра ПДВ

Сойм Кансэрватыўна-хрысьціянскае партыі БНФ назваў сытуацыю з ПДВ «афёрай крамлёўскіх жулікаў і рэжыму». На думку партыі, уратавала б увядзеньне сапраўднае мяжы з Расеяй. Такія ацэнкі ўтрымліваюцца на міні-ўлётках памерам трохі большым за каробку запалак, расклееных ад імя «Беларускай салідарнасьці».

## ПДВ паралізаваў заводы

На 10 лютага ў гарадзкой падатковай інспэкцыі яшчэ не было канкрэтных інструкцый, чым кіравацца пры налічэньні ПДВ. Гэта нягледзячы на тое, што ўжо 14 лютага прадпрымальнікі павінны былі падаць падаткавікам сьпісы з рэштаю тавару на 1 студзеня (маўляў, ён будзе вызвалены ад ПДВ), а да 20 лютага заплаціць сам падатак за студзень.

10 лютага на пляцы Волі перад полацкім гарвыканкамам сабралася пад 200 страйкоўцаў. Прадпрымальнікі выбралі дэлегатаў і накіравалі іх на перамовы зь мясцовай уладай. Аднак высьветлілася, што ні старшыні гарвыканкаму, ні яго першага намесьніка на месцы няма: іх нібы выклікалі ў Адміністрацыю прэзыдэнта. Парлямэнтэры скіраваліся ў залю пасяджэньняў на гутарку з прадстаўнікамі выканкаму. Перамовы доўжыліся дзьве гадзіны. Прадпрымальнікі даведаліся шмат цікавага, што ня толькі яны церпяць ад зьмяненьня парадку спагнаньня ПДВ: дзейнасьць полацкага заводу «Тэхналіт» практычна паралізавана, вялікія праблемы ўзьніклі ў ААТ «Шкловалакно», полацкага бровару. Гарадзкі бюджэт траціць 5 млрд рублёў.

Дэлегаты страйкоўцаў спыталі ў прадстаўнікоў улады, ці гатовы яны забясьпечыць працай тых, хто спыніць свой бізнэс? У адказ пачулі, што сытуацыя з працоўнымі месцамі ў горадзе ў найбліжэйшы час будзе толькі пагаршацца, бо ўжо прынята рашэньне пачаць працэдуру банкруцтва полацкага мясакамбінату, лішнія працоўныя рукі ёсьць на кансэрвавым заводзе, швейнай фабрыцы «Мона» і іншых прадпрыемствах.

На кірмашы застануцца толькі тыя, хто дужэйшы — больш кемлівы і працаздольны. Да таго ж прадпрымальнікі пачулі, што на 10 лютага ў гарадзкой падатковай інспэкцыі яшчэ не было канкрэтных інструкцый, чым кіравацца пры налічэньні ПДВ. Гэта нягледзячы на тое, што ўжо 14 лютага прадпрымальнікі павінны былі падаць падаткавікам сьпісы з рэштаю тавару на 1 студзеня (маўляў, ён будзе вызвалены ад ПДВ), а да 20 лютага заплаціць сам падатак за студзень. Полацкія прадпрымальнікі лічаць, што зрабіць гэта абсалютна нерэальна.

Больш за ўсё іх хвалюе патрабаваньне скласьці сьпісы рэштак тавару, бо, за рэдкім выняткам, у дробных гандляроў няма дакумэнтаў, якія пацьвярджалі б набыцьцё гэтых тавараў, што зьяўляецца парушэньнем гандлёвай дзейнасьці і можа выклікаць штрафныя санкцыі ці нават канфіскацыю тавару.

**Васіль Кроква, Полацак**

# Доўгачаканы канец

1 лютага Мінюст увёў новыя правілы: партыйныя суполкі і грамадзкія арганізацыі больш ня могуць мець юрыдычных адрасоў на кватэрах. Як адрэагавалі партыйныя структуры на месцах? З Баранавічаў паведамляе Руслан Равяка.

Баранавіцкая гарадзкая арганізацыя БНФ «Адраджэньне» была зьвярнулася да мясцовых уладаў з просьбаю аб атрыманьні памяшканьня пад юрыдычны адрас ёй і яе суполкам. Адказ быў адмоўны.

Старшыня суполкі Алесь Грыцавец кажа: «Мы загадзя ведалі вынік. Але хацелі ўпэўніцца ды афіцыйна задакумэнтаваць адказ. Шукаем іншыя варыянты. Пакуль ня вынесена ніякага папярэджаньня, арганізацыя працуе ў звычайным рэжыме».

Толькі адна баранавіцкая апазыцыйная партыя здолела зарэгістравацца на новых правілах. КХП-БНФ цяпер месьціцца ў прыватнай хаце свайго чальца, дзе маецца асобны ўваход.

Паводле слоў старшыні мясцовага філіялу БСДП (НГ) Віктара Карлінскага, яго партыя таксама можа займець юрыдычны адрас, але пакуль гэтым ніхто не займаецца — ёсьць больш важкія праблемы, зьвязаныя з агульнапартыйнай сытуацыяй.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**ВЫСПА СЬЛЁЗАЎ. Жалобная цырымонія з нагоды 16-й гадавіны вываду савецкіх войскаў з Аўганістану. Памяць беларускіх аўганцаў, апроч прамоваў і ўскладаньня вянкоў, ушанавалі ланцугом курсантаў. Улада пераймае апазыцыйныя мэтады арганізацыі масавых мерапрыемстваў.**

# Настальгія па рыбе

Размаўляючы са старымі людзьмі, заўважаю акалічнасьць: настальгія па савецкіх часах не прыціхае. Раней шкадаваньні былі зьвязаны з наведваньнем сваякоў у блізкім замежжы ці іншымі праблемамі, зьвязанымі з узьнікненьнем межаў, цяпер усё выяўней гучаць матывы эканамічнага пляну. Людзі шкадуюць аб стабільнасьці, аб тым, што невялікія заробкі й пэнсіі забясьпечвалі больш-менш прыстойнае існаваньне.

Мой суразмоўца Іван Мікалаевіч — пэнсіянэр, яму каля 70-ці. Пэнсіі атрымлівае 160 тысяч.

— Чаму так мала?

— Ды згубіліся 10 гадоў у Літве. Адпрацаваў там у свой час на шабашках па калгасах. А вось дакумэнты выправіць ня змог.

Размова зайшла якраз пра рыбу. Мой суразмоўца з горыччу ўспамінаў, што ў савецкія часы рыба лічылася другарадным прадуктам. А хек і іншыя гатункі марской рыбы давалі ледзь не ў нагрузку.

— Сёньня хеку не магу сабе дазволіць. Абыходжуся таннай путасу. Кажуць, што ў нас няма інфляцыі. Як няма? Я летась мог купіць кілё путасу за 1600 рублёў. А сёньня рыба каштуе 2100. Звычайная «цагліна» хлеба каштуе 850 руб. Знаёмыя пэнсіянэры, якія прыкладаюцца да чаркі, жартуюць: а навошта той хлеб. Ці два боханы хлеба, ці бутэлька віна — усё адно. Дык лепш ужо бутэльку віна, весялей.

Магу засмуціць Івана Мікалаевіча. Прыхаваная інфляцыя няўхільна наступае і тут. Бутэлька гэтага самага «чарніла» ў нас ужо каштуе даляр. А ў той жа Польшчы, значна лепшае па якасьці, яно абыходзіцца ўдвая-ўтрая таньней.

З выгляду ўсё добра. Даляр стаіць на месцы. А вось цэны… Іван Мікалаевіч адчувае гэта на сваёй скуры, як і мільёны беларусаў, чые прыбыткі не ідуць ні ў якае параўнаньне з афіцыйна аб'яўленымі.

**Міхал Гіль, Паставы**

## СЬЦІСЛА

### У гонар паэта

На мінулым тыдні ў Полацку ў бібліятэцы мікрараёну Марыненка адбылася вечарына паэта і эсэіста 65-гадовага Віктара Леанені. Мерапрыемства было прымеркавана да 40-годзьдзя яго творчай дзейнасьці. Сп.Віктар жыве ў Полацку з 1964 году і зьяўляецца адданым патрыётам старажытнага гораду. Гэта бадай адзіны беларускі паэт, які пра Полацак выдаў асобны паэтычны зборнік — «Полацкія былі». У гонар вэтэрана полацкага літаратурнага цэху гучалі вершы і музыка.

### Подпісы за Быкава

Сябры наваполацкага дэмакратычнага руху распачалі збор подпісаў за перайменаваньне вуліцы Кірава, што знаходзіцца ў цэнтры гораду, у вуліцу Васіля Быкава. Людзі з падпіснымі лістамі зьявіліся на вуліцах Наваполацку, ва ўнівэрсытэце, крамах, дзяржустановах. Ініцыятар акцыі, праваабаронца Зьміцер Салаўёў кажа, што вуліца Кірава невялікая, усяго некалькі дамоў, таму зьмена назвы ня будзе шмат каштаваць бюджэту.

**Васіль Кроква, Полацак**

### Згарэлі дзеці

Двое малых дзетак, хлопчыкі двух і трох гадоў, згарэлі ў вёсцы Багушы Баранавіцкага раёну. Хата загарэлася, відаць, ад забаў з запалкамі. Маці пасьпела выскачыць з палаючай хаты, забыўшыся на сваіх сыноў. Бацька ў гэты час быў на працы ў Баранавічах. Суседзі выклікалі пажарнікаў і паспрабавалі самастойна выратаваць дзяцей. Яны выбілі шыбы, але дадатковы прыток кіслароду і вецер толькі павялічылі шуганьне полымя. Пажарныя прыехалі хутка, але абваліўся дах.
Дзеці спрабавалі ратавацца ад пажару пад коўдраю… Маці іх любіць зазірнуць у бутэльку — некалькі разоў яе папярэджвалі аб пазбаўленьні бацькоўскіх правоў. Хто вінаваты ў здарэньні, цяпер высьвятляе пракуратура.

**Руслан Равяка, Баранавічы**

### Магілёўскі звон

Сусьветнае віртуальнае сеціва папоўнілася новым адрасам http://zvon.at.tut.by — магілёўскай моладзевай газэтай «Звон».
Газэта зьявілася ў 2002 г. як праект гарадзкой гімназіі №1. У мінулым лютым да працы далучыліся журналісты-пачаткоўцы зь іншых магілёўскіх школ — выданьне стала гарадзкім. Цяпер над газэтай, якая ў новай якасьці выпусьціла чатыры нумары і выдаецца па-беларуску, працуюць 16 карэспандэнтаў з 10 школ. Звонаўцы пазыцыянуюць сваё выданьне як незалежнае моладзевае, што імкнецца аб'ектыўна асьвятляць падзеі ў Магілёве, Беларусі і сьвеце.

**Андрэй Белагубаў, Магілёў**

### Помнік землякам

Жыхар вёскі Зацішша Яўген Календа калісьці на ўласныя сродкі паставіў помнік землякам, якія загінулі падчас II сусьветнай вайны. Да 60-годзьдзя вызваленьня Беларусі 78-гадовы вэтэран стаў ініцыятарам усталяваньня 16-тоннага каменя ў гонар землякоў, якія ваявалі і вярнуліся жывымі. З 27 вэтэранаў, адзначаных на камені, жывуць толькі пяцёра.

**Надзея Лісоўская, Бабруйск**

### Не пападпісвалі на сваю галаву

Калектыў рэдакцыі крычаўскай раённай газэты «Ленінскі кліч» пазбавілі прэміі за сьнежань. Журналістаў пакаралі за тое, што рэдакцыя ня здолела падвысіць з новага году наклад выданьня ў два разы (да 4 000 ас.).
«Ленінскі кліч» трапіў у абласны сьпіс дзяржгазэт (усяго — пяць), якія павінны стаць самаакупнымі ўжо зь вясны. Выданьні папярэджаны аб значным зьмяншэньні бюджэтнага ўтрыманьня.
Што ж да крычаўскай «раёнкі», то кожнаму яе супрацоўніку загадалі «падпісаць» на газэту ня менш за 100 чалавек.

**Андрэй Пархоменка, Крычаў**

### Грашовы зьдзек у Дуброве

Хоць і заяўляюць па тэлевізары, што ў нас посьпехі па ўсіх франтах, заробкі ў Дуброве нікчэмныя. Пайшоў Аляксандар Р. атрымаць заробленыя грошы. За 28 працадзён зарабіў нешта каля 47 тыс. рублёў — 1 678,5 рубля (81 цэнт) за дзень. Але ў касе Аляксандру аддалі на рукі ўсяго 20 тыс., рэшту вылічылі ці за сена, ці за чорта лысага. Гэта гіпэрсупэрбеднасьць.
І Аляксандар не адзінокі. Такі ж заробак маюць і іншыя дужыя працаздольныя мужыкі. Але яны не пратэстуюць супраць гэтага цынічнага зьдзеку. Толькі адзін дубровец, Ігар П., заехаў у інспэкцыю па працы і папрасіў пракамэнтаваць такія заробкі. Яму сказалі, што ў Беларусі такіх зарплат даўно няма, і прапанавалі зьвярнуцца з папераю, і тады інспэктар адразу прыедзе разьбірацца.
Дуброўцам час пачаць вучыцца абараняць свае інтарэсы. Час падумаць, што за баязьлівасьць цяпер давядзецца чухаць карак у старасьці, калі атрымаеш нікчэмную пэнсію. Цяпер кожны паводле закону мае права жыць годна. З апошнім падвышэньнем заробку наймальнік мае плаціць сама меней 128 860 рублёў у месяц.
Прачніся, Дуброва!

**Мікола Бусел, Сьветлагоршчына**

### 25 год барысаўскаму пэдкаледжу

У пачатку лютага Барысаўскаму пэдкаледжу споўнілася 25 гадоў. З гэтай нагоды ўстанова, у якой навучаецца 700 чалавек, атрымала грант ад прэзыдэнта — 16 млн рублёў. Каледж займае вядучае месца сярод усіх пэдвучэльняў краіны, а каля 70% навучэнцаў па яго сканчэньні паступаюць у ВНУ. У пэдкаледжы рыхтуюць настаўнікаў малодшых клясаў, беларускай, ангельскай і нямецкай моў, выхавальнікаў для дзіцячых садкоў, сацыяльных пэдагогаў.

### Грэка-рымляне

У пачатку лютага ў Барысаве прайшоў чэмпіянат вобласьці па грэка-рымскай барацьбе. Спаборніцтвы разыгрываліся ў васьмі вагавых катэгорыях, у чатырох перамаглі барысаўцы. Яны і прадстаўляць горад на чэмпіянаце краіны ў Менску пры канцы лютага.

### Барысаўшчына ў агні

Ад пачатку новага году ў Барысаве і раёне ад пажару загінула ўжо восем чалавек. Найчасьцей ахвяры знаходзіліся ў нецьвярозым стане.

**Зьміцер Панкавец, Кастрыца**

# Імпэратары балотаў

20 лютага ў Кіеве зачыняецца выстава сучаснага беларускага мастацтва «Балота Empire». Гэта апошняя выстава Сяргея Войчанкі. Разам зь ім былі выстаўленыя Цэсьлер, Клінаў і Вашкевіч. Посьпех у публікі — неймаверны. Артыкул **Сяргея Харэўскага**.



С.Войчанка, У.Цэсьлер. Міколка-Паравоз-III.

Для старачасных беларусаў балоты былі гэткім жа натуральным асяродзьдзем, як тундра для эскімосаў або пустыні для туарэгаў. З балота бяруцца журавіны і сена, нават мох, якім уцяпляюць хаты. На балотах палююць, з балотаў выбіраюць торф на ўгнаеньне й паліва. Між дрыгвы хаваюцца ад аблавы. Штомоцы клятыя ў XX стагодзьдзі, нашы балоты сёньня — унікальны беларускі прыродны скарб. Містычная, амбівалентная, няпэўная тэрыторыя нашага жыцьця й культуры, дзе красуюць кветкі неймавернае прыгажосьці й гадуецца незьлічонае птаства.

Таму, паставіўшы сабе за мэту вызначыцца ў сьвеце новага тысячагодзьдзя, група беларускіх мастакоў — Руслан Вашкевіч, Артур Клінаў, Уладзімер Цэсьлер і Сяргей Войчанка — абрала сабе за знак менавіта балоты, зь іхным двухсэнсоўным культурным і гістарычным значэньнем.

Кожны зь іх бачыць асяродзьдзе свайго існаваньня — «Балота Empire» — па-розначу. Але іхныя творы лучаць новы фігуратывізм, высокая культура выкананьня й пэўная дыдактычнасьць, запазычаная зь мінулых эпох — усё гэта спрашчае задачу гледачоў. Гэта зразумелае мастацтва, якое не вымагае разгорнутых камэнтароў ці адмысловае падрыхтоўкі.

Камэртон творчасьці Клінава — зьедлівы сарказм і ўедлівае дасьледаваньне беларускае мэнтальнасьці. «Салодкае саламянае жыцьцё» — гэта даволі простая мэтафара паспалітага «балотнага» існаваньня ва ўмовах новага грамадзтва новага спажываньня. Няпростым зьяўляецца хіба матэрыял — звычайная залацістая салома, пахучая й хрусткая, што ў руках мастака пераўтвараецца ў што хочаш — ад тэлевізара да антрапаморфных пэрсанажаў з палавымі прыметамі.

Другая інсталяцыя Клінава — «Перасоўны партызанскі бутык» — ілюструе стэрэатыпы, зь якіх складзена беларуская гістарычная сьвядомасьць. Архетып беларускага Партызана стаўся часткаю спэцыфічнай субкультуры. Мэтафары Балота й Партызана выявілі немалую трываласьць. Толькі беларус можа пачувацца камфортна з гэтымі дзьвюма мэтафарамі, што для чужых выглядаюць небясьпечнымі й незразумелымі.

Творчыя прыёмы Руслана Вашкевіча выглядаюць цалкам традыцыйнымі нават на фоне старэйшых калегаў. Разам з тым, у яговых рацыянальных, бязэмацыйных карцінах выяўляецца куды больш сарказму, чым у ягоных калегаў. Апошнім часам Вашкевіч сьвядома абраў сабе мэтад ахраматычных жывапісных разьвязаньняў, што робіць ягоную творчасьць далёкай ад карнавальнасьці.

Ягоны леташні праект «Краіна Ўтопія» населены нечуванымі пэрсанажамі. Гэта ўсё старыя знаёмыя — кракадзілы ды русалкі, дзяўчаты й хлапчаты, зьмешаныя, аднак, у паветра балотных міязмаў і застылыя там, нібы ў шкле. У іх няма нічога выродлівага альбо пагрозьлівага. Але гэтыя немудрагелістыя жывапісныя кампазыцыі, здаецца, прадказваюць будучыню Балотнае Імпэрыі.

Уладзімер Цэсьлер і Сяргей Войчанка на кіеўскай выставе дэманструюць вялікі расьпісаны куфар пад назвай «Скарб». Гэты аб'ект — увасабленьне ідэі захаваньня ўсіх нашых «імпэрскіх» каштоўнасьцяў, кляйнотаў і спадчыны, жывога й памерлага. Доўгія гады працуючы разам, Цэсьлер з Войчанкам здолелі стварыць мастакоўскую галяктыку, у якой знайшлося месца гумару й парадоксам, драмам і чыстай красе. Вяршыняю іхняе творчасьці стала нізка плякатаў «Тутэйшыя далікатэсы» (2000—2003), дзе сумяшчаецца несумяшчальнае й знаходзіць сабе жыцьцё нават тое, што нібы даўно страціла ўсялякі сэнс.

Апафэозам «Балота Empire» сталася сэрыя кампутарнае графікі «Міколкі-паравозы I, II, III і IV» як найвышэйшае дасягненьне культурнага будаўніцтва, тэхналёгіяў і балотнае эстэтыкі. Міколкі-паравозы Цэсьлера з Войчанкам — яскравы ўзор цывілізацыйнага заняпаду, калі замест здаровага сэнсу прыходзіць прэтэнцыёзнасьць, а замест сьвятасьці — культ.

У плянах арганізатараў і фундатараў — доўгатэрміновы працяг акцыі. Магчыма, выставу «Балота Empire» ўбачаць у Расеі, Польшчы, Нямеччыне й Нідэрляндах. Пачатак аказаўся надзвычай удалым, прынамсі, украінскія мэдыі былі аднадушныя ў сваіх камплімэнтах імпэратарам балотаў.

# Рэчы для замежнага спажываньня

Пра выставу «Балота Empire» Сяргею Харэўскаму расказвае адзін зь яе ўдзельнікаў мастак **Артур Клінаў**.



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**«НН»: Якая была галоўная задача ў фармаваньні экспазыцыі «Балота Empire»?**

**Артур Клінаў:** Агульнай ідэяй праекту было зрабіць тое, што трымалася б на беларускіх унікальнасьцях. Каб гэта быў пазнавальны нацыянальны праект. Каб гэтае цалкам сучаснае мастацтва ідэнтыфікавалася зь Беларусьсю.

**«НН»: Ці была ваша выстава зьвязана з Аранжавай рэвалюцыяй ва Ўкраіне?**

**АК:** Не, ніякім чынам яна не была зьвязана й ніяк яе не спраказавала. Адзіная сувязь палягала ў тым, што выстава мусіла адчыніцца на месяц раней. Але праз вір украінскіх палітычных падзей яна перанеслася ўжо на гэты год.

**«НН»: То бок тамтэйшая рэвалюцыя вам нашкодзіла?**

**АК:** Не. Атрымалі болей часу, каб падрыхавацца. І да геапалітычных зьменаў таксама. Вось што паўплывала — дык гэта «рэвалюцыйны» настрой публікі. Цяпер украінскі глядач моцна розьніцца ад беларускага. Ён больш раскуты, непасрэдны, шчыры й зацікаўлены, калі не сказаць захоплены…

**«НН»: А раптоўная сьмерць Сяргея Войчанкі была неяк зазначана апрычона?**

**АК:** Так, мы зьмясцілі адмысловую мэмарыяльную шыльду, у якой паведамлялася, што наша выстава прысьвечаная ўжо памяці Сяргея Войчанкі. Ён памёр у тыя дні, калі яна павінна была першапачаткова адкрывацца, у сьнежні. Каб яна адбылася своечасова, можа, ён бы паехаў у Кіеў і ўсё было б па-іншаму… А можа, ён памёр бы ў Кіеве.

**«НН»: У якіх мурах праходзіць выстава?**

**АК:** У старасьвецкім будынку Кіева-Магілянскай акадэміі. Гэта вельмі пачэсна. На гэтай тэрыторыі шмат гадоў існуе Цэнтар сучаснага мастацтва. На сёньня гэта ці не найлепшая адмысловая пляцоўка ў Кіеве.

**«НН»: Хто фундаваў выставу?**

**АК:** Кіеўская філія беларускага аўтамабільнага холдынгу «Атлянт-М». Яны былі ініцыятарамі ўсяго праекту — беларускай выставы некалькіх найбольш «брэндавых» нашых мастакоў. Увогуле, гэта рэдкі выпадак, каб беларускае прадпрыемства вось так бы ўклала сродкі ў нацыянальнае мастацтва. «Атлянт-М» уклаўся сур'ёзна — і шыкоўны каталёг, і аплата арэнды, і транспарт…

**«НН»: На тле сёньняшняга мастацкага працэсу ва Ўкраіне як выглядае ваша акцыя?**

**АК:** Культурныя кантакты паміж Беларусьсю і Украінай да апошняга часу былі вельмі слабыя. І гэтая выстава — першая ў новым стагодзьдзі буйная прэзэнтацыя беларускага сучаснага мастацтва там. Гэта выклікала вялікі ажыятаж. Два дні доўжылася адкрыцьцё, і публікі было нямерана. І ў наступныя дні народ валіў валам. Я завітаў туды й перад выездам — залі былі перапоўненыя. Мне па тэлефоне паведамілі, што й гэтымі днямі наведнікаў шмат. Арганізатары ня памятаюць сытуацыі, каб выстава выклікала такую шчырую цікавасьць.

**«НН»: Чаму творы, што экспануюцца ў Кіеве, выстаўляліся ў Вільні, у францускім Клермон-Фэране, нельга паказаць у Менску? Ці тваё мастацтва не для «ўнутранага спажываньня»?..**

**АК:** Гэта ня прынцып. Папросту не было такіх прапановаў, ды і месцаў такіх, заляў няма. Але калі будзе магчымасьць, усё пакажу й тут.

**РУСЛАН ВАШКЕВІЧ** нарадзіўся ў 1966 г. у Менску. Скончыў Акадэмію мастацтваў (1992). Працуе ў жывапісе, скульптуры, канцэптуальным мастацтве. Жыве ў Менску.

**СЯРГЕЙ ВОЙЧАНКА** (1955—2004). Нарадзіўся ў Марыупалі ва Ўкраіне. Скончыў беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1984). Працаваў у галіне плякату, кніжнай ілюстрацыі, жывапісу. Ляўрэат міжнародных конкурсаў плякату (сумесна з Ул.Цэсьлерам).

**АРТУР КЛІНАЎ** нарадзіўся ў 1965 г. у Менску. Скончыў архітэктурны факультэт Беларускага палітэхнічнага ўнівэрсытэту (1987). Ачольвае Беларускую Асацыяцыю Сучаснага мастацтва, рэдактар часопісу «Partisan». Жыве ў Менску.

**УЛАДЗІМЕР ЦЭСЬЛЕР** нарадзіўся ў 1951 г. у Слуцку. Скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1980). Працуе ў галіне плякату, станкавага жывапісу, графікі. Жыве ў Менску.

# Даруй–бывай!




«Лекарство от меланхолии», «Прости-прощай» (р) 2004, «West Records»

Біяграфію Яўгена Салдаценкі мог бы сьмела выкарыстаць Аляксандар Дзюма, каб напісаць адзін з найлепшых сваіх прыгодніцкіх твораў. Займацца напісаньнем песень і іх выкананьнем ён пачаў даўно, але толькі летась вырашыў частку сваіх твораў увасобіць у гуказапісе. А паколькі ён з ужо не маладых і вырастаў на музыцы клясыкаў року, стылістыка паўстала сама сабой. У аснове сваёй музыка альбому — гэта мэлядычны хард-рок, нягледзячы нават на тое, што ў музыцы гэтай усё сказана даўным-даўно. У музыцы — так, але ня ў тэкстах, якія аніяк не акрэсьліш як шаблён.

Безумоўна, можна было б казаць, што «Лекарство от меланхолии» («ЛОМ») — гэта, перш за ўсё, сьветаадчуваньне, выйсьце творчага гарэньня Яўгена Салдаценкі. Яно, вядома, так, але «ЛОМ» — гэта, па сутнасьці, і ёсьць ён адзін. Дзеля ж рэалізацыі праекту былі запрошаны вельмі аўтарытэтныя музыканты — гітарыст Сяргей Анцішын, барабаншчык Кірыла Шэвандо, басіст Валер Башкоў, клявішнік Кастусь Гарачы, скрыпач Карэн Карапецян. Тады робіцца зразумелым самаазначэньне калектыву як «творчая лябараторыя». Музыкі ня толькі сумесна апрацавалі арыгінальны матэрыял, але й вельмі годна ўвасобілі яго. Атрымалася дастаткова энэргічная, па-сапраўднаму суворая мужчынская музыка, не пазбаўленая пры гэтым разважлівасьці і асэнсаваньня сябе ў сьвеце музыкі і ў сьвеце наагул.

Дыск укамплектаваны двума кліпамі, якія, безумоўна, зьвяртаюць на сябе ўвагу. Гэты праект — адзін з тых рэдкіх у Беларусі выпадкаў, калі ўсё рыхтавалася працяглы час, грунтоўна і асэнсавана. І як вынік — прадукцыя, якую прыемна слухаць. Бяз модных штучак-дручак, без уліку фарматаў і праліку будучых дывідэндаў. Што і прынесла плён.

**Зломлены Слухач**

# Каханачка

Ірына Дарафеева і Прэзыдэнцкі аркестар Рэспублікі Беларусі. (р) «West Records», 2004




Гэты альбом — першы выпадак у Беларусі, калі запіс быў зроблены падчас канцэрту саліста і аркестру на 24-канальны магнітафон. Нешта падобнае некалькі гадоў таму зьдзейсьніў Мікалай Скорыкаў, выдаўшы падвойны канцэртны альбом, але ў сэнсе тэхналёгіі ён саступае альбому Дарафеевай. Гэты апошні складаецца (за выняткам дзьвюх) зь беларускамоўных песень, якія знаходзяцца ў актыўным рэпэртуары сьпявачкі. Песьні дастаткова вядомыя, а таму варта казаць ня столькі пра іх, колькі пра тое, наколькі ўдала атрымалася выканаць іх з аркестрам.

Малады калектыў пасьпяхова справіўся з задачай, якая часам была вельмі няпростая, як хоць бы ў выпадку песьні «Рэдкі госьць» Ігара Паліводы, партытура якой выклікала шмат праблем у вядомага «Big Warsaw Band» Станіслава Фіялкоўскага, калі менавіта з гэтай песьняй Ірына заявілася ў 1999 годзе на конкурс у Зялёнай Гуры.

Альбом годна дэманструе творчы патэнцыял Ірыны Дарафеевай, якую нядаўна «БДГ» чамусьці паставіла ў шэраг «клонаў» расейскай папсы. Ну прабачце! Казаць пра нейкае падабенства Ірыны да безгалосых «фабрычных» дзяўчат аніяк не выпадае, калі слухаеш гэты дыск. Яна — самастойная беларуская сьпявачка, нават калі сьпявае па-расейску: інтанаваньне, голасавядзеньне — не канвэерныя! Да таго ж, большасьць песень напісаны беларускімі аўтарамі, якія ну ніяк не навучацца пісаць так дрэнна і шаблённа, як гэтаму навучыліся ўжо ў Расеі.

Альбом можна было б назваць цалкам удалым, калі б ня два моманты. Першы: выкананьне славутага адажыё Альбіноні гітарыстам былой групы «Акцэнт» і цяперашнім калегам Алены Сьвірыдавай Віктарам Навумікам. Не, якраз само выкананьне не выклікае пярэчаньня: нумар, як кажуць, можа мець месца. Іншая рэч, што толькі як нумар канцэртны, — на дыску ён падаўся мне ўсё ж лішнім. А вось «Беларуская рапсодыя», якая закрывае альбом, — гэта ўжо «поўнае прабачце»! Невыразнае, стандартнае папуры на народныя беларускія мэлёдыі відавочна псуе агульнае ўражаньне ад альбому, «садзіць» яго літаральна на карачкі, тым больш што выконваецца ўжо без салісткі. Я ўсё разумею: прыгожы жэст у бок акампаніятараў, своеасаблівая ім падзяка і г.д. Але ж гэта альбом Ірыны Дарафеевай і аркестру, а не наадварот!

І ў выніку ў канцы работы, годна зробленай гукарэжысэрамі Валер'ем Грабенкам і Ігарам Шлопакам, Мікалаем Няронскім (мастэрынг), Аленай Адамчык (фота) і прадусарам Юрыем Савашам, быў паставілены зусім ня клічнік, а невыразная клякса.

**Закаханы Слухач**

# Позна




Натальля Падольская, «Iceberg Music», 2004

Падольская — не тыповы канвэерны прадукт «Фабрыкі зорак», хоць менавіта расейскі шоў-праект дапамог ёй выявіць свой талент. Падольскай ня шэнціла ў Беларусі, яна была вечна другой — і на «Славянскім базары», і на адборы «Эўравізіі». Расейскія прадусары зрабілі яе зоркай. За пару месяцаў яна займела папулярнасьць, імідж і першы альбом, зроблены у тэхнічным сэнсе бездакорна. Прадусуюць сьпявачку Іосіф Прыгожын і Віктар Дробыш, якія прасунулі не адну поп-зорку (Валерыя, Авраам Русо). Сярод тыповых поп-стандартаў на альбоме ёсьць і беларуская «Рэчанька», зробленая з разынкай — па-сучаснаму цікава і па-народнаму кранальна. Сама сьпявачка акрэсьліла мэту свайго ўдзелу ў «Фабрыцы»: набыць досьвед і ўславіць свой родны Магілёў. Апошняе дасягнута.

Адзнака: 7 (з 10).

**Сяргей Будкін**

## СЬЦІСЛА

### Падольская: на «Эўрабачаньне» ад Расеі

Беларуска Натальля Падольская заняла першае месца ў паўфінале адборачнага туру «Эўрабачаньне-2005» у Расеі. Паводле вынікаў галасаваньня гледачоў яна набрала 27% і апярэдзіла Варвару (20%) і дуэт «Чай вдвоём» (14%). 25 лютага — фінал адборачнага конкурсу.

Летась Натальля брала ўдзел у беларускім адборачным туры на «Эўрабачаньне» і не без скандалу была адсунутая на другую пазыцыю.

Ішчэ адны беларускія музыкі — ВІА «Харлі» — сёлета таксама прабіваліся на фэстываль у іншай краіне — яны сьпявалі ва Ўкраіне.

### «Аўтарадыё» стала беларускім

«Аўтарадыё» — адзіная з 15 FM-станцый, якая без падтасовак выконвае загад аб 75% беларускай музыкі ў этэры. На частаце 105,1 МГц штогадзіны можна пачуць беларускую музыку, прычым прадстаўнікоў усіх кірункаў і пераважна пабеларуску.

### «Краскі» ў турме

Беларускі поп-праект «Краскі» затрымалі ў поўным складзе пры праходжаньні пашпартнага кантролю ў аэрапорце Дзюсэльдорфу. Артысты прыехалі ў Нямеччыну з канцэртамі. Маскоўскі прадусар гурту кажа, што затрымалі беспадстаўна. Нямеччына — нешчасьлівая краіна для «Красак», летась ім туды не далі візы.

### «Drum Ecstasy» эмігруюць

Беларускі драм-н-басавы праект «Drum Ecstasy» можа стала атабарыцца ў Маскве. Хлопцы кажуць, што пасьля ўдзелу ў канцэрце 21 ліпеня на плошчы Бангалор у іх значна ўскладнілася жыцьцё. А ў Маскве яны зьбіраюць поўныя залі. Да таго ж «Drum Ecstasy» атрымалі запрашэньне паўдзельнічаць у стварэньні саўндтрэку да працягу кінагіту «Начная варта-2».

### «Сябры» і «Smokie» разам

На красавік заплянаваны сумесны тур легендарных брытанскага і беларускага калектываў па Расеі. Мяркуецца, што сумесныя канцэрты пройдуць ва ўсіх буйных гарадах — ад Пецярбургу да Ўладзівастоку, мажліва, у Фінляндыі ды Ізраілі. У Беларусі выступаў не плянуецца.

### Найлепшае фота-2004

Пераможцам міжнароднага конкурсу «World Press Photo» ў Амстэрдаме стаў фотакарэспандэнт агенцтва «Reuters» Арка Дата: на яго здымку індыйская жанчына аплаквае сваяка, які загінуў падчас сьнежаньскага цунамі (**справа**). Цунамі стала й галоўнай тэмай фатаконкурсу. Другое месца — у супрацоўніка часопісу «Time Magazine» Юр'я Козырава за матэрыял пра захоп школы ў Беслане.


REUTERS

### Памёр Артур Мілер

У веку 89 гадоў у сваім доме ў штаце Канэктыкут памёр драматург Артур Мілер. Памёр ад спыненьня сэрца, хаця меў цэлы букет хваробаў: рак, пнэўманію, сардэчную недастатковасьць. Працуючы на аўтамабільным заводзе, каб зарабіць на аплату каледжу, ён вырашыў заняцца літаратурай — пасьля прачытаньня «Братоў Карамазавых». Дэбютам у літаратуры стаў раман «Фокус», прысьвечаны праблеме антысэмітызму. За п'есу «Сьмерць комівояжэра» ў 1949 г. атрымаў Пулітцэраўскую прэмію. Аднак слава не перашкодзіла падазраваць яго ў сымпатыях да камунізму: у 1953 г. яму адмовілі ў праве выехаць у Брусэль на прэм'еру п'есы «Чараўніцы з Салему», а ў 1956 г. асудзілі за тое ж на адзін год турмы, але пасьля апэляцыі адмянілі прысуд. У 1956 г. Мілер ажаніўся з Мэрылін Манро, зь якой разам пражыў 5 гадоў, стаўшы ейным апошнім мужам. У аўтабіяграфічнай п'есе «Пасьля падзеньня» (1964) даў партрэт Мэрылін.

### Восем «Грэмі» Рэя Чарлза

Апошні альбом памерлага летась Рэя Чарлза «Genius Loves Company» атрымаў восем прэмій «Грэмі», у тым ліку як альбом году і запіс году. Найлепшым рок-альбомам прызнаны панк-рокавы «American Idiot», запісаны гуртам «Green Day».

### Музэй гісторыі польскіх габрэяў

У Варшаве зьявіцца Музэй гісторыі польскіх габрэяў. Такое рашэньне прынялі міністэрства культуры Польшчы й Габрэйскі гістарычны інстытут. Будынак разьмесьціцца на тэрыторыі 13 тыс. м² каля помніка Героям гета. Музэй мае асьвятляць ня толькі час Галакосту, але і ўсю 800-гадовую гісторыю габрэяў у Польшчы.

### Новы альбом Планта

Робэрт Плант, былы вакаліст «Led Zeppelin», абвясьціў, што 25 красавіка выпусьціць з гуртом «The Strange Sensation» новы альбом. Над дыскам «Mighty Rearranger» музыкі працавалі ў гарах на поўначы Ўэльсу ды ў графстве Сомэрсэт.

### Пяты Потэр

Пятую частку прыгод маленькага чарадзея кампанія «Ўорнэр Бразэрз» пачне экранізаваць у 2006 г., а на экранах фільм зьявіцца ў 2007-м Рэжысэрам фільму «Гары Потэр і Ордэн Фэнікса» мае быць брытанец Дэйвід Ейц.

**СБ, АВ; Gazeta.pl**

# Якая рэвалюцыя перамагае

Выснова з кіеўскіх падзей ад Беларусі да Казахстану адна: душыць у зародку. Апазыцыі ў гэтых краінах даводзіцца рыхтавацца да цяжкіх часоў. Але гісторыі ня спыніш. Ня спыніць яе ні Лукашэнка, ні нават Цзян Цзэмінь.

«Аранжавая рэвалюцыя» ва Ўкраіне паказала, што і сацыяльныя пераломы дапасоўваюць сваё аблічча да часу. У адрозьненьне ад колішніх змагароў з «Салідарнасьці», кіеўскія рэвалюцыянэры ні на сэкунду не заставаліся сам-насам з рэжымам. Злучаныя ў адзіную сетку тэлекамунікацыямі і падтрымліваныя замежнымі піяр-кансультантамі, яны расхісталі ўладу Кучмы.

## Інфармацыя ў любы час і ў любым месцы

Актывісты «Салідарнасьці» былі ў міжнароднай ізаляцыі і мусілі пераадольваць нечуваныя камунікацыйныя праблемы, у той час як сёньняшнія рэвалюцыянэры — ці то ў Бялградзе, ці ў Тбілісі, ці ў Кіеве — выкарыстоўваюць найсучасьнейшыя сродкі камунікацыі, лічаць Інтэрнэт і мабільную сувязь гэткімі ж само сабой зразумелымі рэчамі, як ксэракс ці факс, і атрымліваюць магутную падтрымку з Захаду. Тэхнічнай іконай змаганьня супраць Ярузэльскага і яго таварышаў быў капіявальны апарат, падрыўны алькагольны пах якога ачмураў прагрэсіўнае пакаленьне таксама й на Захадзе. У астатнім рэвалюцыянэрам была даступная толькі сыстэма распаўсюду «з вуснаў у вусны» ды стацыянарны тэлефон. Пакуль інструкцыі з прафсаюзнага каардынацыйнага цэнтру даходзілі да шараговых актывістаў, магло прайсьці вельмі шмат часу.

Тым часам калі ў лістападзе штосьці здаралася ў Данецку, у Кіеве гэта ведалі ўжо праз сэкунды. На традыцыйныя СМІ пры гэтым мала зважалі. Пасьля забойства журналіста Георгія Гангадзэ Інтэрнэт стаў для ўкраінскай моладзі сымбалем непадкупнасьці. Кантраляваныя ўрадам газэты, якія тады бессаромна хлусілі, да сёньня застаюцца дыскрэдытаванымі. Праўду шукаюць у віртуальнай прасторы.

Ідэя надаць рэвалюцыі колер, як прадукту, аказалася неймаверна пасьпяховай. Ва Ўкраіне мы ўбачылі першую «Corporate Revolution». Дастаткова было шаліка, каб паказаць язык карумпаванаму рэжыму. Той, хто насіў аранжавае, быў сваім, рэвалюцыянэры бачылі сьведчаньні ўласнай моцы на кожным кроку, і ўсё, што й дагэтуль было аранжавым, — лягатыпы фірмаў, аўтобусы, уніформа дарожных работнікаў — міжволі стала рэклямай. Сучасная рэвалюцыя прэзэнтуе сябе лёгка і шыкоўна: падспуднае дзікунства колішніх барадатых дэманстрантаў саступіла месца стылёваму іміджу, і мала хто яшчэ бярэ ў рукі гітару каля вогнішча ў лягеры.

Натуральна, на пытаньне, чаму ў Кіеве зьдзейсьнілася рэвалюцыя, нельга адказаць адно спасылкай на новыя формы камунікацыі і пытаньні стылю. Нашмат важнейшым было палітычнае асяродзьдзе: дзеяньне адбывалася ў бязладнай, але надзвычай плюралістычнай постсавецкай дзяржаве, тады як людзі Валенсы яшчэ мелі справу з камуністычнымі тыранамі, якіх мала хвалявала захаваньне дэмакратычнага фасаду, на якое Кучма паклаў так шмат высілкаў. Рэвалюцыя ў Кіеве магла адбыцца толькі таму, што Ўкраіна, нягледзячы на ўсе заганы, ужо далёка адышла ад таталітарнай сыстэмы, таму што ў канкурэнтным аўтарытарызьме Кучмы як у палітычных, так і ў эканамічных адносінах было некалькі цэнтраў уплыву і таму што апазыцыя завявала моцныя пазыцыі ў парлямэнце і грамадзтве.

У гэтым асяродзьдзі неацэнным плюсам аказалася й тое, што дзеяньні апазыцыі былі выключна мірнымі і амаль заўсёды законнымі. Ня штурмы палацаў, правакацыі і крывавыя сутычкі, а судовыя вэрдыкты і рашэньні парлямэнту пазначалі найважнейшыя крокі наперад у Кіеве. «Corporate Revolution» была строга легітымнай рэвалюцыяй. Юшчанку гэта будзе на карысьць.

Рэвалюцыя была модная, яна была сучасная, яна была нахабная, але яна напэўна не была… антыкапіталістычная. І таму эўрапейскія левыя ня так ужо й цёпла да яе паставіліся. Пурыстаў адштурхоўвалі лібэральныя лёзунгі апазыцыі, яе дзелавы тон і яе блюзьнерская весялосьць, але перадусім — яе добрыя сувязі з замежжам. Тое, за што падчас выбарчай барацьбы выступалі Юшчанка і яго дэмакратычныя прыхільнікі, ні на каліва не цікавіла сацыял-дэмакратыю Эўропы. З паблажлівых, незацікаўленых галасоў сацыялістаў Продзі і Саляны летам ясна можна было вычуць толькі адно: ня злуйце Расеі!

Калі ж усё пачалося, адразу ўсплыло падазрэньне левых, і натуральна, яно зноў гучала — «Амэрыка». У кіеўскіх дэманстрантах яны бачылі не свабодалюбівых паўстанцаў і ідэалістычных юнакоў, а лёкаяў ЗША, найманых агентаў банальнай рэвалюцыі спажыўцоў «Кока-колы», нават агентаў ЦРУ. Старая левая крывадушнасьць адрадзілася. Калі ўжо нам самім у Бад-Годэсбэргу даводзіцца адмаўляцца ад старых грахоў да хрысьціцца ў капіталізм, каб здабыць галасы выбарцаў, хай хаця б іншыя, далёкія, бедныя працягваюць жыць сацыялістычнай марай. Тое, што лібэралізм адваяваў свае права на рэвалюцыю, замоўчваецца.

Ва ўладароў у постсавецкай прасторы, ад Лукашэнкі да Назарбаева, кіеўскія зьмены, натуральна, выклікалі яшчэ большую злосьць. Гэтыя кіраўнікі — у сярэднеазіяцкай прасторы яны ўсе бяз вынятку былыя генэральныя сакратары кампартый — баяцца за сваю ўладу і крохкую легітымнасьць сваіх «кіраваных» дэмакратый, і іхная — абсалютна лягічная — выснова з кіеўскіх падзей паўсюль адна і тая ж: душыць у зародку. Апазыцыі ў гэтых краінах даводзіцца рыхтавацца да цяжкіх часоў.

Аднак ніводную краіну рэвалюцыя ў Кіеве не зьбянтэжыла так, як Кітай. Бо ніводная краіна апошнія 25 гадоў не жыла такой моцнаю верай у тое, што эканамічнага і тэхнічнага прагрэсу можна дасягнуць і безь непрыемных грамадзка-палітычных вынікаў. Уладная кліка ў Пэкіне вызнае пасьлядоўна непалітычны мадэрнізм, у якім вітаецца любая форма прагрэсу, апроч эмансыпацыйнай. Машыны, акцыі, замежныя падарожжы — так, дэмакратыя і праваная дзяржава — не. Дагэтуль кітайскай кампартыі шанцавала з гэтай стратэгіяй. Сацыяльныя супярэчнасьці хоць і растуць, але масавыя пратэсты пасьля расправы на плошчы Цяньаньмэнь адсутнічаюць, а Захад, інтэлектуальна і маральна ачмураны пэрспэктывамі гіганцкіх прыбыткаў у Сярэдзіннай Імпэрыі, не дазваляе сабе крытыкаваць тыранію ў Кітаі з памылкова зразуметай этнічнай павагі.

## Незадаволенасьць Пэкіна

У прынцыпе пэкінскія ўлады маглі б не турбавацца. Мабільныя тэлефоны і Інтэрнэт самі па сабе ня робяць рэвалюцыі, яны робяць рэвалюцыю толькі ў руках бясстрашных людзей, якія ўжо маюць пэўны мінімум правоў. Але ў Кітаі пра гэта пакуль няма гаворкі. Цяньаньмэнь глыбока засеў у калектыўнай сьвядомасьці, і гэта на карысьць уладзе. Але тое, як нечувана хутка пакорлівыя савецкія людзі ператварыліся ва ўпэўненых у сабе грамадзян і як эфэктыўна яны выкарыстоўвалі ўсе тэхнічныя навінкі сучаснай камунікацыі, каб скінуць карумпаваную ўладную эліту, мусіць моцна раздражняць КП Кітаю.

Цяжка не заўважыць, наколькі падобная жыцьцёвая пазыцыя шанхайскіх хлопчыкаў да жыцьцёвай пазыцыі іх равесьнікаў у Кіеве. Пры гэтым здавалася, што сёньняшнія дзеці цікавяцца адно забавамі, што яны апалітычныя. Цяпер так ужо не здаецца. У Кіеве, як і ў Пэкіне, уладары выклікалі духаў тэхнічнага прагрэсу, каб тыя паклапаціліся пра дабрабыт і такім чынам забясьпечылі ім мінімум легітымнасьці. Пра дэмакратыю пры гэтым ніхто не падумаў. Аднойчы — і, магчыма, хутчэй, чым шмат хто падазрае, — і Пэкін ня здолее пазбыцца духаў, якіх сам выклікаў.

**«Neue Zuercher Zeitung»**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**КІТАЙСКІ ШЛЯХ: машыны, акцыі, замежныя падарожжы — так, дэмакратыя і прававая дзяржава — не. На фота — Юй Чжэньці, пасол КНР у Беларусі.**

# Прыгажуня і пачвара

Эўропа: «Кандалізу хачу!» — Абас як рэінкарнацыя Гарбачова. — Атамная «валянцінка». — Ану, прыбяры свой (ядзерны) чамаданчык! **Лёлік Ушкін** аглядае сусьветную прэсу.

Перад Днём Сьвятога Валянціна палітычны сьвет пранікся флюідамі каханьня.

Больш за ўсё «валянцінак» у прэсе атрымала Кандаліза Райс, якая падчас турнэ па Эўропе памірыла Брусэль з Вашыгтонам. Індыкатарам настрояў можна лічыць словы Сымона Тысдала з брытанскай «Гардыян»: «Яна як кіназорка. Яе твар упрыгожвае тысячу газэтных старонак. Кожнае яе слова — навіна. Эўрапейскія лідэры сварацца паміж сабой за права запрасіць яе ў госьці. Канцлер Германіі Шродэр падобны на фана-тынэйджэра, які ўпарта чакае куміра каля дзьвярэй. Эўропа зноў закахалася… А вось і знак вясны: упершыню за 40 гадоў сустрэча NATO адбылася на францускай глебе з удзелам bête noire — Доналда Рамсфэлда, міністра абароны ЗША».

У той жа «Гардыян» Тымаці Гартан Эш параўноўвае другі прэзыдэнцкі тэрмін Буша з другім тэрмінам Рэйгана. Эўрапейцы спачатку таксама не любілі галівудзкага каўбоя. Аднак не пасьпеў Гарбачоў паціснуць яму руку, як Роналда аднагалосна прызналі доўгачаканым вызваліцелем сьвету ад «імпэрыі зла». На думку Эша, у Буша ёсьць свой Гарбачоў — гэта палестынскі прэм'ер Абас, які пачаў мірны дыялёг з Шаронам. Эўрапейцаў проста замбуе, калі палітыкі пачынаюць паціскаць адзін аднаму рукі.

У кантэксьце новай сэрыі трансатлянтычнага раману цікавы прагон Каралін Пастэль-Вінэ ў французскай «Лібэрасьён». Аналізуючы прыроду дэмакратыі, яна сьцьвярджае, што яе «маніфэстам лёсу» сталі словы прэзыдэнта ЗША Вудры Ўілсана. Адпраўляючы амэрыканскі экспэдыцыйны корпус на дапамогу Антанце, ён абвясьціў экспарт дэмакратыі альфай і амэгай існаваньня гэтай палітычнай сыстэмы. Таму сучасны мэзальянс паміж Эўропай і ЗША чыста тэхнічны: эўрапейцы разглядаюць тэрарызм як праяву крыміналу, а янкі — як абсалютнае зло. «Але ў рэальнасьці палітыка Эўразьвязу тая самая — напрыклад, фінансавая праграма па прасоўваньні дэмакратыі ў трэцім сьвеце. У такім разе чаму мы (эўрапейцы. — **ЛУ**) талерантна ставімся да аўтарытарызму ў Кітаі або да факту дэградацыі грамадзянскіх свабод у Расеі і пры гэтым лічым прымальнай інтэрвэнцыю ў Аўганістан у мэтах будаўніцтва дэмакратыі? Дзе крытэры дазволу на права ўмяшаньня ва ўнутраныя справы?»

Такім чынам, усё было добра. Амэрыканцы быццам пагадзіліся не чапаць Ірану, Кітаі, у якога хутка алімпіяда, для паляпшэньня іміджу запусьцію дэзу пра дыялёг з Тыбэтам, прынц Чарлз папрасіў рукі ў каханкі Камілы, расейскі мінабароны Сяргей Іваноў нагаварыў NATO такіх дыфірамбаў, што «Московский комсомолец» зьдзівіўся, чаму Расея яшчэ ня сябар альянсу.

Усіх абламаў Кім Чэн Ір, які ў масавай сьвядомасьці перахапіў у Садама вобраз чалавеканенавісьніцкай пачвары. Напярэдадні дня ўласнага нараджэньня, 16 лютага, ён зрабіў сабе супэрпадарунак — атамную бомбу.

Частка экспэртаў успрынялі заяву Пхеньяну як піжонства. Напрыклад, нямецкая «Вэльт» заявіла, што «заява Паўночнай Карэі аб ядзернай зброі — тактычны манэўр, крок, накіраваны на тое, каб атрымаць перавагу за сталом перагавораў».

Аднак большая частка работнікаў газэтнага цэху прызналі навіны з Карэі за жорсткую праўду.

Гішпанская «Паіс»: «Новая сытуацыя не пакідае Вашынгтону ніякай прасторы для манэўру. Замест таго каб пагражаць, прэзыдент Буш павінен пераканаць рэжымы накшталт іранскага і паўночнакарэйскага ў тым, што ядзерная зброя не павялічвае іх бясьпекі».

Вось такім мінорным атрымаўся фінал тыдня.

Каб закончыць у мажоры, працытую «Эканаміста», які лічыць, што нават ў такой кепскай сытуацыі ёсьць нешта добрае, а менавіта — усьведамленьне вялікімі дзяржавамі неабходнасьці стварэньня адзінага цэнтру па кантролі над ядзернай зброяй — «ініцыятыва Вашыгтону, да якой фактычна далучылася Расея і якую на словах ухваліў Кітай».

# Апошняя сьведка

Працяг са старонкі 2.

Па краіне хадзілі сьпісы яго прымет, аб сустрэчах зь ім паведамлялася праз два стагодзьдзі пасьля яго зьнікненьня.

У пачатку XVIII ст. краіну ахапіла сапраўдная эпідэмія зрокавых уяўленьняў. Людзі расказвалі, што бачылі рай, пекла, і, нягледзячы на перасьлед інквізыцыі, не адмаўляліся ад сваіх слоў. Сытуацыя была ў нечым падобная на сытуацыю, якую апісаў У.Караткевіч у рамане «Хрыстос прызямліўся ў Гародні». Дарэчы, свой Хрыстос «прызямліўся» тады і ў Лісабоне, дзе яго спалілі ў 1725 годзе.

Таму ніхто асабліва не зьдзівіўся, калі ў 1917-м краіну аблятае чутка пра незвычайныя падзеі ў вёсцы Фатыма.

У фатымскай легендзе можна вылучыць тры моманты: зьяўленьне Марыі тром пастушкам, іх перасьлед мясцовымі «вэртыкальшчыкамі», цуды з сонцам (не пацьверджаныя, аднак, астраномамі) як доказ сапраўднасьці слоў юных візіянэраў.

Са сьведкаў цуду неўзабаве засталася толькі старэйшая дзяўчынка Люсында. Прыняўшы імя сястры Марыі, яна зачынеецца ў кляштары. Да яе прароцтваў прыслухоўваецца ўвесь каталіцкі сьвет. У 1945 годзе сястра Люсія-Марыя абвяшчае, што Божая Маці прадказала, нібыта Расея заваюе ўвесь сьвет. Адзінай жа абаронай зьяўляецца культ Сэрца Божага, які ўжо абараніў Партугалію падчас Другой сусьветнай. З таго часу фатымскай Божай Маці адводзіцца роля галоўнай зброі ў барацьбе за душы патэнцыйных вернікаў ва ўсім сьвеце, і асабліва ў камуністычным лягеры.

Цікавасьць да Фатымы падагравалі чуткі аб прароцтвах, перададзеных сястрой Люсіяй асабіста Пію XII. Казалі, што сярод іх ёсьць прадказаньне трэцяй сусьветнай вайны. Сьцьвярджалі, што дзякуючы папярэджаньням, якія ўтрымліваліся ў тых прароцтвах, Ян Павал II пазьбег сьмерці ад рук турэцкіх ісламістаў.

Сёньня сьвет падзяляецца на тых, хто верыць фатымскім прароцтвам, і тых, хто ставіцца да іх скептычна. Партугалія ж імі проста жыве, бо на сёньня Фатыма — самае папулярнае месца паломніцтва каталікоў з усяго сьвету. А сьмерць сястры Люсіі выклікала нацыянальную жалобу ў краіне. Нават сацыялісты заявілі аб прыпыненьні перадвыбарнай кампаніі.

**Вацлаў Шаблінскі**

## СЬЦІСЛА

### Літву адразаюць

Літва скарачае колькасьць аўтобусных маршрутаў у Беларусь. Такое рашэньне транспартныя кампаніі прымаюць вымушана — новы падатак за выкарыстаньне дарог, уведзены ў Беларусі ад пачатку гэтага году, робіць беларускія рэйсы стратнымі. Ад 1 студзеня гэтага году замежныя транспартныя сродкі, у якіх колькасьць месцаў большая за 30, павінны плаціць 35 даляраў за суткі, калі яны едуць праз Беларусь. Падлічыўшы выдаткі за першыя тыдні гэтага году, літоўскія транспартнікі вырашылі, што з усіх беларускіх маршрутаў можна пакінуць толькі Коўна—Менск, Вільня—Менск, Паланга—Менск, Вільня—Гіры і Вільня—Пінск. Толькі дзьве транспартныя кампаніі з 12 захаваюць рэйсы ў Беларусь. Карацейшыя маршруты, якія злучалі невялікія гарады і мястэчкі, робяцца нерэнтабэльнымі. Магчыма, некаторыя маршруты аўтобусаў на беларуска-літоўскім памежжы падтрымае дзяржаўны бюджэт Літвы. Гэта аўтобусы на Опсу, Гервяты, Пелясу і маршруты Ігналіна—Відзы, Вісагінас—Браслаў, Вільня—Гіры і Трокі—Ліда — у зоны, дзе жыве хоць трохі літоўцаў. Беларусы ж ніякіх датацый на рэйсы ў раёны, дзе жыве беларускамоўнае насельніцтва, ніколі не выдзялялі.

### Фундацыя Бэртэльсмана пра Беларусь

Новая стратэгія дачыненьняў Эўразьвязу і Беларусі выпрацоўвалася ў Вільні ў часе канфэрэнцыі, якую нямецкая Фундацыя Бэртэльсмана ладзіла супольна зь літоўскім МЗС. У сустрэчы бралі ўдзел супрацоўнікі замежнапалітычных ведамстваў шэрагу эўрапейскіх краінаў, прадстаўнікі няўрадавых арганізацыяў. Новая стратэгія мае на мэце ўплыў ЭЗ на прэзыдэнцкую выбарчую кампанію 2006. У рэкамэндацыях вылучаныя наступныя патрэбы. 1) Стварэньне ЭЗ гнуткага фінансавага мэханізму, які б мог спрыяць дэмакратычным працэсам у Беларусі — найлепш адмысловага фонду, падсправаздачнага Эўракамісіі. 2) Узмацненьне захадаў народнай дыпляматыі паміж Эўразьвязам і Беларусьсю ды заснаваньне ў Менску Эўрапейскага дому, які б кампэнсаваў для беларусаў дэфіцыт інфармацыі пра новую Эўропу, а эўрапейцам — пра Беларусь.

Як лічаць распрацоўшчыкі гэтай канцэпцыі, Эўропе неабходна знайсьці яркую палітычную асобу, якая б дапамагла разбурыць існуючую ізаляцыю ды самаізаляцыю, што перашкаджаюць Беларусі супрацоўнічаць з Эўропай.

### Каралявец вернецца ў Эўропу

«Калінінграду трэба надаць афіцыйны статус замежнай тэрыторыі», — заявіў прадстаўнік Пуціна ў Паўночна-Заходняй акрузе Ільля Клябанаў. Як піша газэта «Известия», пад асаблівым статусам маецца на ўвазе адаптацыя рэгіянальнага заканадаўства да законаў Эўразьвязу і ў пэрспэктыве ўваходжаньне вобласьці ў зону эўра. Ідэю асаблівага статусу для Калінінграду даўно прапануюць Польшча і Літва.

### Расейцам не стае волі да жыцьця

Нягледзячы на тое што ўзровень жыцьця ў Расеі пасьля распаду СССР значна павысіўся, сярэдняя працягласьць жыцьця мужчын у параўнаньні з папярэднім дзесяцігодзьдзем скарацілася на пяць год. Пры гэтым сярэдні расеец жыве толькі 58,6 году, тады як жанчына — 73 гады.

Вырасла сьмяротнасьць мужчын у маладым і сярэднім узросце.

На думку экспэртаў, расейцаў забівае нездаровае харчаваньне і алькаголь. Штогод у выніку алькагольных атручэньняў у Расеі паміраюць тысячы людзей, а праз недахоп волі да жыцьця расейцы радзей ходзяць да дактароў.

### Экскурсія ў ГУЛАГ

Прыклад Асьвенціму прыйшоўся даспадобы некаторым расейскім прадпрымальнікам. Цяпер за 600 даляраў кожны ахвотны зможа наведаць былыя савецкія папраўчапрацоўныя лягеры. Праўда, толькі тыя, якія больш-менш добра захаваліся, — пад Краснаярскам. Вандроўкі ладзіць расейская фірма «Дула Турс».

На экскурсію на архіпэляг ГУЛАГ турысты будуць выпраўляцца як сапраўдныя вязьні — зь мясцовага порту. Ім давядзецца правесьці на палубе «Антона Чэхава» 12 дзён. Праз суровы клімат экскурсіі будуць адбывацца толькі летам.

**АП; Руслан Равяка; радыё «Свобода»**

## ЦЫТАТА

### Міністарка замежных справаў Швэцыі: Беларускі народ мае законнае месца ў эўрапейскай супольнасьці

Міністарка замежных справаў Швэцыі Ляйла Фрэйвальдс заклікала працягваць у дачыненьні да беларускіх уладаў ізаляцыйную палітыку, аднак пры гэтым актыўней падтрымліваць дэмакратычныя сілы ў краіне. Паводле спадарыні Фрэйвальдс, беларускі народ мае сваё законнае месца ў аб'яднанай эўрапейскай супольнасьці. Прадстаўляючы Рыксдагу новыя кірункі нацыянальнай замежнай палітыкі, міністарка спынілася на дачыненьнях з Украінай і Беларусьсю. Паводле яе словаў, Украіна заслужыла права на далучэньне да Эўразьвязу. Што да Беларусі, то яе кіраўніцтва па-ранейшаму ігнаруе дэмакратыю і правы чалавека. Аднак, сказала спн. Фрэйвальдс, Беларусь — наш сусед. Стакгольм бліжэйшы да Менску, чым да паўночнашвэдзкага гораду Кіруна. А беларускі народ мае законнае права на месца ў эўрапейскай супольнасьці.

**Цыт. паводле радыё «Свобода»**

# Жонкі палітыкаў

## Тацяна Сурская — жонка Коласа

Тацяна і Ўладзімер знаёмыя зь дзяцінства. «Мы былі ў 5-й клясе, калі нашыя бацькі павялі нас разам у цырк, — распавядае сп. Тацяна (**на фота справа**). — Наступным разам сустрэліся ўжо ў інстытуце».

Кватэра Ўладзімера Коласа і ягонай жонкі застаўлена шматлікімі слоікамі з апэтытнымі марынадамі. Садавіну вырошчваюць самі, аднак у астатнім лецішча сям'і Коласаў нагадвае газон — усё лета спн. Тацяна разводзіць там кветкі.

Жонка дырэктара забароненага Ліцэю слухае «Бітлз» і Моцарта, разам з дачкой «у чатыры рукі» грае на фартэпіяна.

Да прэзыдэнцкага патэнцыялу мужа Тацяна Сурская ставіцца надзвычай сур'ёзна: «У майго мужа ўдаецца ўсё, за што ён бярэцца. Кожную справу ён даводзіць да канца».


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Валянціна Статкевіч

Валянціна і Мікола Статкевічы — аднапартыйцы. Яна падзяляе сацыял-дэмакратычныя погляды мужа, удзельнічае ва ўсіх ягоных палітычных кампаніях. Не глядзіць сэрыялаў і па-майстэрску гатуе салаткі, якія так любіць яе муж. Вяжа шалікі і шкарпэткі, а пару год таму падарыла мужу швэдар, зроблены ўласнаручна. Ганарыцца, што праца палітыка не замінае сп.Статкевічу быць клапатлівым супругам і заставацца рамантычнай асобай. «Ён увесь час дорыць мне кветкі, — хваліцца спн.Валянціна. — Скупае і прыносіць якія толькі можна, ад тульпанаў да архідэяў».


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Сьвятлана Лябедзька

Сьвятлана (**на фота зьверху**) і Анатоль Лябедзькі разам вучыліся ў інстытуце: «Каб мне нехта на першым курсе сказаў, што на пятым я выйду за Анатоля, ні за што не паверыла б! Тады здавалася, ну што ў нас можа быць супольнага?»

У шлюбе Лябедзькі 20 гадоў. Лідэр АГП, нягледзячы на шалёны тэмп жыцьця, не забывае шторанак гатаваць для жонкі каву. І нярэдка перад прыняцьцем важных рашэньняў просіць у яе парады.

Спн.Сьвятлана — настаўніца ангельскай мовы. Таму шмат часу ёй даводзіцца праводзіць за вучнёўскімі сшыткамі. Аддае перавагу актыўнаму адпачынку. Цяпер больш за ўсё марыць, каб зь сям'ёй выбрацца на лыжы, «але ж мужа амаль ніколі няма ў хаце!».

## Іна Кулей — жонка Мілінкевіча

«Мой муж можа зладзіць для мяне вясну хоць у лютым! — распавядае спн.Іна (**на фота ўнізе**). — На Дзень Сьвятога Валянціна ён зьявіўся з агромністым букетам жоўтых тульпанаў, з цэлым ахапкам. І адразу стала так цёпла!»

Захапленьне жыцьця для Іны Кулей — званочкі. У калекцыі іх больш за сотню — сябры вязуць іх для яе з усіх краінаў сьвету. Аднак улюбёны — керамічны беларускі званочак, зроблены ў выглядзе вароны з шырока расплюшчанымі блакітнымі вачыма.





## Галіна Вашчанка, жонка Пазьняка

Зянон і Галіна пабраліся шлюбам у магілёўскім касьцёле Сьвятога Станіслава ў 1994 г. І з таго часу Галіна заўжды застаецца з мужам. І заўжды глядзіць на яго з захапленьнем.

Гэтае фота было зробленае шчэ ў Менску. На жаль, нам не ўдалося скантактавацца з спн.Вашчанкай, якая цяпер разам з мужам перабывае на выгнаньні ў ЗША.

**Юлія Дарашкевіч**

## ДАРОГА ДА СЭРЦА ПАЛІТЫКА

### Асарці ад Тацяны Сурскай

У трохлітровы слоік пакласьці зеляніну: кроп (парасонамі), базылік, эстрагон, лісты хрэну, парэчкі і вішні. Запоўніць слоік «моцнымі» памідорамі, маладымі агуркамі, патысонамі ці кабачкамі, парэзанымі на кавалкі, цьвятной капустай і морквай (папярэдне бляншаваць). Дадаць дробныя цыбуліны і зубкі часнаку.

На 10 хвілінаў заліць слоік кіпнем. Пасьля зьліць гэты расол у каструлю, дадаць туды тры сталовыя лыжкі солі, тры сталовыя лыжкі цукру, дзьве сталовыя лыжкі солі, трацінy шклянкі яблычнага воцату і давесьці да кіпеньня.

Заліць расолам гародніну і закатаць.

### Кіслая капуста ад Валянціны Статкевіч

Капусту рэжам на 4—6 частак так, каб лісты засталіся на качанах. Складваем у эмаліраваны посуд і заліваем падсоленай вадай на двое сутак (стакан солі на пяць літраў вады). Потым заліваем новым расолам — з разьліку 1 сталовая лыжка солі зь верхам і 1 сталовая лыжка цукру бязь верху на 1 літар вады. Дадаем моркву, парэзаную саломкай, і часнок — 3 галоўкі, нарэзаныя пласьцінкамі.

Капусту трымаць 1—2 тыдні пры пакаёвай тэмпэратуры. Гатовы прадукт захоўваць у халадзе.

### Салянка ад Сьвятланы Лябедзькі

Варыцца курыны булён (можна замяніць булёнам з кубіка).

На патэльні ў таматным соўсе (ці проста з памідорамі) смажацца 10—15 масьлінаў, дробна парэзаная цыбуля і марынаваныя агуркі. Уся гэтая маса заліваецца курыным булёнам (папярэдне працэджаным) і даводзіцца да кіпеньня. Потым на патэльню дадаюцца кавалачкі мяса ці курыцы, кумпяка, кілбасы, сасісак — любых мясных прадуктаў, што ёсьць у хаце. Усё разам смажыцца яшчэ хвілінаў 8—10. Салянку падаюць з рэзьнічкам лімону і сьмятанай.

### Бульбяныя піражкі з грыбным соўсам ад Іны Кулей

З варанай бульбы робіцца пюрэ. Туды дадаецца яйка і пару лыжак мукі.

Для начынкі бярэцца фарш, напалову разбаўлены зялёнінай — пятрушкай, кропам, кменам. Лепяцца маленькія шарыкі і абсмажваюцца ў алеі. Затым робіцца самі піражкі — у блінчыкі зь пюрэ ўкладаецца мясная начынка.

Піражкі абмазваюцца ўзьбітымі яйкамі і гатуюцца ў духоўцы 25—30 хвілінаў.

Соўс: вараныя грыбы абсмажваюцца з пасіраванай цыбуляй. Затым трэба дадаць шклянку вады і лыжку мукі.

# Рызыкоўная барацьба намэнклятуры

Працяг са старонкі 1.

Першай ахвярай ГПУ стаў лідэр беларускіх нацыяналістаў, акадэмік Усевалад Ігнатоўскі. Яго выклікалі ў ГПУ на допыт, пасьля якога ён застрэліўся на сваёй кватэры. ГПУ разьлічвала, што праф. Ігнатоўскі назаве асобаў нацыянальнага руху, якія ставілі задачу скіданьня ў Беларусі савецкага рэжыму, абвяшчэньня незалежнасьці і ўсталяваньня дэмакратычнага ладу. Прафэсар выбраў сьмерць. Сьмяротным ударам былі арышты наркама земляробства Зьмітра Прышчэпава, ягонага намесьніка Алеся Адамовіча і наркама асьветы Антона Баліцкага.

Асоба Алеся Адамовіча вартая асобнай кнігі. Ён пасьпеў пабыць сакратаром Калінінскага і Полацкага акруговых камітэтаў КП(б)Б, загадчыкам аддзелу друку ЦК КП(б)Б, намесьнікам наркама (намесьнікам міністра, калі браць па цяперашняй шкале) земляробства. Менавіта яму, нефармальнаму куратару «Маладняку», прысьвяціў сваю паэму «Калінінішчына» Дубоўка. Адамовіч стаў прататыпам Дубоўкавага «кандуктара» з паэмы «Штурмуйце будучыні аванпосты!», Сьляпня ў рамане М.Зарэцкага «Крывічы», Абрама Ватасона ў рамане Кузьмы Чорнага «Сястра».

Гэта быў умелы арганізатар і пасьлядоўны праваднік нацыянальных інтарэсаў. Ён беларусізаваў усходнія ўскрайкі БССР (цэнтар Калінінскай акругі — Клімавічы) непрацяглы час, але вынік працы быў надзвычайна плённым — з краю над Бесядзьдзю і Сожам выйшла плойма маладых талентаў. Куляшоў, Астапенка і Таўбін — пачынальнікі тае славы — свае першыя публікацыі зрабілі ў альманаху «Маладняк Калінішчыны» (1926).

Большасьць скандальных фэльетонаў Вольнага, артыкулаў Дудара, Александровіча, Зарэцкага (у тым ліку пратэст супраць «небеларускага» ўнівэрсытэту) былі напісаныя на замову Адамовіча. «Куратар», раскалоўся Дудар, замаўляў яму артыкул «на ўзор валабуеўскага ў «Більшовику України», з эканамічным абаснаваньнем нацыяналістычных тэорый Шумскага і Хвылёвага. Замаўляючы, Адамовіч «мнагазначна дадаў, што аўтар артыкулу «сасланы ў Салаўкі».

Ён ведаў, чым яны рызыкавалі. Алесь Дудар на допытах у ГПУ выдаў, што Алесь Адамовіч трымаўся падкрэслена кансьпірацыйнага тону гутарак. Наватвор «сачкам», ад слоў «сачыць» і «камісар», быў створаны менавіта віцэ-міністрам Адамовічам. «Сачкаманіяй» — строгай разборлівасьцю ў знаёмствах і выбары суразмоўцаў — ён заражаў і іншых.

«Слова «вождь» (на расейскай мове) было ў Адамовіча лаянкай», — кажа Дудар. З правадыроў Адамовіч зьдзекліва іранізаваў.

## На патрыятычным уздыме

Выдатныя лідэрскія і арганізацыйныя здольнасьці меў і Антон Баліцкі, адзін з самых актыўных праваднікоў палітыкі беларусізацыі ў 1920-х гадах.

У Наркамасьветы, разам з Жылуновічам і Некрашэвічам ён стварыў кааперытыўнае выдавецтва «Адраджэньне», выдаваў падручнікі. Рабілася гэта пры дапамозе Ігнатоўскага, тагачаснага наркама асьветы.

Вечарамі «на агеньчык да Баліцкага» заходзілі ня толькі Некрашэвіч, Жылуновіч, але і Кудзелька (Міхась Чарот), Прышчэпаў, іншыя ключавыя «мясцовыя кадры» апарату БССР.

У 1926 годзе на пасадзе наркама асьветы Баліцкі замяняе Ігнатоўскага. У гэтым жа годзе Інбелкульт наладжвае акадэмічную канфэрэнцыю па рэформе беларускага правапісу. Канфэрэнцыя прайшла на эмацыйным патрыятычным уздыме, а яе арганізатары атрымалі па шапцы: на сцэне адсутнічаў партрэт Леніна, затое заля была аформлена ў нацыяналістычныя колеры.



На гэты момант у БССР з 4057 чатырохгадовых школ па-беларуску выкладалі 3794 (93,5%). 1 студзеня 1927 году Ігнатоўскі вымушаны апраўдацца ў «Зьвязьдзе» супраць публікацый у замежным друку, дзе паведамлялася, што «народна-дэмакратычны рух накіраваны проці ўлады ў Савецкай Беларусі» і рыхтуе паўстаньне».

## Разьвязка

Аднак беларускі ўрад быў урадам толькі напалову. Ён не кіраваў сілавымі структурамі. Масква кантралявала Менск цалкам праз сваіх «казачкоў». Як толькі Сталіну сталі без патрэбы нацыянал-камуністы з рэспублік, на якіх ён раней абапіраўся ў сваі барацьбе з трацкістамі і іншымі ўхілістамі, ён пачынае разгром нацыянальных элітаў.

Гісторыя ня любіць умоўнага ладу, і тым ня менш: што магло б ўратаваць Беларусь ад сталінскага генацыду? Паўстаньне, аддзяленьне, абвяшчэньне незалежнасьці? Магчыма, паралельна з Украінай, на хвалі незадаволенасьці калектывізацыяй, голадам… Структуры, якія так старанна разбудоўвалі нацкамы, былі не гатовыя да таго. Каб яшчэ пару гадоў… Мо тады між Балтыйскім і Чорным марамі знайшліся б свае Манэргеймы, што ўратавалі б усходнеэўрапейскія народы ад крывавага памолу.

Першым, 17 лютага 1930 году, быў арыштаваны Ільлючонак. 26 чэрвеня — Смоліч. 14 ліпеня — Цьвікевіч. 17 ліпеня — Лёсік. 18 ліпеня — Алесь Адамовіч і Максім Гарэцкі. 19 ліпеня — Прышчэпаў. 20 ліпеня — Дубоўка. 21 ліпеня — Некрашэвіч і Ластоўскі. 31 жніўня 1929 г. Баліцкі вызваляецца ад пасады наркама асьветы. Яго арыштуюць праз год — 3 верасьня 1930 году. Тады сьледчыя некаторы час спрабавалі паставіць на чале «СВБ» мацёрых нацыяналістаў Ластоўскага-Цьвікевіча-Смоліча. Але нічога не ўдалося, іх уплыў у савецкай Беларусі быў невялікі — і пачалі шукаць Баліцкага.

4 лютага 1931 г. застрэліўся Ігнатоўскі, 11 красавіка 1937 г. скончыў жыцьцё самагубствам у магілёўскай псыхушцы Жылуновіч. Хто заставаўся з жывых — быў зьнішчаны ў 1937 г. Чарвякоў, адзін з апошніх «зуброў»-нацкамаў, застрэліўся. А неўзабаве вынішчылі многіх чэкістаў-сьледчых, што вялі справу «СВБ». Каб у гісторыі не засталося сьлядоў.

> У 1930 годзе структуры, якія разбудоўвалі нацкамы, былі не гатовыя да аддзяленьня ад СССР. Але яшчэ пару гадоў, і між Балтыйскім і Чорным марамі знайшліся б свае Манэргеймы.



**АНТОН БАЛІЦКІ. Наркам асьветы, адзін з самых актыўных праваднікоў палітыкі беларусізацыі, здольны быў стаць ня толькі апаратным, але і дзяржаўным лідэрам. Яму аднолькава добра ўдавалася кіраваць вайскоўцамі, наладжваць асьвету і гуртаваць «мясцовыя кадры».**

## Хто кіраваў?

Калі чытаеш апублікаваныя матэрыялы допытаў, ствараецца ўражаньне, што нейкая закансьпіраваная арганізацыя, без фармальнага сяброўства для неўтаймнічаных сымпатыкаў, усё ж існавала.

Хто ж тады быў за кіраўніка яе? Да інтэлігентаў-«адраджэнцаў» Алесь Адамовіч адмоўна ставіўся. Дарэчы, паэма Андрэя Александровіча «Цені на сонцы», у якой паэт б'е па «нацдэмах», была напісана на замову і на фактуры Адамовіча. Старыя «адраджэнцы» разглядаліся Адамовічам як каштоўныя нацыянальныя спэцыялісты. Але ненадзейныя палітыкі.

Тая арганізацыя выглядае пэрадусім змовай нацыянальнае намэнклятуры, што прагнула здабыцьця нацыянальнае незалежнасьці і поўнае міжнароднае суб'ектнасьці сваёй дзяржавай, спачатку хоць бы па мангольскім варыянце. У такім разе, Чарвякоў? Ці наркам асьветы Баліцкі?

А можа ГПУ не памылялася, і гэта быў усё ж Ігнатоўскі зь ягоным багатым вопытам падпольля — спачатку ў шэрагах эсэраў, затым у БПС-Р, і нарэшце ў Беларускай камуністычнай арганізацыі, якую ўласна Ігнатоўскі стварыў — БПС-Р «Маладая Беларусь» — і да канца ўзначальваў. Гэта пры ім БКА вяла ўзброеную партызанскую барацьбу. Праўда, супраць палякаў, зь іншага боку мяжы, што парвала край на Захад і Ўсход. Як жа тады непаразуменьні з Адамовічам? Магчыма, гэта былі праявы ўнутранай барацьбы.

## Змова намэнклятуры

Альтэрнатыўная гісторыя Беларусі ў другой палове XX ст. пісалася пад уплывам дзеячаў палітыкі і культуры, якія апынуліся ў эміграцыі. Ясная справа, што тут не магло абысьціся без асабістых рахункаў і ачарніцельства ідэалягічных супернікаў. Хто ж быў чужы для эмігрантаў-нацдэмаў і эмігрантаў-хадэкаў? Вядома ж, сацыялісты і камуністы. У працах гісторыкаў-эмігрантаў яны былі адсунутыя на пэрыфэрыйны плян.

Па-іншаму скажалі ролю нацкамаў у БССР позьнесавецкага пэрыяду, той самы Барыс Сачанка. Дасьледчыкі выстаўлялі «СВБ» прыдуманай чэкістаў, а «кіраўнікоў» на чале з Усеваладам Ігнатоўскім — нявіннымі ахвярамі. Бо інакш зусім няможна было б нават заікацца пра супраціў савецкай уладзе або пасьлядоўную працу, скіраваную на падрыхтоўку краіны да поўнай незалежнасьці.

З нашага часу дзейнасьць многіх міністраў беларускага савецкага ўраду ўспрымаецца інакш. Нацкамы, відавочна, дамагаліся найперш падтрымкі сельскага насельніцтва — беларускамоўных аўтахтонаў.

Нацкамам нельга адмовіць у патрыятызме і далекасяжнасьці задумаў. Бадай, гэта была адзіная палітычная сіла, якая дамагалася канкрэтных вынікаў у справе будаўніцтва *беларускай Беларусі*. Тое, што яны пасьпелі зрабіць за лічаныя гады 1920-х, сталася нацыянальным рэсурсам, на якім Беларусь «дацягнула» да канца XX ст.



**УСЕВАЛАД ІГНАТОЎСКІ зь яго багатым досьведам падпольнае дзейнасьці й арганізацыі ўзброенай партызанскай барацьбы таксама мог быць кіраўніком «СВБ».**

### «Саюз вызваленьня Беларусі»

75 гадоў таму — 17 лютага 1930 г. — арыштавалі Пятра Ільлючонка. ГПУ пачало справу «Саюзу вызваленьня Беларусі». Усяго па справе «СВБ» вясной—летам 1930 г. арыштавалі 108 дзеячаў навукі і культуры. Увесь цьвет беларускай інтэлігенцыі. Кіраўніцтва «СВБ» (Алесь Адамовіч, Антон Баліцкі, Пётар Ільлючонак і Зьміцер Прышчэпаў) атрымала найбольш — 10 гадоў канцлягераў. З большасьцю, 77 чалавекамі, абышліся дастаткова лібэральна: іх выслалі на пяць гадоў у далёкія раёны СССР. Але неўзабаве ўсіх гэтых людзей даб'юць: у 1937—1941 г. справы былі перагледжаны, некаторых расстралялі, частку паслалі на гібель у канцлягеры. У 1949—1952 г. дабраліся да апошніх, хто заставаўся жывы. Іх проста асудзілі на той падставе, што яны былі… асуджаныя раней.

# «Мілінкевіч фюрэрам ня будзе»

Сойм Партыі БНФ аднагалосна вылучыў Аляксандра Мілінкевіча ў якасьці кандыдата на прэзыдэнцкія выбары.

Лютаўскі сойм Партыі БНФ пачаўся гучна: Вінцук Вячорка склікаў дэлегатаў у галоўную залю ўправы звонам. У параўнаньні са зьездам АГП, што адбыўся ў тым жа памяшканьні тыдзень таму, было менш дэлегатаў, але больш беларускай мовы. Дысцыпліна таксама была на адпаведным узроўні — у залі сядзела дэлегацыя хрысьціянскіх дэмакратаў Нідэрляндаў.

Але ня толькі прысутнасьць замежных гасьцей, што бліскалі лічбавымі фотаапаратамі, зь цікавасьцю ўслухоўваліся ў незразумелую гутарку ды аглядалі сьціплыя інтэр’еры ўправы БНФ, прымушала дэлегатаў трымаць сябе ў руках. Першым пунктам парадку дня было надзвычай сур’ёзнае пытаньне — вылучэньне адзінага кандыдата ад партыі на прэзыдэнцкія выбары, дакладней — на ўдзел у барацьбе за апазыцыйнае лідэрства. «Сойм у нас будзе выключна важны», — прызнаў Вячорка і прэзэнтаваў чалавека, якога партыя вырашыла вылучыць для ўдзелу ў перадвыбарнай гонцы, — Аляксандра Мілінкевіча.

Натуральна, з залі спыталіся, чаму БНФ зноў, як і ў 2001 г., вырашыў падтрымаць чалавека, які хоць і блізкі Фронту па духу, але не зьяўляецца сябрам партыі. Вячорка адказаў, што БНФ павінен спыніць «эфэкт даміно», калі партыі адна за адной пачалі вылучаць на лідэрства сваіх кіраўнікоў. Мілінкевіч удала спалучыць інтарэсы ня толькі партыйцаў, але і людзей, блізкіх да БНФ па поглядах, зможа злучыць «сталічную палітыку» і рэгіёны.

На пытаньне, чаму ён сам не захацеў балятавацца на лідэрства, Вячорка адказаў коратка: «Раблю самаадвод». Прычыну гэтага кіраўнік партыі растлумачыў «ад адваротнага» — ён расказаў не пра тое, чаму сам не ўступіў у перадвыбарную кампанію, а пра тое, чаму падтрымаць трэба менавіта кандыдатуру Мілінкевіча.

На думку лідэра Народнага Фронту, Мілінкевіч мае ўнікальны досьвед дзяржаўнай працы не за саветамі ці Лукашэнкам, а ў першай палове 1990-х, калі ён быў віцэ-мэрам Горадні. Пры гэтым Мілінкевіч сышоў з пасады сам, не паспрабаваў прыстасавацца да новых умоў, створаных у 1994 г. «Мілінкевіч фюрэрам ня будзе, магу гэта гарантаваць», — запэўніў Вячорка.

Валянцін Голубеў, які на правах старога парлямэнцкага ваўка жвава дыскутаваў у кулюарах з дэлегатамі адносна таго, ці варта ўвогуле ўдзельнічаць у гэтых выбарах пры цяперашнім заканадаўстве, задаў сваё «непрыемнае» пытаньне: ці можна ў дадзеных абставінах перамагчы, нават калі й атрымаеш 99% галасоў? «Калі б я ня верыў, што гэта магчыма, я б не вылучаўся», — адказаў Алесь Мілінкевіч (**на фота зьлева**). На яго думку, трэба стварыць настрой, які запаліць людзям вочы й сэрцы. «Але ж вочы запаліць людзям і я магу, — парыраваў Голубеў. — Можа, мы ня так каня запрагаем?» На гэта Мілінкевіч адказаў, што каманда апазыцыі павінна спрацаваць як сьлед, каб нават тады, калі ў кандыдата скрадуць перамогу, людзі выйшлі бараніць свой выбар — адчуўшы, што іх пакрыўдзілі. Зьбягаючы з сойму на заняткі ва ўнівэрсытэт, Голубеў пакінуў запавет аддаць свой голас за Мілінкевіча: «Я заўсёды за ўсіх нашых добрых кандыдатаў галасую, але ўсё-такі ці не гульня ўсё гэта?»


Арцем Лява

Параўнаць Мілінкевіча (ці іншага апазыцыйнага палітыка) з Лукашэнкам, гледзячы ў тэлевізар, магчымасьці ня будзе. Апазыцыйнаму лідэру не давядзецца гутарыць зь мільённай аўдыторыяй. Яму прыйдзецца зьбіраць прыхільнікаў па шматках, значыць — гутарыць. Гэта Мілінкевіч умее. Але й забывацца на эфэктнасьць ня варта. Між тым, на ключавое пытаньне «Ці гатовыя вы ісьці да канца, калі нам намалююць вынікі?» Мілінкевіч адказаў станоўча, але неяк занадта шматслоўна — як на бяду, у гэты момант у трох-чатырох дэлегатаў адначасова зайгралі мабільныя тэлефоны, і ўражаньне ад адказу атрымалася не такім, якое магло б быць ад кароткага «Так!» з кулаком у паветры.

Пакуль Мілінкевіч гаворыць нягучна. І хавае сьціплую ўсьмешку ў вусах. Але зусім іншы Мілінкевіч прачынецца, калі пачынае палемізаваць. Вунь як з Голубевым спрачаўся! «Я мару паўдзельнічаць у дэбатах з Лукашэнкам», — сьмела кажа Мілінкевіч. Ён пэўны, што інтэлектуальную дуэль ён выйграў бы.

**Алесь Кудрыцкі**

# «Шанцы большасьці вылучаных блізкія да нуля»

Працяг са старонкі 3.

Пятро Краўчанка… Няясна, на каго ён можа абаперціся. І, ведаючы ягоны імідж шмат у якіх апазыцыйных колах, я разглядаю яго шанцы як вельмі малыя. Зянон Пазьняк можа быць карысным кандыдатам, які набірае 8—10% з мэтай дыфэрэнцыяцыі электарату, напрыклад, але адзінай фігурай ад дэмакратаў ён быць ня можа. Што да Ўладзімера Мацкевіча… За пэўныя функцыі па арганізацыі кампаніі, яе аналітычную частку ён можа адказваць досыць пасьпяхова. Але ў яго зусім няма сілы, якая б магла яго лабіраваць. Ён ня мае сувязяў ні з партыйнымі структурамі, ні з намэнклятурай. Супярэчлівы імідж у асяродку апазыцыі і прыналежнасьць да пратэстантызму, што будзе эфэктыўна скарыстана ў контрпрапагандзе, робяць яго вельмі малаімаверным прэтэндэнтам.

**«НН»: Вы лічыце, што ў 2006-м годзе зарана абвяшчаць «апошні і вырашальны бой»?**

**АК:** Гэта маё адчуваньне як аналітыка, але я лічу, што правільная пазыцыя для любой сілы — змагацца да апошняга ў любой сытуацыі. Самыя галоўныя выбары — не прэзыдэнцкія ці парлямэнцкія, а любыя наймацнейшыя. Трэба рабіць у межах дадзенай кампаніі ўсё магчымае.

**Гутарыў Арцём Лява**

## «Не пакідайце ж мовы нашай беларускай...»

Зварот ГА «Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны»

Дарагія суайчыньнікі!

21 лютага ўвесь сьвет адзначае Міжнародны дзень роднай мовы. Гэтае сьвята ўсталяванае па рашэньні UNESCO невыпадкова. Мы жывём у эпоху глябалізацыі, калі кожны народ, кожная нацыя імкнецца захаваць сваю адметнасьць, унікальнасьць, а найперш — родную мову. Пакуль жыве мова — жыве народ, зьнікае мова — няма народу, няма незалежнай дзяржавы.

У нашай краіне Дзень роднай мовы — пакуль недзяржаўнае сьвята. Але гэта зьява часовая...

Сябры ТБМ з аптымізмам глядзяць у дзень заўтрашні і сваёй дзейнасьцю набліжаюць той час, калі беларуская мова запануе на нашай зямлі. Кожны чалавек, які штодня гаворыць па-беларуску, спрыяе незалежнасьці нашай краіны, яе росквіту і дабрабыту. Абаронім роднае слова супольна! Да гэтага нас заклікаў Уладзімер Караткевіч: «Унукі Скарыны! Дзе ваш гонар, моц і краса? Ёсьць і ў вас, як у іншых, сьвятыня. Не давайце сьвятыні псам!..»

# Выстава «Два ў адным»



Юлія Дарашкевіч

**Пісьменьнік Анатоль Бутэвіч на адкрыцьці выставы.**

Паводле такога прынцыпу арганізаваная XII выстава-кірмаш І «Кнігі Беларусі», што прайшла ў НВЦ «Белэкспа». На першым паверсе — выстава, на другім — гандляры з кніжнага клюбу, які працуе тут у суботы. Беларускія выдавецтвы гандлявалі пераважна кнігамі на першым паверсе, замежныя «ашчаджалі» літаратуру, каб не застацца з пустымі паліцамі ў першы дзень. Паблукаўшы ля стэндаў выдавецтваў, наведнікі скіроўваліся наверх: выбар расейскіх кніг там быў багацейшы.

Менская выстава супала з XXII Міжнародным кніжным кірмашом у Ерусаліме, дзе былі рэпрэзэнтаваныя 500 выдавецтваў з 30 краін. На нашым — амаль поўнае супадзеньне: 504 удзельнікі з 33 дзяржаў — ЗША, Кітаю, Кыргызстану, Літвы, Расеі, Украіны, Францыі, Швэцыі ды інш.

У параўнаньні з папярэднімі гадамі больш шырока былі прадстаўлены ўкраінскія выдавецтвы: апрача традыцыйнага стэнду ўкраінскай кнігі дзейнічалі некалькі стэндаў кіеўскіх выдавецтваў. На стэндзе «Энцыкляпэдыі Літвы», арганізаваным Інстытутам выданьня энцыкляпэдый, можна было пазнаёміцца зь «Літоўскім Статутам 1529 г.» — акадэмічным выданьнем з камэнтарамі. Дырэктар інстытуту Рымантас Тарэцкіс на прэзэнтацыі кніг «БелЭн» адзначыў высокую якасьць працы беларускіх калег і пазайздросьціў, бо ў Літве да сваёй гістарычнай энцыкляпэдыі яшчэ толькі набліжаюцца. Дарэчы, у нашых суседзяў званьне «пісьменьнік году» атрымаў галоўны рэдактар энцыкляпэдыі.

Новых кніг, выпушчаных непасрэдна перад выставай, беларускія выдавецтвы прывезьлі небагата. Багатай колькасьцю навінак парадавала «Мастацкая літаратура». Да «Кароны Вітаўта Вялікага» ў сэрыі «Сучасны беларускі дэтэктыў» зьявіўся дадатак: Людміла Рублеўская выдала раман «Пярсьцёнак апошняга імпэратара». У адрозьненьне ад «Кароны Вітаўта», выдадзенай у альбомным фармаце, кніга мае больш зручны для чытаньня фармат.

**Адам Воршыч**

## ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

### Памяці айцоў-марыянаў

У пятніцу, 18 лютага, а 17-й у музэі М.Багдановіча (Багдановіча, 7а) адбудзецца прэзэнтацыя раману Ірыны Жарнасек «Будзь воля Твая». У прэзэнтацыі бяруць удзел аўтарка і прадстаўнікі ордэну марыянаў у Беларусі. Прэзэнтацыя кнігі пройдзе таксама:

18 лютага — у менскім архікатэдральным касьцёле Найсьвяцейшай Панны Марыі; 19 лютага — у в.Росіца; 20 лютага — у менскім касьцёле Сьв.Роха, што на Залатой Горцы; 24 лютага — у наваполацкай бібліятэцы імя Маякоўскага; 27 лютага — у менскай парафіі Сьв.Сымона і Алены (Чырвоны касьцёл). Па інфармацыю аб часе правядзеньня прэзэнтацый у парафіях просяць зьвяртацца на тэлефоны ў Менску: 288-12-97 (Залатая Горка), 200-44-15 (Чырвоны касьцёл), 226-62-44 (менская катэдра).

# Мова лідэра

На якой мове мусіць размаўляць палітычны лідэр? З такім пытаньнем **Алесь Кудрыцкі** зьвярнуўся да папулярных палітыкаў.

**Сяргей Калякін:** Моўнае пытаньне не павінна мець галоўнага месца ў ягонай праграме. Ён павінен размаўляць на той мове, на якой яго зразумее і прыме большасьць насельніцтва, ён павінен казаць пра тыя рэчы, якія закранаюць большасьць беларусаў. Найлепш, каб ён валодаў і адной і іншай мовай, а яшчэ лепш — і трэцяй, і чацьвёртай, але не па гэтым прынцыпе сёньня будзе вызначацца лідэр.

**Уладзімер Колас:** Сёньня абавязкова трэба ўлічваць моўную сытуацыю. Лідэр не павінен быць зашораным на моўным пытаньні. Трэба размаўляць зь людзьмі на той мове, якую яны разумеюць, да якой яны прызвычаіліся, і трэба ўлічваць той фактар, што калі з чалавекам размаўляеш не на той мове, на якой ён размаўляе штодзень, рэакцыя можа быць нэгатыўнай. Таму адэкватна ацэньваць сытуацыю і праяўляць неабходную гнуткасьць.

**Аляксандар Дабравольскі:** Гэта будзе чалавек, які абавязкова гаворыць па-беларуску. Таксама пажадана, каб акрамя расейскай, ён валодаў хаця б адной з эўрапейскіх моваў. Але чалавек, які хоча быць палітыкам у Беларусі і не валодае беларускай мовай, прабачце мне, павінен займацца нейкай іншай справай, бо ён не паважае частку беларускага грамадзтва. Агульнае патрабаваньне да чынавенства ў Беларусі павінна быць такім: калі чалавек зьвяртаецца на дзяржаўнай мове, дык чыноўнік павінен адказваць на ёй.

**Анатоль Лябедзька:** Пажадана, каб лідэр быў як мінімум трохмоўным. У пэўнай ступені мы павінны аднавіць тую сытуацыю ў Беларусі, калі выпускнік школы пры кляштары ведаў пяць-шэсьць моваў. Гэта быў бы ідэальны варыянт для нашай краіны, якая ня мае закапанай у глебе табліцы Мендзялеева. Але безумоўна, што свае праграмныя выступы, асноўную частку камунікацыі ён павінен выконваць на беларускай мове. Бо падзеі ж адбываюцца ў Беларусі, а ня ў Новай Зэляндыі.

**Натальля Машэрава:** Ён абавязкова павінен быць дзвюхмоўным — расейская мова — мова міжнародных зносінаў, а дзякуючы беларускай жывыя нашыя нацыянальныя карані. Лідэр павінен размаўляць так, каб уся краіна размаўляла на дзьвюх мовах.

**Уладзімер Нісьцюк:** Для мяне гэта прынцыповае пытаньне. Чалавек, які зьбіраецца стаць народным лідэрам, павінен валодаць беларускай мовай лепш за ўсе астатнія мовы сьвету. Ён павінен, у асноўным, размаўляць на роднай мове. Я вучыўся ў Суворaўскай ваеннай вучэльні, дзе замест беларускай мовы і літаратуры мы вывучалі нямецкую мову. Але калі ў 1995 годзе мяне абралі ў цэнтральны камітэт Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі, я паабяцаў, што праз год буду размаўляць зь людзьмі на беларускай мове. І я сапраўды вывучыў мову, гэта ня так складана, як некаму здаецца. Трэба проста паважаць сябе, сваю культуру.

**Мікола Статкевіч:** Лідэр пераходу да дэмакратыі павінен размаўляць і на беларускай і на расейскай мовах. У палітыцы ёсьць такое правіла — да выбараў трэба імкнуцца зьмяніць сьветапогляд людзей, але калі ўжо пачалася выбарчая кампанія, дык трэба прыстасоўвацца да іх узроўню. Хаця наступная прэзыдэнцкая кампанія можа быць адметнай, бо калі няма выбараў, дык, магчыма, лідэру трэба апэляваць да дэмакратычна настроенай часткі грамадзтва, з тым каб павесьці яе за сабой — не імкнуцца падабацца ўсім, а зьвяртацца да нашых людзей на нашай роднай мове.

# Што рабіць, калі газэту прыносяць запозна ці не прыносяць зусім

У Беларусі пануе дзяржаўная форма ўласнасьці. Мы прызвычаіліся, што ў крамах ды іншых месцах абслугоўваньня часам сутыкаемся з абыякавасьцю да нашых патрэб і праблем. Тыя, хто працуе ў постсавецкай сфэры абслугоўваньня, звычайна не баяцца, што ў іх стане меней кліентаў ці ў прадпрыемства зьменшыцца прыбытак. Іх турбуе, у першую чаргу, каб іх не пакарала начальства, а начальства баіцца шматлікіх органаў кантролю. Спажыўцы, якія ведаюць свае правы, могуць гэта скарыстаць. Але для гэтага нам, спажыўцам, трэба ведаць свае элемэнтарныя правы.

Самае важнае і практычна прымяняльнае ў спажывецкім заканадаўстве — гэта гарантыі абароны правоў спажыўцоў, адной зь якіх зьяўляецца магчымасьць пісаць скаргі, на якія павінны даць своечасовы адказ тыя, у чыю кампэтэнцыю гэта ўваходзіць. Нядаўна быў падпісаны дэкрэт №2 «Аб удасканальваньні працы з насельніцтвам», паводле якога ў гандлі, сфэры бытавога абслугоўваньня і іншых месцах, дзе працуюць з насельніцтвам, кнігі скаргаў будуць заменены на кнігі заўваг і прапаноў адзінага ўзору, якія павінны рэгістравацца ў падатковых органах.

Скажам, калі не прыносяць рэгулярна газэту «Наша Ніва» або прыносяць са спазьненьнем, то ў кнігу можна напісаць такую скаргу:

«Мною была выпісана газэта «Наша Ніва» на першае паўгодзьдзе 2005 году. Нягледзячы на тое, што газэта павінна прыходзіць штотыдзень у пятніцу, неадназова яе прыносілі са спазьненьнем, а некалькі разоў газэта наагул не даходзіла. Прашу зрабіць захады дзеля таго, каб газэта своечасова прыходзіла на мой адрас, а таксама ў пісьмовай форме, у адпаведнасьці з законам «Аб зваротах грамадзян», дасланьць тлумачэньне, чаму газэта не дастаўляецца рэгулярна».

Аўтар гэтага матэрыялу напісаў падобную скаргу і меней чым праз два тыдні атрымаў адказ. Дарэчы, адказ, як і запыт, быў напісаны на беларускай мове. Калі раптам вы ніяк ня можаце дабіцца выдачы кнігі скаргаў (што зьяўляецца парушэньнем правоў спажыўцоў), то можна скарыстацца законам «Аб зваротах грамадзян». Кожны грамадзянін можа напісаць пісьмовую заяву ў арганізацыю, дзе яго правы былі парушаны, а яе кіраўніцтва павінна на працягу 30 дзён даць пісьмовы адказ. Адправіць зварот можна заказным пісьмом з паведамленьнем аб уручэньні або факсам. Напрыклад, аўтар артыкулу некалькі разоў пісаў такія звароты да аднаго з апэратараў сотавай сувязі, калі ягоныя правы парушаліся. У выніку парушэньні выпраўляліся.

Калі вы лічыце, што вашы правы былі сур'ёзна парушаны, можна зьвярнуцца да таварыстваў абароны правоў спажыўцоў. Яны бясплатна займуцца вашай справай ад самага пачатку і аж но да магчымага суду, куды яны могуць зьвяртацца без аплаты пошліны за разгляд справы. Тэлефоны такіх таварыстваў можна высьветліць празь любую даведачную службу ў вашай мясцовасьці.

**ЯК**

Парада: калі Вам не прынесьлі газэты, найперш варта зьвярнуцца да свайго паштальёна. Калі праблема засталася нявырашанай, наступны крок — вашае паштовае аддзяленьне сувязі. Вышэйшая інстанцыя — экспэдыцыя.

Калі ў шапіку няма газэты, тады трэба адрасу зьвяртацца ў экспэдыцыю.

Тэл.: 232-00-41 (гарадзкая), 232-51-51.

# Хай адкажуць!

Просьба Рэдакцыі «Arche».

Кожны грамадзянін можа напісаць пісьмовую заяву ў арганізацыю, дзе яго правы былі парушаны, а яе кіраўніцтва павінна на працягу 30 дзён даць пісьмовы адказ. Адправіць зварот можна заказным пісьмом з паведамленьнем аб уручэньні або факсам. Не адказаць Вам ня маюць права.

Дамовы на распаўсюд часопісу «Arche» разарвалі амаль адначасова ўсе дзяржаўныя распаўсюднікі-манапалісты. Просім усіх, каго хвалюе лёс беларускамоўнага друку, накіраваць у наступныя інстанцыі лісты-запыты аб прычынах разрыву дамоваў і з просьбамі вярнуць часопіс у продаж. Зьмест можа быць прыкладна наступны:

«Я заўсёды купляў часопіс «Arche-Пачатак» у кіёску «Саюздрук» на ... (кнігарні «...») . Кіяскёрка (...) патлумачыла мне, што часопіс больш прадавацца ня будзе. Прашу зрабіць захады дзеля таго, каб часопіс, чытачом якога я зьяўляюся, вярнуўся ў продаж праз кіёскі і краму. Прашу таксама ў пісьмовай форме, у адпаведнасьці з законам «Аб зваротах грамадзян», дасланьць тлумачэньне, чаму часопіс быў выдалены з продажу».

Рэдакцыя спадзяецца, што такія лісты могуць паспрыяць адмене дыскрымінацыйных рашэньняў, бо менавіта так сталася ў выпадку зь некаторымі рэгіянальнымі выданьнямі.

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусі
Пр.Машэрава, 11, 220004, Менск
Т.: 223-92-31, 223-34-35 (ф)
Першай намесьніцы міністра Ананіч Л.С.

УП «Белсаюздрук»
вул.Валадарскага, 16, 220050, Менск
Т.: 227-19-16
Дырэктару Падгайнаму М.В.

УП «Менгарсаюздрук»
вул.Валадарскага, 16, 220050, Менск
Т.: 227-25-42
Намесьніцы дырэктара Івінскай Т.І.

Кнігагандлёвае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Белкніга»
вул.Чыгуначная, 27а, 220089, Менск
Т.: 222-89-45
Генэральнаму дырэктару Пілецкаму В.П.

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні.
З прычыны вялікага аб'ёму пошты, мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам. Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. E-mail: nn@promedia.by. Факс: (017) 284-73-29.



**Да 75-годзьдзя з дня нараджэньня Ўладзіміра Караткевіча**

**Беларускі ПЭН-цэнтар**

пры падтрымцы Беларускай асацыяцыі журналістаў, газэтаў «Белорусская деловая газета», «Биржа информации», «Барысаўскія навіны», «Витебский курьер», «Вечерний Брест», «Вольны час», «Газета Слонімская», «Інтэкс-press», «Народная воля», «Наша Ніва», «Наша слова», «Новы час», «Рэгіянальная газета», «Региональные ведомости», «Телевид-инфо», часопісаў «Arche», «Студэнцкая думка», «Дзеяслоў», інтэрнэт-выданьняў «Літара.net», «Кнігі.com», «Дзед Талаш», «Пагоня.promedia.by»

**аб'яўляе**

конкурс для маладых літаратараў:

Да ўдзелу запрашаюцца творцы ад 16 да 26 гадоў (на момант абвяшчэньня конкурсу). Ляўрэаты будуць запрошаныя на літаратурны сэмінар і майстар-клясы ў Менск, перад імі выступяць знаныя пісьменьнікі, выкладчыкі ВНУ, вучоныя, сьпевакі, адбудзецца зацікаўленая гутарка аб творах маладых аўтараў і літаратурнай дзейнасьці.

**На конкурс прымаюцца** літаратурныя творы (вершы, апавяданьні, эсэ, п'есы, сцэнары, дзёньнікі і г.д.; асабліва вітаюцца дэтэктыўна-прыгодніцкія жанры).

Да разгляду будуць прымацца творы, дасланыя (паводле даты на паштовым штэмпэлі або даты адпраўкі электроннага ліста) не пазьней за 10 красавіка 2005 г. Падвядзеньне вынікаў першага туру адбудзецца 25 красавіка. Літаратурны сэмінар пройдзе ў Менску ў першай палове траўня.

**Журы конкурсу:** Васіль Сёмуха (старшыня), Пятро Васючэнка, Ганна Кісьліцына, Андрэй Хадановіч, Барыс Пятровіч, Сяргей Смятрычэнка.
Творы дасылайце на **адрас**: e-mail: maladylitaratar@tut.by

**Паштовы адрас:** 220050, а/с 218, Менск, РГА «Беларускі ПЭН-цэнтар».
Даведкі праз электронную пошту ці тэлефон (017) 284-73-29.

# Апэльсін

## Да гісторыі аднаго знаку

Працэс пераўтварэньня нейкага матэрыяльнага аб'екту ў знак адбываецца найчасьцей непрадказальна. Што прымушае людзей бачыць у знаках абстрактныя культурныя і грамадзкія сэнсы, толькі час ад часу прыгадваючы прыродныя смакі? Пакуль можам адзначыць толькі некалькі чыньнікаў — зьбег акалічнасьцяў, экзатычнасьць ды адначасова адносная вядомасьць. Апэльсін культывавалі ў Кітаі яшчэ чатыры тысячы гадоў таму, перш чым у XI—XII ст. нашай эры гэтую шматгняздовую ягаду пачалі вырошчваць у краінах Леванту (на паўднёва-ўсходнім узьбярэжжы Міжземнага мора). Ужо потым праз італьянскіх купцоў і ўдзельнікаў крыжовых паходаў апэльсін патрапіў у Эўропу. Але ў нашай частцы сьвету першапачаткова быў вядомы кіслы гатунак апэльсіну, пакуль у XVI ст. не адбылося новае адкрыцьцё гэтай культуры — партугальскія купцы, зноў жа з Кітаю, завезьлі салодкі гатунак апэльсіну. Такім чынам, посьпех быў забясьпечаны. А ў мове навукі (на лаціне) апэльсін так і застаўся Citrus sinensis — кітайскім цытрусам.



ІНІЦЫЯТАРАМ АРАНЖАВАЙ РЭВАЛЮЦЫІ ў ВКЛ была каралева Бона. Менавіта яна ўвяла моду на апэльсіны пры віленскім двары.

КАЛЯЖ АРЦЕМА ЛЯВЫ

Праўдападобна, што ў Вялікае Княства Літоўскае апэльсін трапіў яшчэ ў XV ст. і гэта якраз быў памаранчык, тое, што ў нямецкай мове «Pomeranze» — горкі гатунак апэльсіну. Этымалёгія нямецкага слова празрыстая — ад італьянскіх «pomo» (яблыкі) і «arancia» (апэльсін). Апошняе азначэньне запазычана ўжо з пэрсідзкай. У беларускіх жа дыялектах зафіксаваныя словы «памаранча», «памаранец».

Але рэальна мода на цытрусавыя пры кракаўскім і віленскім дварах была ўведзеная каралевай Бонай, пасьля чаго апэльсін сталі завозіць у Польшчу і ВКЛ у заўважнай колькасьці, што ўвогуле адпавядала тэндэнцыі італьянізацыі кулінарных густаў заможнай шляхты. Адным з важных местаў у пасрэдніцкім гандлі апэльсінамі ўжо ў XVI ст. стаў Львоў — на наземным шляху з поўдня. Усё ж першапачаткова гэта быў рэдкі плод — па пары штук апэльсін падавалі на стол Жыгімонта Старога, і тое з нагоды ўрачыстасьцяў. Апроч дарагоўлі (у тры разы даражэй за лімоны), пашырэньне новай культуры стрымлівала тое, што апэльсін у нязначнай ступені мог служыць дадаткам да іншых страў — яго належала зьядаць асобна.

Пашырэньню апэльсіна ў Рэчы Паспалітай спрыялі таксама езуіты, праз што знаходзілі сабе новых прыхільнікаў і дабрадзеяў Ордэну. Адпаведна названы факт выкарыстоўваўся ў антыезуіцкай прапагандзе, бо «гішпанскія яблыкі» шкодзілі «моцы і прастаце звычаяў». Сармацкія маралісты таксама падтрымалі заклік да самаабмежаваньня, таму што спартанскім шляхціцам няма патрэбы ва ўсіх гэтых запазычаных «цытрынах, апэльсінах, каштанах, паштэтах, тартах, salsecjoni» (вось, значыць, адкуль сальцісоны!). І хоць апэльсін стаў прадметам амаль ідэалягічнай дыскусіі, у ваенным лягеры Стэфана Баторыя каралю гатавалі жэле з апэльсінаў. У панэгірыку Гераніму Хадкевічу (Вільня, 1606) пішацца, што герою падносіцца «ня золата… але… цудоўны апэльсін». Як годны падарунак апэльсін прыгадваецца ў эпісталярыях — гэты плод дасылае сваёй жонцы славуты пераможца швэдаў пад Кірхгольмам у 1605 годзе Ян Караль Хадкевіч, ксёндз Казімер Сарнэцкі шле яго з Варшавы каралю Станіславу Радзівілу, Зьбігнеў Морштын з Каралеўца дасылае яго ў Слуцак Казімеру Клакоцкаму. У барочнай культуры Рэчы Паспалітай апэльсін стаў сымбалем эратычнай гульні — у карэспандэнцыі будучага караля Яна Сабескага з Марысенькай «les oranges» ці «pomarańcze» азначае каханьне.

У барочнай культуры Рэчы Паспалітай апэльсін стаў сымбалем эратычнай гульні — у карэспандэнцыі будучага караля Яна Сабескага з Марысенькай «les oranges» ці «pomarańcze» азначае каханьне.

Імпарт апэльсінаў знайшоў адлюстраваньне ў «Мытных інструкцыях ВКЛ» XVII ст. — з сотні апэльсінаў плацілася па 7,5 гроша. У 1733 годзе за тое ж самае спаганялася мыта ўжо 15 грошаў — інфляцыя. Між тым, пашырыўся асартымэнт вырабаў з апэльсіна — у XVII—XVIII ст. атрымалі распаўсюджаньне апэльсінавыя гарэлка і ліквор, у XVIII ст. у заможных дамах пачалі рабіць аранжад (прахаладжальны напой з соку апэльсіна ды цукру). Настойкі з апэльсіна і іншых цытрусавых сталі неад'емнай часткаю хатніх аптэчак. Таму як асобны тавар пачалі завозіць ня толькі сьвежыя плады, але таксама сок і абсмажаныя скуркі апэльсіна. У XVIII ст. ужываньне апэльсінаў пашырылася і сярод мяшчанства. Імкненьне вырошчваць апэльсіны ў нашых геаграфічных варунках прывяло да ўзьнікненьня ў XVII ст. аранжарэй — асобага тыпу выцягнутых зашклёных памяшканьняў са штучным кліматам (у Беларусі — палаца-паркавы комплекс у Альбе, Ружанскі палац, Дукорскі палац ды інш.). У эпоху Асьветніцтва аранжарэі насамрэч выконвалі разнастайныя функцыі. На лета дрэвы зь іх выносіліся ў сад ці расстаўляліся пад сьценамі, а ў аранжарэях наладжваліся балі ды таварысцкія пачосткі. У выніку, гэтыя архітэктурныя формы набылі дадатковую прэстыжнасьць.

Літаратура XIX ст. (найперш «Літоўская гаспадыня») падае цэлы шэраг рэцэптаў па выкарыстаньні апэльсінаў, што сьведчыць пра ўстойлівую ўжо да гэтага часу традыцыю. Вядомы даўнія рэцэпты гатаваньня сочыва, апэльсінавых лупін, сушаных у цукры, апэльсінавых лупін у мёдзе, карамэлек апэльсінавых, мармэляду з апэльсінавых лупін, «цэдры» (зацукранага сыропу) з апэльсінавых лупін; мельшпайсаў (салодкіх пірагоў) з апэльсінавымі лупінамі; халоднага рысу з апэльсінамі; апэльсінаўкі (гарэлкі) і апэльсінавага ліквору.

У савецкія часы апэльсін быў адным зь нешматлікіх даступных для шырокага спажыўца субтрапічных пладоў. Партыйныя бонзы па-свойму клапаціліся пра дабрабыт люду, і пад увагу была ўзята важная якасьць апэльсіна — падчас захоўваньня колькасьць вітаміну С у ім не памяншаецца. Вынікам стала распрацоўка цэлай дзяржаўнай праграмы, увогуле пасьпяховай, па культывацыі апэльсінаў на прыдатных для гэтага ў СССР тэрыторыях — на Чарнаморскім узьбярэжжы Каўказу, у Краснадарскім краі, у Азэрбайджане.

Але падобна, што апэльсін здрадзіў плянавай гаспадарцы. Дзіўным чынам у Польшчы 1980-х гадоў апэльсін і яго колер стаў сымбалем студэнцкага руху гэпэнінгаў «Pomarańczowa Alternatywa». Хоць «Аранжавую альтэрнатыву» натхнілі ідэі заходняй контркультуры, гэта была зьява польская. Вясёлыя гэпэнінгі апэлявалі да рэчаіснасьці сацыялістычнай Польшчы, а іх тэмаю рабіліся афіцыйныя палітычныя падзеі, дзяржаўныя сьвяты і ўрачыстасьці. Абсурднасьць палітычнай сыстэмы даводзілася праз пароды. Практычна ўсе акцыі «Альтэрнатывы» заканчваліся затрыманьнем іх удзельнікаў міліцыяй на падставе парушэньня грамадзкага парадку.

«Памаранчавая рэвалюцыя» 2004—2005 гадоў ва Ўкраіне адбылася на нашых вачах. Акцэнты на сымболіку робіцца абодвума палітычнымі лягерамі. Апроч аранжавага колеру, у цэнтры ўвагі і рэальная садавіна — газэты прыносяць паведамленьні пра тое, як дзясяткі кіляграмаў апэльсінаў нядобразычлівцы ўжо былой апазыцыі выкідвалі пад колы цяжкіх аўтамабіляў.

У падобных выпадках праз сымбаль, што мае ўласную каштоўнасьць, адбываецца самастойнае выяўленьне рэальнасьці, у сэнсе і значнасьці якой ён удзельнічае.

**Алег Дзярновіч**



**АЛЕГ ДЗЯРНОВІЧ** — гісторык, выдавец. Нарадзіўся ў 1966 г. у Менску. Супрацоўнік Інстытуту гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Рэдактар часопісаў «Athenaeum», «Шуфляда».

### Смажаніна з гусі, або Качкі па-італьянску

1 маладая гусь ці качка, 100 г маргарыну, 1 яйка, 2 дробкі мускату, 1 сталовая лыжка нарэзанай пятрушкі, 2 апэльсіны і 1/2 лыжкі крухмалу, 1,5 сталовай лыжкі масла, вантробы, тлушч, соль.

Падрыхтаваную птушку нацерці сольлю звонку і зь сярэдзіны. Узьбіць да пены маргарын з дробкай солі і невялікай колькасьцю цёртай апэльсінавай цэдры, дабавіць яйка, размочаны і адціснуты белы хлеб, дробна нарэзаныя вантробы, мускат і пятрушку.

Гэтай масай начыніць птушку, шыю завярнуць усярэдзіну. Нятлустую птушку абсмажыць у нагрэтым маргарыне, потым стушыць, падліваючы гатаваную вадкасьць (ваду ці булён). У канцы тушэньня паліць сокам апэльсіна. Гатовую смажаніну паліць соўсам, згатаваным з соку, які ўтварыўся, і разьмяшанага ў халоднай вадзе крухмалу. Упрыгожыць зьлёгку падсмажанымі ў гарачым масьле долькамі апэльсіна.

# Закаханых разганялі бульдозэрамі

На Дзень Сьвятога Валянціна ў Менску «Малады фронт» раздаваў стужкі колераў эўрапейскага сьцяга ды паліў бэнгальскія агеньчыкі. Пэрформанс «Сэрца Эўропы» на Кастрычніцкай плошчы быў разагнаны міліцыяй.

Спачатку ўдзень быў традыцыйны абход замежных (эўрапейскіх ды ЗША) пасольстваў зь віншаваньнямі ды прызнаньнямі ў любові да Эўропы. Канфлікт узьнік толькі ў француcкім пасольстве, дзе ахова не хацела прапускаць маладафронтаўцаў. Скончылася ўсё ціхамірна: з францускім паслом сустрэліся, і сп.Шмялеўскі нават сам выйшаў прывесьці сяброў «МФ». Не прынялі маладафронтаўцаў у польскім пасольстве: туды было немагчыма датэлефанавацца.

На вечаровай акцыі сабралося некалькі дзясяткаў маладых людзей. Адзіным з «дарослых» палітыкаў на плошчы апынуўся Мікола Статкевіч, хоць запрашэньне атрымалі ўсе кандыдаты ў прэзыдэнты. На рукавах і грудзях мільгацелі валошкавыя стужкі з жоўтымі зоркамі, на шыях — шалікі такога ж колеру.

Ахвотна разьбіралі стужкі тыя, хто прыйшоў пакатацца на вулічным катку, зладжаным на цэнтральнай плошчы сталіцы. Неўзабаве ў руках зьявіліся бэнгальскія агеньчыкі, з прынесенага магнітафону загучаў гімн ЭЗ. Пацалункі былі палымянымі, прамовы й віншаваньні — кароткімі. Міліцыянты папярэдзілі Статкевіча, што ён будзе несьці адказнасьць за мітынг. Праўда, папярэджаньнем усё й абмежавалася. Праз паўгадзіны пасьля пачатку амонаўцы і сьнегаачышчальныя машыны выціснулі моладзь з плошчы. Затрымліваць нікога не затрымалі. Толькі намесьніка сустаршыні «МФ» Сержука Лісічонка па дарозе дадому спрабаваў арыштаваць невядомы ў цывільным, але хлопец здолеў адчапіцца.

**Аркадзь Шанскі**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## ХРОНІКА

У міжраённае ўпраўленьне КДБ 28 студзеня на гутарку быў выкліканы рэдактар недзяржаўнай крычаўскай газэты «Вольны горад», актывіст АГП **Сяргей Няроўны**.

Сябра Нацыянальнага камітэту АГП **Аляксандра Цынкевіча** 1 лютага выклікалі ў пракуратуру Цэнтральнага раёну Менску для тлумачэньняў наконт кастрычніцкай выбарчай кампаніі. Ягоную7 рэгістрацыю акруговая камісія скасавала за чатыры дні да выбараў, палічыўшы, што ва ўлётках кандыдата ёсьць абразы гонару й годнасьці прэзыдэнта краіны. Цынкевіч даваць паказаньні адмовіўся.

Гарадзенскаму актывісту Партыі БНФ **Сяргею Мальчыку** забаронены выезд за мяжу: ён не заплаціў штрафу ў 70 базавых велічынь за ўдзел ва ўшанаваньні памяці братоў Каліноўскіх у Сьвіслачы. Пасяджэньне суду, дзе прымалася рашэньне пра абмежаваньне Мальчыка ў правах, праводзілася безь ягонага ўдзелу.

Крычаўская гарадзкая **філія БСДП (НГ)** атрымала 2 лютага другое папярэджаньне ад управы юстыцыі Магілёўскага аблвыканкаму з прычыны адсутнасьці юрыдычнага адрасу.

2 лютага ў Калінкавічах пачаўся судовы працэс супраць актывісткі АГП **Людмілы Краснасельскай**: падатковая інспэкцыя спрабуе спагнаць зь яе каля 3 млн падаходнага падатку. Падаткавікі падлічылі ейныя камунальныя плацяжы, дадалі зьвесткі пра куплю валюты за розныя гады й налічылі даходы за 2003 г. у памеры 15 млн руб.

Адміністрацыйная камісія Кастрычніцкага раёну Віцебску 2 лютага разглядала справу актывісткі АГП **Алены Залескай**, затрыманай 17 студзеня за распаўсюд газэты «Время». Залескай загадана зьявіцца на пасяджэньне праз два тыдні.

2 лютага ў Гомелі адміністрацыйная камісія аштрафавала **Канстанціна Лесунова і Вольгу Сузько**, затрыманых 23 студзеня па абвінавачаньні ў распаўсюдзе ўлётак незарэгістраванай арганізацыі «Лімон», — кожнага на 2 б.в. (48 тыс. руб.). Маладыя людзі сьцьвярджаюць, што не распаўсюджвалі ўлётак, а самі ўзялі іх пачытаць.

3 лютага жодзінскаму актывісту АГП **Аляксандру Валчаніну** паведамілі, што ў дачыненьні да яго заведзена распачата крымінальная справа за паклёп на спэцслужбы. Падставай стаў зварот Валчаніна з просьбай даць палітычны прытулак ва Ўкраіне.

Карэспандэнту баранавіцкай недзяржаўнай газэты «Intex-press» **Аляксандру Чарненку** 3 лютага не дазволілі прысутнічаць падчас прыёму грамадзян першым намесьнікам міністра ўнутраных спраў Аляксандрам Шчурком і нават размаўляць з наведнікамі, што прыйшлі на прыём.

У Гомелі 3 лютага пачаўся судовы працэс над актывісткай Свабоднага прафсаюзу прадпрымальнікаў, сябрай АГП **Тацянай Марчанкай**: рэгіянальны цэнтар занятасьці насельніцтва спрабуе спагнаць зь яе 1 201 326 руб. як незаконна атрыманую ў 1996—1999 гадах дапамогу па беспрацоўі. Марчанка была заснавальніцай ТАА «Крыніца», хаця, як адзначае, заробку там не атрымлівала.

Журналіста інтэрнэт-газэты «Пагоня» **Андрэя Пачобута** 4 лютага выклікалі на допыт у Ленінскі РАУС Горадні з нагоды артыкулаў пра канфлікт у Саюзе палякаў Беларусі.

Гомельскі офіс **БХК** 4 лютага быў узяты ў аблогу міліцыянтамі. Толькі празь дзьве гадзіны аблогу зьнялі. У той самы дзень міліцыянты спрабавалі ўварвацца ў гомельскі офіс грамадзянскай ініцыятывы **«Партнэрства»**.

4 лютага рэдакцыі гарадзенскай недзяржаўнай газэты **«Биржа информации»** кіраўніцтва Скідальскай філіі Гарадзенскага раённага спажывецкага таварыства адмовіла ў працягу дамовы на распаўсюд.

У кватэру **Сяргея Антончыка** 5 лютага ўварваліся амонаўцы і асобы ў цывільным: гаспадара кватэры, ягоную жонку Тамару й каля 20 грамадзкіх актывістаў затрымалі. На Антончыка склалі пратакол за… арганізацыю несанкцыяванага сходу.

7 лютага ў Бабруйску падчас распаўсюду ўлётак у падтрымку М.Марыніча затрыманы актывісты незарэгістраванай арганізацыі «Зубр» **Андрэй Бяляеў, Стас Комар і Віталь Юрчанка** — на іх склалі пратаколы паводле арт.143 КоАП (антысанітарыя).

8 лютага адміністрацыя Гарадзенскага заводу аўтаагрэгатаў звольніла без узгадненьня старшыню нізавой арганізацыі прафсаюзу РЭП **Паўла Саўкіна**.

У Віцебску 5 лютага актывіст КХП-БНФ **Уладзімер Плешчанка** пасьля спробы затрыманьня на несанкцыяваным пікеце трапіў у кардыялягічны шпіталь. Другога ўдзельніка пікету **Барыса Хамайду** завезьлі ў Чыгуначны райаддзел міліцыі, але неўзабаве адпусьцілі.

**ГА «Бялыніцкае краязнаўчае таварыства»** атрымала 8 лютага пісьмовае папярэджаньне ад управы юстыцыі Магілеўскага аблвыканкаму: да 1 сакавіка аб'яднаньне павінна вырашыць пытаньне зь юрыдычным адрасам.

З тапанімічнай камісіі Аршанскага гарвыканкаму 8 лютага выключылі **Юрася Копціка** (ГА «БАЖ») і **Алеся Шутава** (МГА «Зьвяз»), сябрамі камісіі яны былі з 1995 г.

Лідэра ГА «Пэрспэктыва» **Анатоля Шумчанку** 9 лютага затрымалі ў офісе, зьвінавацiўшы ў ДТЗ. 10 лютага яго асудзілі на 10 сутак за арганізацыю несанкцыяванага шэсьця: 5—9 лютага на рынку ў Ждановічах Шумчанка раздаваў незарэгістраваны бюлетэнь «Камэрсант» з заклікам далучацца да папераджальнага страйку 10 лютага.

9 лютага ў адміністрацыйную камісію Чыгуначнага раёну Гомелю быў выкліканы дэпутат Рагачоўскага райсавету сябар АГП **Зьміцер Шкулькоў**. 4 лютага міліцыянты спынілі таксоўку, у якой ён ехаў, правялі перагрус, знайшлі ўлёткі незарэгістраванай грамадзкай ініцыятывы «Партнэрства» і склалі пратакол пра незаконны выраб друкаванай прадукцыі. На пасяджэньні камісіі дэпутату паведамілі, што пратакол быў накіраваны ў Рагачоў, дзе ён жыве.

Пашпартна-візавая служба Шклова 9 лютага адмовілася афармляць дазвол на выезд за мяжу рэдактару недзяржаўнай газэты «Шклоўскія навіны» **Аляксандру Шчарбаку**. Падатковая інспэкцыя спаганяе грошы за 1996 г., калі Шчарбак працаваў выканаўчым дырэктарам у прыватнай фірме: фірма засталася вінаватая бюджэту 8 тыс. руб.

9 лютага Мінюст падаў у Вярхоўны Суд пазоў пра ліквідацыю ГА **«Беларускі жаночы рух «Адраджэньне Айчыны»**: арганізацыю вінавацяць у парушэньні правілаў вядзеньня справаводзтва, а таксама ў неадпаведнасьці зьместу некаторых дакумэнтаў рэчаіснасьці.

У Гарадзенскім абласным гаспадарчым судзе 9 лютага пачаўся разгляд справы пра высяленьне гарадзкой і абласной радаў **ГА БНФ «Адраджэньне»**. Пасяджэньне прыпынена да 21 лютага: суд зьбірае дадатковыя матэрыялы па справе.

У пракуратуру 10 лютага выклікалі лідэра лепельскіх прадпрымальнікаў, сябра ГА «Пэрспэктыва» **Алега Тычыну** для даваньня тлумачэньняў.

Актывістаў «Зубра» **Андрэя Баранава** і **Паўла Юхневіча** 10 лютага затрымалі каля прахадной Менскага трактарнага заводу падчас распаўсюджваньня «Свободной газеты», прысьвечанай беларускім палітзьняволеным.

10 лютага ў Барысаве міліцыянты дапыталі сябра Савету грамадзянскай ініцыятывы «Свабодная Беларусь» **Зьмітра Бародку** ў яго дома ў зьвязку зь ягоным удзелам у пасьлярэфэрэндумных вулічных акцыях у Менску.

Судовая калегія па грамадзянскіх справах Менгарсуду 10 лютага пакінула ў сіле прысуд, згодна зь якім газэта **«Прессбол»** мае выплаціць штраф за абразу гонару й годнасьці міністра фінансаў, старшыні Беларускай асацыяцыі гімнастыкі Мікалаю Корбуту — 30 млн руб. з выдаўца **УП «Прессбол Плюс»** і 10 млн руб. з галоўнага рэдактара **Ўладзімера Бéражкова**.

Вярхоўны Суд 11 лютага адхіліў скаргу **РГА «НІСЭПД»** на афіцыйнае папярэджаньне Мінюсту за адмову падаць анкету ліпеньскага сацыялягічнага апытаньня 2004 г.: паводле закону, Мінюст мае правяраць усе дакумэнты, якія тычацца статутнай дзейнасьці арганізацыі. НІСЭПД сьцьвярджае, што зьнішчае ўсе анкеты апытаных пасьля падвядзеньня вынікаў.

Цэнтравыбаркам 11 лютага адхіліў скаргу назіральніка ад ПБНФ **Вадзіма Саранчукова** на дзеяньні акруговай камісіі, якая зьмяніла межы акругі №52 у Горадні.

Актывісту АГП юрысконсульту **Леаніду Судаленку** кіраўніцтва гомельскага АТ «Локан» 11 лютага прапанавала звольніцца, хаця прэтэнзій да ягонай працы няма.

У Сьветлагорску 11 лютага затрыманы намесьнік кіраўніка РГА «Пэрспэктыва» **Анатоль Зьмітровіч**. У яго канфіскавалі 75 ксэракопій старонкі нумару газэты «Народная воля» з артыкуламі пра страйкі прадпрымальнікаў.

Каардынатар незалежнага назіраньня за парлямэнцкімі выбарамі й рэфэрэндумам **Мікалай Астрэйка** атрымаў штраф у 20 б.в. за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі.

Юрыдычнай службе прафсаюзу РЭП 11 лютага ўдалося аднавіць на працы на ААТ «Рытм» у Рэчыцы актывістаў прафсаюзу **Ірыну Паплаўную** і **Сьвятлану Ўсхопаву**, звольненых з парушэньнем заканадаўства.

Ва ўласнай кватэры ў Горадні 14 лютага міліцыянты затрымалі генэрала **Валер'я Фралова**, завезьлі ў пастарунак, а потым у суд Ленінскага раёну, дзе яго асудзілі на 300 б.в. (7 млн 200 тыс.), абвінавацiўшы ў арганізацыі гарадзенскага мітынгу прадпрымальнікаў 10 лютага.

**АШ**

# Мапа


АРЦЁМ ЛЯВА

Дранікі — гэта такія катлеты, пры гатаваньні якіх не было забіта ніводнай жывёлы.
Бо не змаглі дагнаць кароў.

Кібуц наш Гіват-Ольга, кібуц беспэрспэкт… безрэспэкт… беспраспэкт… бесшкарпэкт… бязпосьпех… тыўны, іншымі словамі, няма тут чаго рабіць маладому пакаленьню.

«У кібуцы працаваць ніхто ня хоча. На апэльсінавых плянтацыях завіхаюцца адно залатазубыя румыны і смуглявыя філіпінцы. Каму ж прыемна выйсьці з кібуцнага басэйну ды зьветрыць пах конскіх фэкаліяў? Тут дзіч і пустка. Вось усе і паўцякалі ў Тэль-Авіў. Там цывілізацыя. Эўропа, мала не. Так, пан Пілсудзкі меў рацыю».

Гэта была цытата. Цытата належыць старому Хаіму, уладальніку кібуцнага шапіку, бізнэсоўцу. Яму 96 год. Хаім прадае цыгарэты і шакаляды. Ён пачынаў свой гандаль вельмі даўно ў Польшчы, але прыйшоў вусаты пан з Захаду і ня даў Хаіму і іншым габрэям спакойна прадаваць шакаляды. Менавіта тады Хаім пераехаў у кібуц. Пан Пілсудзкі — яго герой.

«Таварыш Ленін такога паскудзтва ніколі б не дазволіў! Зьленаваліся дазваньня. Усе ўцякаюць у горад. А трэба ж на зямлі працаваць. Бардак тут у нас у Ізраілі! Такую краіну развальваюць! Пралетарыі ўсіх краін, будзьце ж вы людзьмі!»

Гэта таксама цытата. Яна належыць старой Цыпі, заснавальніцы нашага кібуцу, камуністцы. Ёй 101 год. Жыцьцяпіс Цыпі просты — яна будавала кібуцы. Сьпярша ў Расеі. Потым, калі на замену таварышу Леніну прыйшоў нейкі ўсходні таварыш з вусамі і ня даў дабудаваць Цыпі праўдзівы камунізм, тая паехала засноўваць кібуцы ў Ізраілі. Яе герой — таварыш Ленін. Старая Цыпі кажа многа цытатаў. Таму дазволю сябе падаць яшчэ адну:

«Калі б нашай краінай кіравалі былыя дырэктары кібуцаў, а не былыя генэралы, у ёй было б значна больш парадку».

Амін. Амін, Цыпі.

Хаім ды Цыпі непрыязна ставяцца адно да аднаго, таму бавяць большасьць часу разам. Непрыязнасьць вынікае з сутыкненьня надта ўжо адрозных мэнтальнасьцяў. Цыля з Расеі, з Касьцюковічаў. А стары Хаім з Пружанаў (Польшча). Ёсьць такія эўрапейскія краіны ў Эўропе. Хаім і Цыпі шмат распавядаюць мне пра Эўропу, пра гарады свайго дзяцінства. Вось Пружаны — вялікі мэтраполіс, значна большы і прыгажэйшы за Варшаву. А ў Касьцюковічы таварыш Ленін нават хацеў перанесьці сталіцу зь Петраграду. Але замест таго каб паехаць зь Петраграду ў Касьцюковічы напрасткі, таварыш Ленін наказаў машыністу: «Мы паедзем іншым пуцём, каб абдурыць царскіх жандараў», — і той завёз таварыша Леніна ў расейскую глыбінку, у Маскву. Ужо з Масквы да Касьцюковічаў не хапіла вугольля на топку, таму вырашана было застацца і пакінуць сталіцу ў Маскве.

Як да мяне, дык я люблю свой кібуц. І Хаіма з Цыпі я люблю. І нідзе я ўцякаць не зьбіраюся. Тут такая прырода, да таго ж падключыцца да Інтэрнэту можна цяпер і ў нашым кібуцы. Нашто ж тады ў горад? Аднак я заўважаю са смуткам, што моладзь усё адно не застаецца ў кібуцах. Чаму такая беспрасьвеціца? Як жа ж было б добра, каб нашыя хлопцы і дзяўчаты не зьяжджалі ў Тэль-Авіў ці куды далей! О, як бы я хацеў нарадзіцца ў такім краі, дзе б моладзь зусім-зусім не жадала — як яна жадае ў нас — сабе такога жыцьця, у якім адным і адзіным напамінам пра той край стане графа «месца нараджэньня» ў іншаземным пашпарце. Ды дзе яна, тая абяцаная зямля?..

Усё пачалося як заўжды, з дранікаў. А вы мае блізкаўсходнія! Вы ня ведаеце, што такое дранікі? Дранікі — гэта такія катлеты, пры гатаваньні якіх не было забіта ніводнай жывёлы.

«Бо не змаглі дагнаць кароў», — кажа Хаім.

Цытата зь легенды пра вынаходзтва дранікаў, распаведзеная Хаімам П.:

«Аднойчы пан Пілсудзкі, перабываючы ў Пружанах, захацеў есьці і гжэчна так зароў: «Катлетаў хачу, хачу катлетаў!» Яго счулі каровы і ўсе паўцякалі ў варшаўскі заапарк. Бегам марш, абы ня ў фарш, як той казаў. Зірнуў пан Пілсудзкі сюды. Зірнуў туды. Няма кароў. А катлет хочацца. І мусіў ён тады перакруціць на фарш тое, што было пад на рукой. А пад рукой, як і пад нагой, у Пружанах толькі бульба. Навінка спадабалася. Яе пан Пілсудзкі назваў дранікамі, бо, доўга і дарэмна клікаючы кароў, падраў сабе ўсё горла».

У іх там, у Эўропе, дранікі — гэта такая нацыянальная трава, ледзь не нацыянальная справа.

У сэнсе «страва».

Дык вось, у той дзень паміж Хаімам і Цыпі ўсчалася адвечная спрэчка-дзяльба: чые дранікі — касьцюковіцкія або пружанскія — найлепшыя ў сьвеце. Яна заўжды пачынаецца гэтак — цытую:

«Памятаю, недзе ў 1920 годзе таварыш Ленін прыехаў з Масквы ў Касьцюковічы па-простаму, па-рабочаму ў лімузіне і кажа мне: «Цыпіле! Ну й дзе вашы найлепшыя ў сьвеце дранікі? Мой страўнік ад Смаленску пяе «Інтэрнацыянал»!»

«Пан Пілсудзкі такіх недарэчных выкрунтасаў з самаходамі ніколі не рабіў. Ён цудоўна ведаў, дзе знаходзяцца найлепшыя ў сьвеце дранікі, і таму проста загадваў паслаць спэцрэйсам аэраплян з Варшавы ў Пружаны. Прывязуць яму адтуль элегантную валізу дранікаў і пададуць на вытанчанай парцаляне. Ён той дранік далікатна ў рот, выкшталцона перацісьне зубкамі і скажа: «Пекна!»

Таварыш Ленін такога паскудзтва ніколі б не дазволіў! Зьленаваліся дазваньня. Усе ўцякаюць у горад. А трэба ж на зямлі працаваць. Бардак тут у нас у Ізраілі! Такую краіну развальваюць! Пралетарыі ўсіх краін, будзьце ж вы людзьмі!

На гэтым этапе цытаты рэзка сканчаюцца, бо Хаім і Цыпі бяруцца ўзагрудкі ды пераходзяць на падвышаныя тоны аднаго з дыялектаў мовы ідыш, зразумелага толькі вузкаму колу навукоўцаў з Тэль-Авіву.

Цытата з заключэньня тэль-авіўскай філялягічнай навуковай групы па вывучэньні гаворак мовы ідыш:

«У маўленьні жыхароў кібуцу Гіват-Ольга Хаіма П. і Цыпі Р., адзіных носьбітаў своеасаблівага дыялекту мовы ідыш у гэтым паселішчы, зусім ня выяўлена ідыскіх элементаў, за выняткам аднаго — уласна слова «ідыш». Найчасьцей ужываныя, як на думку самых носьбітаў, ідыскія словы «bulba», «tabe», «chaho», «hren», «durac» і «kabtyzdohhalera» не зьяўляюцца спрадвечна ідыскімі, а зьяўляюцца халера іх веды чыімі спрадвечнымі словамі, бо нічога не зразумела».

Але гэтым разам я не хацеў пераходу на падвышаныя тоны. Бо ўсё магло скончыцца валідансам і амбудолам.

У сэнсе «валідолам і амбулансам».

— Баба Цыпі, дзед Хаім! Ня сварцеся! Давайце я пагляджу ў Інтэрнэце, дзе найлепшыя ў сьвеце дранікі. Інтэрнэт ведае ўсё.

Набіраю ў акенцы пашукавіка словы «Касьцюковічы» і «Пружаны». Заходжу ў першы-лепшы сайт. Гэта палітычная мапа невядомай мне краіны. Напісана лацінскімі літарамі: «Republic of Belarus», — і год пазначаны — 2004. Брама вялікае таямніцы прыадчынілася перада мной.

— Які ў нас цяпер год? — усхваляваная пытаюся ў Хаіма.

— 5765 ад стварэньня сьвету, дваццаць першы дзень месяца Хешван, хутка Ханука, — адказвае Хаім, адпускаючы Цыпіну сукенку і дастаючы валідол з кішэні.

Я хоць пішу непісьменна, але лічу пры дапамозе кампутарнай праграмы-калькулятара выдатна. 5765 мінус 2004… Знакам тым, мапе 3761 год. І тут мяне як перуном смальнула. Бо гісторыю я ведаю нават лепш за матэматыку. 3761 год таму — гэта ж час Алімпійскай імпэрыі і Рымскіх гульняў! Пакрысе, зь лягічных выснаваньняў, пачала вымалёўвацца ўся праўда пра гэтую загадкавую краіну. Сумневаў не было: усё выразна сьведчыла, што на мапе была выяўлена магутная дзяржава часоў Траянскай вайны, дзе такія мэтраполісы, як Касьцюковічы і Пружаны, былі адносна маленькімі гарадамі, а трохі меншыя за іх Варшава і Масква дык зусім не пазначаліся дзеля сваёй нязначнасьці. На мапе паміж Касьцюковічамі і Пружанамі зусім няма кардонаў, а ёсьць дагэтуль мне невядомы горад Менск. Стуль вынікае, што паміж Расеяй ды Польшчай не было аніякіх межаў. То бок тады гэта была адзіная краіна. Знакам тым, людзі не марнаваліся на войны, высьвятляючы, чые дранікі лепшыя. А ўсе высілкі ішлі на абарону супольнай дзяржавы. Такім чынам, левыя вусатыя дзядзькі з Захаду і з Усходу абміналі такую фартэцыю-краіну за мілі. Таму ніхто не перашкаджаў там, амаль чатыры тысячы год назад, квітнець калектыўнай гаспадарцы і гандлю шакалядамі. Моладзь не ўцякала у горад, дый у горадзе хапала сваіх, бо Менск, што пазначаны на мапе у колькі разоў большым за Пружаны і Касьцюковічы, быў калясальнай сталіцаю цывілізацыі.

Так, спадарства, на мапе перада мною ва ўсёй сваёй велічы расьсьцілалася найбуйнейшая дранікава-кібуцная імпэрыя ў гісторыі чалавецтва, Рэспубліка Беларусь. Страчаны рай чалавецтва і мая гістарычная радзіма. Куточак шчасьця, хай сабе даўным-даўно мінулы, але адгэтуль ня менш мілы майму сэрцу. О, як бы я хацеў хоць на хвілінку апынуцца ў той краіне-мроі!

…Шчасьлівы, засынаю. Сьніцца антычны Менск, зь яго калёнамі і вісячымі садамі. Зь яго Александрыйскай бібліятэкай ды шматлікімі арэнамі для галоўнай алімпійскай гульні. Па цэнтральным праспэкце ў бялюткіх туніках ідуць таварыш Ленін і пан Пілсудзкі. «Чаго табе, дурань? Бульбы? Хрэн табе! Каб ты здох, халера!» — прыязна кажа таварыш Ленін пану Пілсудзкаму палацінску.

**Павал Касьцюкевіч**

# Што чытае Гішпанія

У Гішпаніі — вялікі юбілей. Сёлета спаўняецца роўна 400 год з часу выданьня першай часткі «Дон Кіхота» — кнігі фундамэнтальнай для гішпанскай літаратуры і гішпанскасьці ўвогуле. Як выглядае літаратурная панарама Сэрвантэсавай айчыны праз некалькі стагодзьдзяў? Што пішуць Сэрвантэсавы наступнікі?

Яшчэ некалькі год таму ў кнігарнях цэнтральнаэўрапейскіх краінаў марна было шукаць навін з-за Пірэнэяў — апроч клясыкаў лацінаамэрыканскага буму цікаўны чытач не знайшоў бы практычна нічога. Раптам зь нябыту выплыў Артура Пэрэз-Рэвэртэ і пераканаў выдаўцоў у тым, што гішпанскія аўтары могуць прадавацца. Потым зьявіўся Мануэль Васкес Мантальбан, а за ім — Эдуарда Мэндоза, Джозэ Карляс Самоза, Кука Канальс і яшчэ шэраг іншых.

Адно што наша знаёмства з гішпанскай літаратурай застаецца досыць аднамерным. Усё гэта бэстцы, прынамсі, гудсэлеры, на добрым літаратурным узроўні, часам нават «канвэерныя шэдэўры», але заўсёды лёгкія, займальныя і прыемныя. А што зь літаратурай больш амбітнай? Ці трапляюцца пасярод гэтага багацьця сапраўды выдатныя творы — як некалі «Дон Кіхот» сярод папулярных рамансаў пра бледных рыцараў?

Апошняе дзесяцігодзьдзе мінулага стагодзьдзя ў Гішпаніі — пэрыяд браджэньня па нецікавых 1980-х, калі літаратура ачухвалася пасьля падзеньня рэжыму Франка і па-ранейшаму адчувала лацінаамэрыканскае дамінаваньне.

— Ёсьць мноства новых празьвішчаў, — гаворыць Фэрнанда Вальс Гузман, вядомы гішпанскі крытык. — А таксама два пісьменьнікі, якія апошнімі сваімі кнігамі прылічылі сябе да канону, — Хаўер Марыяс і Энрыка Віля-Матас.

## Жыцьцё — фікцыя, фікцыя — жыцьцё

Непрыхільнікі сьцьвярджаюць, што Марыяс — нахабнік, у якога ня ўсе клёпкі ў парадку і які лічыць сябе найлепшым гішпанскім пісьменьнікам. Але справа ў тым, што, відаць, ён і ёсьць найлепшы. На польскай мове выдадзены чатыры яго кнігі — «Сэрца такое белае», «Заўтра, у час бітвы, думай пра мяне», «Усе душы» і «Сэнтымэнтальны мужчына», — і, нягледзячы на гэта, пісьменьнік застаецца ў нас малавядомы.

Сюжэты Марыяса маюць сэнсацыйны характар і моцны пачатак. «Сэрца такое белае» пачынаецца сцэнай самазабойства маладой дзяўчыны, а апошнія старонкі трымаюць у напружаньні, нібы найлепшы дэтэктыў. Адно што Марыяс снуе свае раманы нязвыклым спосабам, і ня меншае значэньне за сюжэт мае тое, як ён апавядаецца.

Апошні на цяперашні момант раман Марыяса — гэта «Твой твар заўтра», які мае выйсьці ў двух тамах. Яго галоўнага героя, ад імя якога вядзецца аповед, наймаюць брытанскія спэцслужбы, якія даручаюць яму назіраньне за пэўнымі асобамі. На аповед «у цяперашнім часе» накладаецца другі плян — лёс бацькі галоўнага героя падчас гішпанскай грамадзянскай вайны. Марыяс зьвяртаецца да сваіх улюбёных тэм — цяжару мінулага, здрады і цёмных закуткаў душы.

Адзін з крытыкаў сказаў, што Марыясаў апавядальнік ня толькі ведае пра ўсё, але і ведае пра ўсё ўсімі магчымымі спосабамі. Несамавітае нагрувашчваньне дэталяў і сутыкненьне процілеглых варыянтаў разьвіцьця падзей надаюць гэтай прозе спэцыфічны рытм. Гэта кнігі, што тонуць у залеве слоў, якія, аднак, бяруць у палон сваёй прыгажосьцю. Марыяс сьцьвярджае, што ніколі ня правіць аднойчы напісанага тэксту. Калі выявіцца, што ён сам сабе ў нечым пярэчыць, то пад канец раману піша нешта іншае, чым у пачатку, — што зробіш, у жыцьці таксама нельга выправіць падзей, якія здарыліся.

У аснове сваёй падобная, але на практыцы зусім іншая проза Энрыка Віля-Матаса. Барсэлёнец (нар. 1948) таксама ня супраць пагулянца з умоўнасьцямі. Пра сябе любіць апавядаць анэкдоты, якія жыва нагадваюць фрагмэнты ягоных кніг. Праца пісьменьніка зацікавіла яго, калі ён глядзеў фільм з удзелам Марчэла Мастраяні. «Я хацеў быць вольны і не хадзіць штораніцы ў кантору. Апроч таго, мне спадабалася кіношная жонка Мастраяні, Жанна Маро», — тлумачыць ён. Кар’еру сваю Віля-Матас распачаў гучным раманам «Асьвечаны забойца», які нарадзіўся з праблемы, абмяркоўванай раней Мігелем дэ Унамуна: як напісаць кнігу, чытаньне якой прыводзіла б да сьмерці. Потым зьявілася «Кароткая гісторыя пераноснай літаратуры». Гэты раман пераканаў крытыкаў у выключным таленце аўтара.

З часу свайго дэбюту ў 1977 г. Віля-Матас публікуецца рэгулярна — апошнімі былі рэчы «Парыж ніколі не канчаецца» (2003) ды «Бартлбі і кампанія», які закранае справу нечаканых зьнікненьняў вядомых пісьменьнікаў, — і нітрохі ня траціць тэмпу. Радрыга Фрэсан, пісьменьнік з Буэнас-Айрэсу, называе яго «самым аргентынскім з гішпанцаў», параўноўваючы яго творы з халоднымі мэтафызычнымі забаўкамі Борхеса.


WWW.HEIM2.TU-CLAUSTHOL.DE

**Міляс стварыў жанр пад назвай «articuento», ці «артапавяданьне» — нешта сярэдняе паміж газэтным артыкулам і літаратурным творам.**

## Прасьцей, карацей і своечасовей

А маладыя галасы? Ды хоць бы Бэлен Гопэгуі. Яе дэбютная кніжка — «Маштаб мапаў» (1993). Найноўшыя — «Рэчаіснасьць» і «Заваёва паветра». Гопэгуі вяртаецца да прастаты ў аповедзе, адмаўляецца ад фармалістычнай экстравагантнасьці на карысьць прадуманай, але немудрагелістай канструкцыі. У яе інтымнай прозе відаць неахвота да вялікіх слоў, літаратарскіх плётак і беспадстаўнай віртуознасьці стылю.

У сваю чаргу, выдадзены ў 2003 г. раман Хаўера Салінаса «Кніга Э.» можна чытаць як адказ на палітычныя зьмены ў Эўрапейскім Зьвязе. Э. выпраўляецца ў падарожжа па кантынэнце, каб даведацца, хто ягоны бацька. Яму ўяўляюцца розныя варыянты яго нацыянальнай тоеснасьці — у залежнасьці ад таго, у якой краіне яму давялося нарадзіцца. Яны сплятаюцца ў аповед пра эўрапейскую тоеснасьць.



**У інтымнай прозе Бэлен Гопэгуі відаць неахвота да вялікіх слоў, літаратарскіх плётак і беспадстаўнай віртуознасьці стылю.**

Гішпанцы высока цэняць малыя формы, попытам карыстаюцца там зборнікі апавяданьняў і анталёгіі. Большасьць паважаных літаратараў спрабуюць сябе ў кароткіх тэкстах, а прэса ахвотна публікуе якасныя апавяданьні. Посьпех напаткаў у 2003 г. зборнік Пабла Андрэса Эскапы «Эліпсіс хранікёра». Тэксты Эскапы, напісаныя павольнай і стылёва дасканалай гішпанскай мовай, засяроджваюцца на стварэньні паэтычнага клімату. Выходзіць парадаксальная рэч — апавяданьні, якія не дазваляюць сябе чытаць хутка.

На экспэрымэнты з кароткімі формамі наважыўся і вэтэран Хуан Хасэ Міляс, злучаючы псыхалягічную пранікнёнасьць з цалкам несамавітымі матывамі. Міляс стварыў жанр пад назвай «articuento», ці «артапавяданьне» — нешта сярэдняе паміж газэтным артыкулам і літаратурным творам. Гэтыя тэксты час ад часу зьяўляюцца ў пэрыядычным друку, а цяпер яшчэ і сабраны і кнігу. Міляс падымае ў іх сапраўды выключна публіцыстычныя тэмы, але робіць гэта праз сюжэт — фантастычны, іранічны, насычаны гумарам.

## Па-за мэтраполіяй

Адасабленьне гішпанскай літаратуры ад ібэраамэрыканскай — апэрацыя досыць штучная, паколькі выдавецкі кровазварот ахоплівае абодва бакі акіяну. Вялікія выдавецкія групы, што ахопліваюць увесь гішпанамоўны сьвет, маюць свае цэнтры ў Мадрыдзе ці Барсэлёне. Большасьць літаратурных узнагарод зь вядомай іх багацьцем Гішпаніі трапляе да пісьменьнікаў з абодвух бакоў Атлянтыкі. Леташнюю прэмію Геральд, якою з часу яе заснаваньня адзначаюць «будучых клясыкаў», атрымаў Алян Паўльс, аргентынец, за «Мінуўшчыну» — даволі вялікі раман пра нешчасьлівае каханьне. Адным з найгучнейшых раманаў апошніх месяцаў аказаўся твор іншага аргентынца, згадванага ўжо Радрыга Фрэсана, — «Двары Кенсынгтону». Гэта варыяцыя на тэму біяграфіі Дж.М.Бары, аўтара «Пітэра Пэна». Фрэсан уплятае ў яе лёс выдуманага аўтара звышпапулярнага кніжнага сэрыялу для дзяцей (выразная алюзія на фэномэн «Гары Потэра»), выхаванага ў часы росквіту гіпі, і стварае на гэтай аснове трактат аб нежаданьні сталець. Таксама меў папулярнасьць у Гішпаніі памерлы год таму чыліец Рабэрта Баляна. Тытул найвыдатнейшага з «новых» лацінаамэрыканскіх пісьменьнікаў прынесьлі яму творы «Дзікія дэтэктывы» і «Далёкая зорка».

## Іншыя мовы Гішпаніі

Гішпанія, аднак, гэта ня толькі гішпанская мова. Іншыя мовы Ібэрыйскага паўвострава маюць абмежаваны абсяг пашырэньня, але па-каталёнску, па-галісійску і па-баску актыўна пішуць, і літаратуры на гэтых мовах, прынамсі, не зьяўляюцца маргінальнымі. Прызнаньне ва ўсёй краіне здабылі, напрыклад, Бэрнарда Атчэга, баск паводле паходжаньня, аўтар зборніка «Obabakoak», ці галісіец Мануэль Рывас, аўтар «Алоўка сталяра».

Асабліва прывілеяваную пазыцыю займае Каталёнія — з прычыны багатых традыцый і вялікіх выдавецкіх магутнасьцяў, сканцэнтраваных у Барсэлёне. Апошнім часам найцікавейшая сытуацыя ў паэзіі. Анталёгія «Нястрымныя» прадстаўляе новае пакаленьне паэтаў, у тым ліку Сэбастыя Альзамора, Мэльсіён Матэў і Гектара Бафіла. Іх не аб’ядноўваюць ніякія маніфэсты, але анталёгія выклікала багата пазалітаратурных дыскусій». Апрача гэтага — новы раман Гаўмэ Кабрэ «Галасы з Памана». Кабрэ, майстар формы, гэтым разам апісаў вынікі грамадзянскай вайны ў невялікай мясцовасьці, дзе раны загойваюцца павольна.



**Аргентынец Алян Паўлс атрымаў прэмію «Геральд», якою адзначаюць «будучых клясыкаў».**

У знакамітым шостым разьдзеле першага тому «Дон Кіхота» парафіяльны сьвятар і цырульнік чыняць строгі суд над кнігамі зь бібліятэкі звар’яцелага шляхціца зь Ляманчу. Частку яны зьнішчаюць, пакінуўшы толькі тыя, якія ім падаліся каштоўнымі. Сёньня такі суд заняў бы значна больш часу, а ацалела б куды болей…

**СП; паводле gazeta.pl**


WWW.JAVIERMARIAS.ES

**Непрыхільнікі сьцьвярджаюць, што Марыяс — нахабнік, у якога ня ўсе клёпкі ў парадку і які лічыць сябе найлепшым гішпанскім пісьменьнікам. Але справа ў тым, што, відаць, ён і ёсьць найлепшы.**


WWW.EL MUNDO.ES

**Мануэль Рывас, які піша па-галісійску, здабыў прызнаньне ва ўсёй краіне.**

## УСЕВАЛАД ГАРАЧКА


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**УСЕВАЛАД ГАРАЧКА** (нар. 1968) — інжынэр-тэхноляг, працуе на заводзе «Інтэграл» у Менску. Жыве ў Фаніпалі. Паэт. Аўтар «НН» і «Arche». Выдаў зборнік паэзіі «Пралетарскія песьні» (2004).

### Маналёг Атлянта

Я Атлянт,
І таму —
Я трымаю.
І ня важна што:
Дах,
Нейкую справу,
Малітву...
Паверце,
Нялёгка трымаць.
І няпраўда,
Што я — каменны.
Гэта скажа вам
Кожны з Атлянтаў.
І паверце,
Кожнай вясною,
Пераклаўшы цяжар
на іншых,
Мне хочацца сесьці
На лаўку
Ля дому,
У чаканьні,
Што ля муру
Распусьціцца ружавы куст.
Але ведаю:
Распусьцяцца ружы
І стане так добра...
І абрынецца...
Не, ня дах —
Мой сусьвет,
Маё неба.
Таму — я трымаю.
І покуль трымаю —
Я жывы,
Я каменны,
Я вечны...

### Ноч

Таемнае сьвятло,
Нібы душа
Яго ўвесь дзень
зьбірала,
А цяпер —
Раздорвае.
Нібы яна,
Душа, —
Агонь,
А я —
Людзкое кола.
Тварам да сьвятла,
Сьпіной — да цемры.
Вечна,
Нерухома
Сядзець бы так

У гэтай паўнаце,
Дзе твар да твару,
Перад сьвятлом,
Што льецца цераз край.

* * *

Збудаваў я помнік
Ледзяным героям,
Што загінулі ад ільду.

Прыйшла вясна
І ўсё растапіла.

Але памяць мая аб іх —
Не растане.

* * *

Покуль
Я б'юся з вамі
Кардоннымі дзідамі
І плястыкавымі мячамі.

Покуль
Мы гаворым
Папяровымі словамі
Пра сумленьне і гонар.

Нехта перамагае мяне,
Некага — я змагаю...

А потым мы возьмем у рукі
Сапраўдныя дзіды.

Станунь цьвёрдымі вашы
словы
І вартымі веры.

Потым...
Але ад пачатку
У кішэні маёй —
Пісталет.

* * *

*З нагоды фатаздымку адной паэткі*

Дзяўчына
Зь яблыкам спакусы
На плячы
Нагадвае
Штурхальніцу ядра.
Каго яна жадае
«Замачыць»,
Нявіннаю ахвяраю
Абраць?

А можа, гэта
Памідор гнілы
Ці яйка тухлае
Яна ўзяла,
Каб так адкрыта вось,
Не з-пад палы,
Шпурнуць у ворага
Замест кала?
..............
«Клубніцы»,
Памідор
Або віно
Для вершу добрыя,
Але, на жаль, — ня кроў.
А хто пісаў крывёй —
Ужо даўно
Пасе ў глухім Гарошкаве
Кароў.

## АЛЯКСАНДАР ВОРВУЛЬ



# Слоўнік скептыка

**Опэра** — месца, дзе герой, атрымаўшы ўдар кінжалам у сьпіну, пачынае сьпяваць замест таго, каб памерці.

**Ордэн** — знак заслугі перад тым, хто ўзнагароджвае ардэнамі.

**Пагадненьне джэнтэльмэнскае** — пагадненьне, на якое не пагодзіцца ніводзін джэнтэльмэн.

**Падарожжа вясельнае** — час ад «я хачу» да «ты павінен».

**Падзеньне** — адзіны сродак вылечыць боязь вышыні.

**Падлетак** — дзіця, якому мець сваіх не рэкамэндуецца.

**Падлюка** — чалавек, якому дазволена больш за іншых — з тае прычыны, што ён горшы за іншых.

**Падручнік па гісторыі** — падручнік па філязофіі ў прыкладах.

**Падручнік па філязофіі** — інструкцыя па эксплюатацыі чалавека.

**Пазыка** — сродак паляпшэньня памяці пазыкадаўцы.

**Паліцыя** — інструмэнт прымірэньня грамадзкіх свабод з ладам у грамадзтве.

**Паліцыя конная** — гэта калі адна галава добра, а дзьве — лепей.

**Паляваньне** — забойства з асалодай.

**Памылка** — рашэньне, вернае пры іншых умовах.

**Паніка** — падзеі, якія адбываюцца пасьля першага заклiку да спакою.

**Папрашайніцтва** — гэта калі просяць хлеба, каб даесьці соль.

**Парада** — тое, што мы просім, калі ўжо ведаем адказ, але ён нам не падабаецца.

**Парасон** — рэч, якую трэба ўзяць з сабой, каб не пайшоў дождж.

**Парашут** — тавар, на якасьць якога яшчэ не было скаргаў.

**Патрыёт** — чалавек, які любіць сваю краіну, але яе грамадзян цярпець ня можа.

**Пацук** — істота, якая ведае больш за капітана.

**Перакур** — магчымасьць забіць у сабе каня.

**Перамены** — адзіная сталая рэч у жыцьці.

**Піва безалькагольнае** — першы крок да гумавай жанчыны.

**Пісьменны** — чалавек, які можа жаніцца па аб'яве.

**Піцьцё за здароўе** — вайна за мір.

**Плётка** — кошт гасьцінасьці.

**Плюс** — закрэсьлены мінус.

**Плягіят** — гэта калі ў іншага нешта бяруць і пагаршаюць.

**Подласьць** — атрыманьне выгод ад уладнай подласьці.

**Помнік** — напамін пра памылкі мінулага.

**Посьпех** — гэта калі ты разумееш, што хочаш рабіць, і знаходзіш таго, хто гатовы плаціць за гэта.

**Праграміст** — чалавек, які зганяе муху з манітора курсорам.

**Прагрэс** — замена адных катастроф іншымі.

**Прафэсіянал** — чалавек, да якога прыходзіш з адной праблемай, а сыходзіш зь іншай.

**Праца цікавая** — праца, на якой бачыш цікавыя сны.

**Працаваць** — гэта значыць адначасова зарабляць грошы і ня мець часу іх патраціць.

**Працаўладкаваньне** — працэс, які тым прасьцейшы, чым цяжэйшая праца.

**Профі** — дылетант, які ведае, дзе зробіць памылку.

**Прусія** — армія, у якой была свая краіна.

**Прыгажосьць** — тое, што ўратуе сьвет ад інтэлекту.

**Прыгажуня** — дзяўчына, якая зьяўляецца на пляжы ў апошні дзень адпачынку.

**Прыцэл** — пункт гледжаньня снайпэра на пэўныя бакі чалавечага жыцьця.

**Псэўданім** — слова, часам неабходнае для таго, каб назваць чалавека яго сапраўдным імем.

**Псыхіятар** — чалавек, які ніколі ня будзе беспрацоўным.

**Псыхіятрыя** — адзіны від бізнэсу, у якім кліент заўжды ня мае рацыі.

**Публіцыстыка** — пераўтварэньне жыцьцёвага досьведу ў грошы.

**Пульт дыстанцыйнага кіраваньня** — сымбаль сямейнай улады.

**Пунктуальнасьць** — уменьне ўгадаць, на колькі спозьніцца іншы.

**Пыха** — непераадольнае імкненьне аблаяць ворагаў пры жыцьці і сяброў — пасьля сьмерці.

**Пэсыміст** — чалавек, які з двух зол выбірае абодва.

**Пэнсіянэр** — чалавек, якому плацяць толькі за тое, каб ён не працаваў.

**П'яны** — чалавек, які выпіў меней, чым хацеў, але болей, чым мог.

**Пячонка** — злосны разбуральнік алькаголю.

## АДАМ ГЛЁБУС



# Сучасьнікі

### 2004. Кася і ружы

Хадзіў на канцэрт Касі. Пяць гадоў ёй забаранялі выступаць. Бог ты мой, як яны — прарасейскія халуі — баяцца беларускага слова, нашай песьні. Яны не дазваляюць нам выступаць па радыё і тэлебачаньні, яны публічна зьневажаюць нашу культуру і мову. А мы? Чакаем, сьцяўшыся да болю, чакаем, бо верым у сваю праўду. Які безнадзейна доўгі час для чалавека — пяць гадоў! Больш за пяць гадоў чакаў Алесь Разанаў выхаду свайго паэтычнага зборніка «Шлях-360», больш за пяць гадоў мой тата чакаў сваёй кнігі найлепшых апавяданьняў «Дзікі голуб» — яны дачакаліся, яны перамаглі. Дачакалася й Кася і зрабіла выдатны канцэрт. Побач са мною сядзела маладзенькая пара закаханых.

Калі Кася засьпявала «Божа, забяры маё жыцьцё…», дзяўчынка расплакалася. Дзяўчына так расхваляваласа, што выйшла з залі. Во як! А напрыканцы канцэрту яна вярнулася зь вялізным букетам і падаравала Касі вільготныя ад кастрычніцкага дажджу цёмна-вішнёвыя ружы.

Я не сэнтымэнтальны, але жорсткі чалавек, таму ня скончу апісаньне канцэрту ружамі…

Найбольшае музычнае задавальненьне я атрымаў ад гітары Славы Кораня, а візуальна мяне зачаравалі голыя рукі віялянчэлісткі Юлі. Калі нейкаму скульптару заманецца зрабіць гіпатэтычную рэканструкцыю рук Вэнэры Мілоскай, лепшай мадэлі за Юлю Глушыцкую ён ня знойдзе.

*Напісана 01.11.2004, 14:51.*

### 2004. Талочка і травы забыцьця

Мама абуралася, што я, прыбіраючы тату магілу, павыкідаў усе вазачкі са шклянкамі ды штучныя кветкі. Мяне раздражняюць танныя ўпрыгожаньні на кацах. На могілках не павінна быць вэртыкалі, усё вэртыкальнае толькі замінае травам забыцьця — тым пяшчотным лекавым травам, што гояць нашы раны, нанесеныя сьмерцю роднага чалавека… Мой запіс перарваў тэлефонны званок: «Здароў, Валодзя. Вячаслаў Уладзімеравіч ляжыць на той алеі, дзе стаяць помнікі дзецям, што загінулі на Нямізе?» «Так, там цёмна-зялёная пліта, побач з помнікам маёру, якога забілі бандыты…» — «А, во, бачу… Даруй за клопат!» Голас Міхася Талочкі праваліўся ў гудкі.

*Напісана 02.11.2004, 14:34.*

## НОВЫЯ КНІГІ

**Іпатава В. Задарожжа: Лірыка, вершаваныя эцюды, прысьвячэньні.** — Менск, 2004. — 100 с. 299 ас.

У новую кнігу паэткі ўвайшлі вершы апошніх гадоў.

**Раманава Л. Птушкі і рыбы** / Рэд. М.Скобла, малюнкі А.Пішкіна, фота А.Сыса. — Менск: Беларускі кнігазбор, 2004. — 92 с. 1000 ас.

**Скараход В. Асавінская Слабодка: Краязнаўчы нарыс.** — Менск: Хурсік, 2004. — 88 с., іл. 200 ас. — (Ведаць свой край Беларусь).

Невялічкі краязнаўчы нарыс пра вёсачку Асавінская Слабодка і радавод аўтара.

**Скараход В. Ліст землякам: Вершы. Да 80-годзьдзя аўтара.** Распаўсюд на правах рукапісу. — 2003. — 22 с.

**У танцы ліхтароў=Im Lichtertanz: Сучасная нямецкая паэзія: Пераклад зь нямецкай** / Прадмова і ўклад. В.Іпатавай. — Менск: Тэхналёгія, 2004. — 167 с. 1000 ас.

Пераклады сучаснай паэзіі, выкананыя Ю.Барысевічам, Л.Баршчэўскім, А.Бахарэвічам, В.Гапеевай, С.Законьнікавым, В.Іпатавай, Н.Мацяш, Л.Рублеўскай, Л.Сільновай.

**Януш А. Лёк: Аповесьць** / Пер. зь ням. В.Сёмухі, рэд. Х.Лялько, мал. аўтара. — Менск: Про Хрысто, 2004. — 60 с. 500 ас.

**Сяргей Лескець**

# Перамог мацнейшы

Вайра Віке-Фрэйбэрга ня носіцца па хакейнай пляцоўцы з клюшкай, а гуляюць латышы ня горш за беларусаў.



RUS.DELFI.LV

Айчынныя заўзятары хакею могуць спаць спакойна да кваліфікацыі ванкуверскай алімпіяды-2010. Блакітная мара-фікс ня зьдзейсьнілася: на Турынскую алімпіяду ад нашай групы едзе зборная Латвіі.

У матчы з Латвіяй беларусам было дастаткова згуляць унічыю. Больш за тое, за пяць хвілін да заканчэньня сустрэчы нашыя вялі — 4:2, але потым умудрыліся «стаць» і прапусьціць запар тры шайбы. Вынік — 4:5.

Галоўны трэнэр зборнай Беларусі Міхаіл Захараў на пасьляматчавай прэс-канфэрэнцыі назваў галоўных «творцаў» паразы: судзьдзі («судейства было па-за межамі ўсякіх нормаў этыкі») і варатар новакузнецкага «Мэталюргу» Сяргей Шабанаў. «Наш галкіпэр прапусьціў усё, што мог. Калі і адбіваў шайбу, то проста перад сабой, каб праціўнікі маглі дабіць у вароты. І гэты галкіпэр гуляе ў расейскай супэрлізе, якая цяпер лічыцца найлепшай у сьвеце».

От парадокс. Дзяржава касьцьмі кладзецца, каб разьвіваць народную гульню хакей, будуе лядовыя пляцоўкі ўжо ў райцэнтрах, а нашы брамнікі гуляюць у нейкіх расейскіх лігах!

Гальчанюк і Шумідуб ужо не гуляюць, 36-гадовы Леанід Фацікаў таксама, відаць, завершыць выступленьні. Мезін і Шабанаў маюць па трыццаць адным году, першы якраз і абараняў вароты беларускай зборнай у мінулай рыскай кваліфікацыі ў 1995 г. І перад гэтым турнірам выявілася, што замяніць Мезіна і Шабанава няма кім. 19-гадовы Гарачэўскіх зь менскага «Юнацтва» для топ-турніраў яшчэ «зялёны».

У Латвіі з галкіпэрамі па-іншаму. Завяршыў кар'еру легендарны брамнік Артур Ірбэ — прыйшоў на яго месца вэтэран Сяргей Навумаў. Ён у сваю чаргу схібіў у нядзельным матчы — яго годна замяніў у варотах 25-гадовы легіянэр чэскае «Дуклы» Эдгарс Масальскіс.

Па астатніх парамэтрах зборная Латвіі роўная беларусам. І там і там зьмена пакаленьняў, і першыя і другія маюць двух энхаэлаўцаў — Озалініш, Скрастыныш, Салей, Кальцоў. Чатыры латышы выступаюць у расейскай супэрлізе (беларусаў — дзевяць), зь дзясятак латыскіх хакеістаў гуляе ў эўрапейскіх сярэдненькіх клюбах. Зь беларусаў у Эўропе застаўся толькі Сяргей Стась, астатнія перайшлі ці ў расейскі другі дывізіён, ці атабарыліся ў чэмпіянаце Беларусі. Так што сілы роўныя. А вынікі розныя.

Вось і дзіву даешся, як гэта латвійскі хакей дабіўся посьпехаў безь дзяржаўнай увагі. І Вайра Віке-Фрэйбэрга ня носіцца па хакейнай пляцоўцы з клюшкай, а сядзіць сабе вышэйшае кіраўніцтва ціхенька на трыбунах зь мінімумам аховы.

Беларусы пакуль спыніліся на задворках эўрапейскага хакею. Можа, бракуе патрыятызму? Папрымалі ж Салей, Калюжны, Цыплакоў, Грабоўскі, Панкоў расейскае грамадзянства, матывуючы тым, што цяжка праходзіць у асноўны склад. Латышам, якія ў супэрлізе ў такіх жа ўмовах, гэтая думка ў галаву не прыйшла.

І пралёт міма кваліфікацыі — ужо не трывожны званочак, а звон, што трэба нешта ў нашай хакейнай гаспадарцы мяняць. Захараў па прылёце з Рыгі заявіў пра адстаўку. Яшчэ два месяцы таму ён меў чатыры пасады — трэнэр менскага «Юнацтва», нацыянальнай і моладзевай зборнай і зборнай прэзыдэнта. Посьпехі толькі з апошняй і «Юнацтвам».

Хто яго заменіць на пасту коўча нацыянальнай зборнай? Варывончык, Лебедзеў, Сафонаў? Крыкуноў з маскоўскага «Дынама»? Але ці захоча незалежны Крыкуноў вяртацца ў Беларусь, калі ён ужо неяк заяўляў, што вяртацца ў Беларусь з такімі мэтадамі кіраваньня хакеем не зьбіраецца.

У чым беларусы перайгралі суседзяў, дык гэта ў хамстве. Колькі бруду было выліта «аматарамі» спорту на Латвію на сайтах — sportsnews.lv ды сайце «Прессбола»: эсэсаўцы, тармазы прыбалтыйскія, лабусы. Вось яна — «патрыятычная сьвядомасьць», што выхоўваецца дзяржаўнымі СМІ.

Пры канцы красавіка ў Аўстрыі стартуе чэмпіянат сьвету ў найвышэйшым дывізіёне. Супернікі Беларусі па падгрупе — Расея, Славакія, Аўстрыя. Задача — заняць трэцяе месца, якое дазволіць нам застацца ў эліце. Інакш давядзецца цешыцца Калядным турнірамі ды абсурднымі заметкамі ў прэсе накшталт: «У Аляксандра Лукашэнкі з гульнявым інтэлектам усё ў парадку, ён не эгаіст. Валодаючы лідэрскай харызмай, для яго перадусім на пляцоўцы галоўнае — камандныя інтарэсы. Таму А.Лукашэнка — камандны ігрок, а менавіта такія і зьбіраюць на трыбуны заўзятараў» (Васільеў Р. Хакей як сьвята: небюджэтны і для народу // Спортивная панорама. 2005. 11 студзеня).

**Алег Раявец**

## З форуму на сайце pressball.by пасьля матчу Беларусь—Латвія

**Bulba_beer**. 1. Зборная Беларусі проста ў разы мацнейшая за Латвію, гэты выйгрыш Латвіі — лебядзіная песьня гэтай краіны.

2. Захараў — ня трэнэр.

3. Кальцоў — не капітан.

4. Судзьдзя — прадажная шкура (фашыст фашыста чуе здалёк).

5. Усе гэтыя Сямёнаўсы, Панцялееўсы — самыя гнюсныя паліцаі. У Латвіі расейцаў дратуюць, а яны свае задніцы прадалі за пару латаў. Агідныя п…ы.

6. Сустрэнемся на ЧС і надзяром ім усім задніцу.

**Tallus**. Выкінуць гэтых фашыстаў з нашага чэмпіянату. Няхай гуляюць у сябе з рознымі там Вілкамі.

**Vlasa**. Немец падарыў пакрыўджаным латышам за 60-гадовую акупацыю Савецкага Саюзу Латвію. Латвія — падбрахачы фашысцкай Германіі. Судзьдзя — фашыст адназначна.

**Lelic**. А я так спадзяваўся, што нашы іх умыюць, ня толькі дзеля выхаду на Алімпіяду. А так хацелася прыбіць іх тупую прэзыдэнтку, зь яе загонамі на адрас расейскіх вэтэранаў. Сукі, Эўрасаюз яны, разумееш.

**GM10**. Апрача Верпакоўскіса (і той лох), у вас нікога няма. А прэзыдэнтка ваша проста ДУРА ФАШЫСЦКАЯ!!!!

**Fana F1**. Не перабірай меру, у … (у адрозьненьне ад прэзыдэнткі Латвіі) рукі ў крыві… ці ты гэтага ня ведаеш?!

**Окнешакул**. Штодня нам убіваюць у галаву, што Беларусь — гэта ня проста цэнтар Эўропы і славянскай цывілізацыі. Калі палац задумваем будаваць — дык абавязкова з прыпіскай «найбуйнейшы ў СНД»… калі пэнсіі выплачваем, дык самыя вялікія і самыя своечасовыя і г.д і да т.п. Мы страцілі пачуцьце меры і рэальнасьці. Мы імкліва самаізалюемся, пераконваючы сябе ў тым, што ў нас усё самае лепшае і ўнікальнае. Між тым палітыка «самі з вусамі» (тымі самымі) усё больш аддаляе нас ад перадавых краін і перш за ўсё тэхналёгій. У суперніцтве зь іншымі мы церпім усё больш параз НА ВЫЕЗЬДЗЕ, і гэта выразна відаць на прыкладзе спорту. Пачалося ў Атэнах, працягваецца цяпер, а што будзе ў Турыне — лепш і ня думаць.

Ніякі судзьдзя не перашкодзіць прафэсіяналу «дацісьнуць курок». Мы не дацісьнулі, у чым вінаватыя выключна самі. Пасьля бязьмежжа арбітра, пра якое тут шмат гавораць, мы вялі 4:2 за 4.50 да канца сустрэчы і 4:3 за 3.03. Прыгадайце гандбольнага гуру Мірановіча дый любога другога дасьведчанага трэнэра ў іншых відах спорту, якія ў падобных сытуацыях «гулялі паўзу» і прыводзілі ў прытомнасьць сваіх гульцоў. Чаму гэтага не зрабіў Захараў? Зноў пытаньне наконт прафэсіяналізму. А таксама наконт таго, як ён стаў трэнэрам і да якога цела бліжэйшая яго сарочка.

**засранка**. Блін! як пачытаеш водгукі беларусаў пра латышоў, валасы дыба ўстаюць! І хто ж пасьля гэтага фашысты?

# СЬЦІСЛА

## Паштальён сыходзіць

Знакаміты баскетбаліст Карл Мэлоўн («Паштальён») завяршае прафэсійную кар'еру. На працягу 18 гадоў Мэлоўн і Джон Стоктан складалі ўдарны дуэт у «Юце Джаз», які наводзіў жах на супернікаў. Мэлоўну, што ніводнага разу не станавіўся чэмпіёнам НБА, вельмі хацелася заваяваць чэмпіёнскі пярсьцёнак. Таму летась ён і перайшоў у «Лос-Анджэлес Лэйкерз», які пад кіраўніцтвам Рудзі Там'яновіча меў болей шанцаў на перамогу. На жаль, «азёрнікі» прайгралі ў фінале «Дэтройту Пістанз». За сваю кар'еру «Паштальён» набраў 36 928 балаў, саступіўшы па гэтым паказчыку толькі другой супэрлегендзе — Карыму Абдул-Джабару (38 387).

## Посьпех у фрыстайле і каньках



Мінулы ўік-энд быў пасьпяховы для беларускіх спартоўцаў на этапах Кубку сьвету па каньках і фрыстайле. Віцэ-чэмпіёнка сьвету ў мнагабор'і Анжаліка Кацюга (**на здымку**) заняла на этапе Кубку сьвету ў нямецкім Эрфурце на дыстанцыі 500 мэтраў першае месца і на дыстанцыі 1000 м — другое. У агульным заліку Кубку сьвету Анжаліка таксама другая. Фрыстайліст Аляксей Грышын на спаборніцтвах у Кітаі заняў у акрабатыцы трэцяе месца. Зьміцер Дашчынскі — пяты.

## Воля да посьпеху

Жаночая эстафэтная каманда па біятлёне (Кацярына Іванова, Вольга Назарава, Людміла Ананька, Алена Зубрылава) заняла трэцяе месца на чарговым этапе Кубку сьвету, што прайшоў на мінулым тыдні ў італьянскім Чэзанэ Сан-Сікарыё. І гэта нягледзячы на тое, што на першым этапе на крутым спуску Кацярыну Іванову, якая ішла другой, зьбіла з ног нарвэская лыжніца і зламала беларусцы вінтоўку. Пашанцавала, што Кацярына ўжо двойчы адстралялася. Іванова прыйшла на фініш восьмай, згодна з правіламі яна несла ў руках зламаную вінтоўку. Нашых дзяўчат няўдача не зламала, яны сканцэнтраваліся і занялі выніковае трэцяе месца. У агульным заліку Кубку сьвету беларускі пятыя. Восьмы этап Кубку сьвету пачаўся 16 лютага ў славенскай Паклюцы. А 6 сакавіка ў аўстрыйскім Абэргофе стартуе чэмпіянат сьвету.

## Мурыньо атрымаў узнагароду

У сераду на ўрачыстай цырымоніі ў Лісабоне партугальскі ўрад уганараваў мэдалём за спартовыя заслугі трэнэра лёнданскага футбольнага клюбу «Чэлсі» Жазэ Мурыньо. У 2003—2004 г. Мурыньо выйграў з «Порту» Кубак УЭФА і Лігу чэмпіёнаў. Узнагароду ўручаў сам прэзыдэнт краіны Жоржы Сампаю.

## Хварэем за «Жальгірыс»

У панядзелак у Барсэлёне адбылося лёсаваньне другога этапу баскетбольнай эўраліґі ULEB. Супернікамі каўнаскага «Жальгірысу» сталі гішпанскі «Таўгрэс», грэцкі «Панатынаікас», італійскі «Фартытуда». Супернікі маскоўскага ЦСКА — «Барсэлёна», «Рэал», «Скаваліні». Матчы пройдуць з 23 лютага па 31 сакавіка. У чвэрцьфінал з падгрупы выходзяць дзьве каманды.

**AP**




ІНФАРМАТАР

## Дыспэтчарскія і аварыйныя службы

**Пажарная ахова** т.01

**Міліцыя** т.02

**Хуткая мэдычная дапамога** т.03

**Менгаз** т.04, 236-12-27

**Дыспэтчар Менгарвыканкаму** т.065

**Менсктранс**
галоўны дыспэтчар 222-99-41
дыспэтчар гарадзкіх маршрутаў 222-99-62
дыспэтчар прыгарадных маршрутаў 222-99-42

**Вялейска-Менская водная сыстэма** т.237-71-37

**Гарадзкі аддзел аховы здароўя** т. 222-10-00

**ЖКА Беларускай чыгункі** т. 596-65-37

**Менскгарсьвятло (вулічнае асьвятленьне)** т. 227-32-10, 227-43-16

**Тэлевізійныя сеткі** т. 231-04-05, 239-31-20

**Менсквадаправод** т. 227-13-23, 226-16-23

**Менскія каналізацыйныя сеткі** т.227-60-27, 236-94-64

**Менсккамунцепласеткі** т. 269-99-53, 264-88-88

**Менскэнэрга** т. 229-18-52
даведка т. 229-18-09

**Менцепласеткі** т. 221-15-85, 221-15-86

**Тэлефонная сетка** т. 008, 252-33-34

**Упраўленьне жыльлёвай гаспадаркі** т. 232-22-13, 232-25-68

**Кабэльныя сеткі** т. 213-36-04, 239-81-52

**Аварыйна-выратавальны атрад МНС** т. 275-29-01, 275-69-01

КАІСА

# Уцякаюць мазгі

Кампазытар Яўген Дзьвізаў расказваў, што ў пачатку 1980-х падлетка Гельфанда бээсэсэраўскія спартовыя чыноўнікі не хацелі ўключаць ва ўсесаюзны турнір: маўляў, усё роўна зьедзе ў Ізраіль. Гадоў праз дзесяць ён і зьехаў. Разам зь іншым гросмайстрам-эмігрантам, віцьбічам Ільлём Сьмірыным, даваў чосу ізраільскім шахматыстам. Але змаганьне са слабейшымі не вядзе да вышыняў: цяпер Барыс Гельфанд ледзь уваходзіць у сусьветную дваццатку, а некалі ж быў пятым. Падупаў рэйтынг і ў Сьмірына, хоць летась ён упэўнена выйграў турнір на званьне абсалютнага чэмпіёна Віцебшчыны, дзе гулялі амаль усе наймацнейшыя ўраджэнцы краю. Затое някепска — для прадпэнсійнага ўзросту — адаптаваўся ў ЗША іхні былы трэнэр Альбэрт Капэнгут. Выйграе чэмпіянаты штату Нью-Джэрзі, піша артыкулы для прафэсійных выданьняў накшталт «Informator» і «New in Chess». За амэрыканскія клюбы зь пераменным посьпехам гуляюць былы мянчук Юры Шульман (гросмайстар) і берасьцеец Станіслаў Сьмятанкін (міжнародны майстар).

Хадзіла калісьці ў менскі гуртоК «Прахадная пешка» пэрспэктыўная дзяўчынка Наста Сарокіна. Стаўшы майстрам спорту, перабралася ў Аўстралію. Выступае за алімпійскую зборную гэтай краіны — праўда, зважаючы на ейны малавыя рэйтынг, маласпыяхова. Гросмайстар Юры Зязюлькін зьехаў на рубяжы стагодзьдзяў і ўладкаваўся ў Польшчы. Заняўся бізнэсам — прадае шахматныя кніжкі і камп'ютарныя праграмы. Настаўнік Аляксея Аляксандрава Міхаіл Шарашэўскі атабарыўся ў Баўгарыі, дый сам Аляксандраў, ангажаваны расейскім клюбам «Макс Вэн», нячаста ганаруе сваёй прысутнасьцю беларускія турніры.

Адчувальным ударам па белшахматах стаўся пераезд у Расею выхаванкі 11-й сталічнай школы Алены Тайравай, якая ў 7-гадовым узросьце дэманстравала бліскучую гульню, перамагаючы 12-гадовых. А.Тайрава, у адрозьненьне ад Н.Сарокінай, за мяжой пайшла ўгору. Падчас прыездаў у Менск дзяўчо ў камбінацыйным стылі кладзе на лапаткі суайчыньнікаў — летась, напрыклад, у мэмарыяле Верасава апярэдзіла чэмпіёна Беларусі.

Шмат хто з эмігрантаў апошняй хвалі вернецца ў краіну, як толькі тутака стане магчымым зарабіць капітал уласным інтэлектам. Пакуль жа масавая эміграцыя калег спараджае апакаліптычныя настроі ў малаДых гульцоў.

Сытуацыю ў шахматах добра ілюструе афіцыйны сайт Беларускай фэдэрацыі шахмат — у пачатку лютага 2005 г. апошнія навіны там датаваліся траўнем 2004 г.

Зрэшты, не паўсюль так адбываецца. Вось узбэк Рустам Касымжанаў, чэмпіён сьвету па вэрсіі ФІДЭ, не сьпяшаецца мяняць грамадзянства.

**ВР**

### Як бы вы згулялі?



**Т. Басбаом-Ланчава — Н. Сарокіна. Кальвія, 2004. Ход белых. Чорныя толькі што пайшлі канём з f6 на h5. Як абвяргаецца іхняя задума?**

ПАРТЫЯ З ГРОСМАЙСТРАМ



Кароткая ракіроўка — такім было аднадушнае рашэньне чытачоў (6...0-0). Найхутчэй, яно слушнае — у сваіх кнігах Давід Бранштэйн якраз рэкамэндуе шахматыстам будаваць гэткі «домік» для караля і за белых, і за чорных. Рэакцыя суперніка — 7. Kg1-f3.

Чакаем варыянтаў да панядзелка, 19:00 E-mail: nn@promedia.by з пазнакай «Каіса», SMS: 754-04-53, партыя online: bychess.narod.ru.

**Адказ:**

1. Kd5! Kg3 (1...cd? 2. Cc7) 2. Ke7+ Фe7 3. Kg3. Гэтую пазыцыю са здаровай лішняй пешкай грузінская шахматыстка, што выступае за Нідэрлянды, умудрылася ў рэшце рэшт прайграць.

ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ

### Пятніца, 18 лютага

**АНТ, 21.05**

«Нябесны капітан і Сьвет будучыні». ЗША—Вялікабрытанія—Італія, 2004, рэж. Керы Конран.

Комікс-рэтрафантастыка.

Прыгоды няўрымсьлівай журналісткі (Гвінэт Пэлтроў) і авіятара (Джуд Лоў) адбываюцца ў дзіўнай будучыні. Сьвет будучыні ў «Капітане» — гэта сінэфільскае рэтра 1940-х з адпаведнаю модай, прычоскамі, выцьвілa-казачным колерам і глыбокай пашанай да трэш-шэдэўраў эпохі халоднай вайны. Падводныя бойкі, навуковыя лябараторыі і бязвісныя зграі павэтраных робатаў створаны на камп'ютары, а ўвесь фільм здымаўся ў адным павільёне на блакітным фоне.

Карціна цікавая спалучэньнем высокіх тэхналёгій з тугою па старых коміксах. Ролю галоўнага ліхадзея выканаў сэр Лоўрэнс Аліўе, які памёр задоўга да здымак. Але камп'ютар ажывіў яго і прымусіў сыграць новую, пасьмяротную ролю.

### Субота, 19 лютага

**СТВ, 00.15**

«Горад Бога». Бразылія—Францыя—ЗША, 2002, рэж. Фэрнанду Мэйрэліш, Каця Лунд.

Драма.

Васьмігадовы Ракета марыць стаць фатографам, а ягоны сябар і аднагодак Мезенны далучаецца да бандытаў. Праз гады Мезенны — какаінавы кароль кварталу, а Ракета — фатограф, які здымае вайну бандаў.

Крымінальная сага паводле раману Паўла Лінса абапіраецца на традыцыі рэалістычнага лацінаамэрыканскага кіно, якое не ўнікае сацыяльных канфліктаў і разгортваецца ў сапраўдным «Горадзе Бога» — фавэлах Рыё-дэ-Жанэйра. Напярэдадні здымак у трушчобах абвясьцілі набор акцёраў — і 200 чалавек з вуліцы пасьля кароткіх майстэрскіх курсаў выканалі ў фільме галоўныя ды эпізадычныя ролі.

Дэбютная карціна кліпмэйкера Фэрнанду Мэйрэлішу была прадстаўленая на Канскім фэстывалі, намінаваная на чатыры «Оскары» і сабрала надзвычай багаты ўраджай узнагарод.

Але фільм быў забаронены ў Беларусі і, хаця ў тэлевізійную праграму пастаўлены, зусім ня факт, што гледачам дазволена будзе яго ўбачыць.

### Нядзеля, 20 лютага

**ЛАД, 21.30**

«Вялікая прагулка». Францыя—Вялікабрытанія, 1966, рэж. Жэрар Уры.

Эксцэнтрычная камэдыя на ваенную тэму.

Ангельскі самалёт падбіты над акупаваным Парыжам. Адзін зь лётчыкаў зваліцца на флегматычнага маляра Агюстэна (Бурвіль), другі — на дах Гранд-Апэра, дзе дырыжорам крыклівы Лефор (Люі дэ Фюнэс). Гэтая камічная француская парачка дапаможа саюзьнікам выбрацца з нашпігаванай нацыстамі тэрыторыі.

«Вялікая прагулка» двух комікаў і гумарыстаў не была першай сустрэчай Бурвіля і Люі дэ Фюнэса. Яшчэ ў 1964 годзе Жэрар Уры зьвёў абсалютна супрацьлеглых акцёраў у сваёй карціне «Недарэка». Тандэм выявіўся спраўным, і «Вялікая прагулка» атрымалася адной з самых бліскучых, вытрыманых і найлепшых камэдый за ўсю гісторыю кіно.

У самой Францыі фільм заставаўся лідэрам пракату больш за трыццаць гадоў, і кожны трэці жыхар краіны паглядзеў яго.

Але карціна цікавая ўсім. Гэта ня толькі трапныя й прадуманыя камэдыйныя моманты, праліччаная й лёгкая эксцэнтрыка і пекны адпачынак, але й мудры сьмех. Слабыя і пацешныя людзі пасвойму становяцца героямі, перадольваюць страх і дапамагаюць іншым. А погляд на самыя ганебныя старонкі гісторыі са сьмехам і нястрыманым гумарам дапамагае ня быць рабамі акупацыі.

Пакуль у беларускім кіно няма падобнай «акупацыйнай» камэдыі, варта паглядзець на чужы (і такі свой!) досьвед.

**БТ, 21.55**

«Чорная кошка, белы кот». Францыя—Нямеччына—Югаславія, 1998, рэж. Эмір Кустурыца.



Камэдыя-вясельле, карнавал-фарс.

Фільм, які можна глядзець бясконца зь любой хвіліны. Гэта гісторыя з «новымі цыганамі», разлучанымі закаханымі, чужым — і пацешным — вясельлем і шчасьлівым фіналам, цудоўнай музыкай.

Эмір Кустурыца адышоў ад змрочна-сьмешнай атмасфэры «Падпольля» і трагізму «Часу цыганаў». «Чорная кошка, белы кот» — гэта выключная й нястрыманая прывятлівасьць; галоўны нягоднік, які замест крыві трапляе ў прыбіральню і выціраецца гусямі (прывітаньне Рабле), — і крыкі ды скокі вясельля. Гэта абрад, які перамагае саму сьмерць.

Вобразы гангстэраў — «новых цыганоў» — Кустурыца ўзяў у Бабеля: бандзюгі нахабныя, але чульлівыя й сарамлівыя.

Замест сухой рацыянальнасьці ў Кустурыцы цёплыя «жыцьцёвыя» забабоны і казка пра чорную кошку й белага ката.

### Серада, 23 лютага

**ЛАД, 10.55**

«Канстанцін Заслонаў». Беларусь, 1949, рэж. Аляксандар Файнцымер, Уладзімер Корш-Саблін.

Гераічная драма.

Карціна зьяўляецца адной з падставовых у слаўнай сэрыі «Партызанфільму». Гераічны падпольшчык Канстанцін Заслонаў змагаецца супраць фашыстаў і мініруе цягнікі ў Воршы. Камуніст паказаны мармуровым, магутным, скульптурным. У 1949 г. сталінізм быў у росквіце — і лірычныя інтанацыі ў гераічнай драме не дазваляліся.

Але ўрачыстыя катурны мінулай эпохі цікавыя й сёньня: гэта й наіўна-недарэчна, і ўзорна-афіцыйна, і двухсэнсоўна-небясьпечна — калі ўлічыць падрыўную дзейнасьць галоўнага пэрсанажа.

## ІМПРЭЗЫ

**Легпрам, хімія і гігіена**

**З 22 да 25 лютага** ў НВЦ «Белэкспа» (Машэрава, 14) пройдзе XI Міжнародная спэцыялізаваная выстава «Беллегмаш-2005: «Абутак, вопратка, тэкстыль-2005», «Усё для краўца», V Міжнародная спэцыялізаваная выстава «Хімчыстка і пральня-2005», III Міжнародная выстава «Працоўнае адзеньне-2005» і II Міжнародная спэцыялізаваная выстава «Чысьціня і гігіена-2005».

Тамсама **18 лютага** — апошні дзень выставы «Беларускі дом-2005».

**100 гадоў**

**Да 4 сакавіка** ў галерэі «Ле-Сандр-арт» (Раманаўская Слабада, 24) працуе выстава «100 гадоў у мастацтве».

**ART-жыжаль**

**Да 23 лютага** ў галерэі «Інстытут культуры» (Кастрычніцкая пл., 1) праходзіць Другі міжнародны пленэр па кераміцы «ART-жыжаль».

**Манэ**

**Да 4 сакавіка** ў аддзеле мастацтваў Нацыянальнай бібліятэкі працуе выстава, прысьвечаная 165-годзьдзю Клёда Манэ.

**Твараноўіч-Сяўрук**

У Літаратурным музэі М.Багдановіча ідзе выстава драўлянай скульптуры Данілы Тваранoвіча-Сеўрука — «Шляхамі сьвятла».

**Індыя**

У Нацыянальным мастацкім музэі **да 16 сакавіка** працуе выстава «Мастацтва Індыі».

**Палац мастацтваў**

У Палацы мастацтваў **да 13 сакавіка** працуе выстава скульптуры.

**Пакаленьне NEXT**

**Да 2 сакавіка** працуе выстава «Next generation у беларускай скульптуры».

**Графіка**

У галерэі Леаніда Шчамялёва **да 2 сакавіка** працуе выстава графікі «Women & men. Андрэй Басалыга, Вольга Нікішына».

**Наркевіч-Ёдка**

У Нацыянальным музэі гісторыі і культуры **да 22 сакавіка** працуе выстава, прысьвечаная 100-годзьдзю са сьмерці Вітольда Наркевіча-Ёдкі.

**Нацыянальная бібліятэка**

**Да 22 лютага** на першым паверсе першага корпусу працуе выстава «Паштовая сувязь у Беларусі».

**24 лютага да 7 сакавіка** на другім паверсе першага корпусу працуе выстава, прымеркаваная да 70-годзьдзя Рыгора Барадуліна.

## ТЭАТРЫ І КАНЦЭРТЫ

**Філярмонія**

**Канцэртная заля**

**18** (пт) — Юбілейны вечар Сяргея Картэса.
**20** (ндз) — джазавыя сэзоны ў філярмоніі. Канцэрт ансамблю «Камэрата».

**Заля камэрнай музыкі**

**17** (чц) — канцэрт вакальнай музыкі «Памяць пра сонца».
**18** (пт) — канцэрт фартэпіяннай музыкі.
**19** (сб) — «Вечары царкоўнай музыкі». «Флейта ў музыцы барока».
**21** (пн) — канцэрт фартэпіяннай музыкі».

**Моладзевы тэатар эстрады**

**19 (сб)** а 19-й на Маскоўскай, 18а праект «Легенды Вялікага Княства» прэзэнтуе «Эўрапейскі фальклёр» — канцэрт беларускіх гуртоў, якія граюць ірляндзкую музыку. Цана квітка 4—6 тыс. рублёў. Т.: 222-82-96.

**ДК прафсаюзаў**

**17** (чц) — Уласная тэхніка граньня на гітары Энвера Ізмайлава.

**ДК МАЗ**

**17** (чц) — вечар гітарнай музыкі.

**Опэра**

**17** (чц) — «Вясельле Фігара».
**19** (сб) — «Мадам Батэрфляй».
**24** (чц), **26** (сб) — «Кармэн».
**27** (ндз) — «Травіята».

**Балет**

**18** (пт) — «Карсар».
**20** (ндз) — «Страсьці».

**Купалаўскі тэатар**

**17** (чц) — «Шалапуты».
**18** (пт) — «Згублены рай».
**19** (сб) — «Беларусь у фантастычных апавяданьнях».
**20** (ндз) — «Падступства і каханьне».
**21** (пн) — «Таполевая завея».

**Малая сцэна**

**17** (чц) — «Налу».
**18** (пт) — «Адчыніце кантралёру».
**19** (сб) — «Дом, дзе сьпяць прыгажуні».

**Тэатар беларускай драматургіі**

**18** (пт) — «Містэр Розыгрыш».
**19** (сб), **24** (чц) — «Адвечная песьня».
**20** (ндз) — «Жанчыны Бэргмана».
**23** (ср) — «Чарнобыльская малітва».
**25** (пт) — «П'емонцкі зьвер».
**26** (сб) — «Адэль».
**27** (ндз) — «Валянціна».

**Моладзевы тэатар**

**17** (чц) — «Хітрая закаханая».
**18** (пт) — «Сказ пра Гуску...».
**19** (сб) — «Банкрут».
**20** (ндз) — «На вачах у жаночай берагавой аховы».

**Тэатар імя Горкага**

**17** (чц) — «Вольны шлюб».
**18** (пт) — «Опэра жабракоў».
**19** (сб) — «Сунічная паляна».
**20** (ндз) — «Зязюльчыны дзеці».
**20** (ндз) — «Тэрмінова патрабуецца... самагубца».

**Музычны тэатар**

**18** (пт) — бэнэфіс заслужанага артыста Беларусі і Ўкраіны Арнольда Ранцанца «Я — проста актор».
**19** (сб) — «Шахеразада», «Новыя амазонкі».
**20** (ндз) — «Севастопальскі вальс».

**«Дзе я?»**

**17** (чц) — «Ня бойся быць шчаслівым».
**18** (пт) — «Рамантыкі».

## КЛЮБНАЕ ЖЫЦЬЦЁ

**Izюm** (206-66-18)
**17** (чц), 22.00 — «Royalty RNB»: dj Gaamer / dj Indus.

**Bronx** (288-10-61)
**17** (чц), 22.00 — dj Kulikov.
**18** (пт), 22.00 — жывая музыка.
**19** (сб), 23.00 — dj-bar.

**Белая вежа** (284-69-22, 239-16-00)
**17** (чц), 23.00 — «White Tower Party»: dj Top, dj Grizzly.
**18** (пт), 23.00 — «Technofuturica»: dj Slon (Санкт-Пецярбург), dj Pagalve (Вільня), dj GlebLuv, dj zVERb.
**19** (сб), 23.00 — dj Mihel, dj Dee.
**20** (ндз), 23.00 — dj Alex.

**Гудвін** (226-13-06, 626-13-03)
**17** (чц), 20.00 — жывая музыка.
**18** (пт), 21.00 — жывая музыка.
**20** (ндз), 20.00 — жывая музыка.
**21** (пн), 22.00 — жывая музыка.

**Бліндаж** (219-00-10)
**17** (чц), 23.00 — dj Egor.
**18** (пт), 23.00 — «Fluorescent Blind Rave»: dj Sapunov (Масква), dj Noche.
**19** (сб), 23.00 — «Blind Saturday»: dj Dust, dj Simone.
**20** (ндз), 23.00 — dj Egor.

**X-Ray** (223-93-55)
**18** (пт), 22.00 — dj Grizzly.
**19** (сб), 23.00 — dj Noche.

**Madison** (219-00-10)
**18** (пт), 22.00 — «Showroom Duo performance».




## КІНО Ў МЕНСКУ

**«Аўрора»** (253-33-60)
«Нью-ёрскае таксі» (прэм'ера): **18** (пт) 17.00, 19.00; **19, 20** (сб, ндз) 13.00 (іл), 15.00, 17.00, 19.00.
«Прывід Опэры» (2с): **18—20** (пт—ндз) 21.00.
«Пусты дом»*** («Кінафармат 4х4»): **18** (пт) 16.40, 18.40, 20.40.
«16 год. Каханьне. Перазагрузка» («Кінафармат 4х4»): **19** (сб) 16.40, 18.40, 20.40.
«Новыя казкі братоў Грым»**** («Кінафармат 4х4»): **20** (ндз) 16.40, 18.40, 20.40.

**«Берасьце»** (272-87-91)
«Прывід Опэры» (2с): **18** (пт) 15.40 (іл), 18.20 (іл), 21.00; **19, 20** (сб, ндз) 15.40, 18.20, 21.00.
«Падводная братва»: **18** (пт) 13.30; **19, 20** (сб, ндз) 11.30 (іл), 13.30.

**«Дружба»** (240-90-13)
«Скарб нацыі» (2с): **18** (пт) 20.30; **19** (сб) 18.30, 21.00; **20** (ндз) 16.00 (іл), 20.30.
«Падводная братва»: **18** (пт) 18.30; **19** (сб) 16.00 (іл); **20** (ндз) 18.30.

**«Кастрычнік»** (232-93-25)
«Нью-ёрскае таксі» (прэм'ера): **18** (пт) 15.00, 17.00, 19.00, 21.00; **19, 20** (сб, ндз) 15.00 (іл), 17.00, 19.00, 21.00.

**«Масква»** (203-14-48)
«Нью-ёрскае таксі» (прэм'ера): **18** (пт) 17.00, 19.00; **19, 20** (сб, ндз) 15.00 (іл), 17.00, 19.00.
«Апантанасьць» (прэм'ера): **18—20** (пт—ндз) 21.00.

**«Мір»** (288-22-33)
«Прывід Опэры» (2с): **18—20** (пт—ндз) 18.00, 20.30.
«Падводная братва»: **18** (пт) 16.00.
«Новыя казкі братоў Грым»**** («Кінафармат 4х4»): **18** (пт) 17.00, 19.00, 21.00.
«Японская гісторыя»*** («Кінафармат 4х4»): **19** (сб) 17.00, 19.00, 21.00.
«Пусты дом»*** («Кінафармат 4х4»): **20** (ндз) 17.00, 19.00, 21.00.

**«Перамога»** (203-77-66)
«Брыджыт Джонс: межы разумнага»***: **19, 20** (сб, ндз) 12.30.
«16 год. Каханьне. Перазагрузка»*** («Кінафармат 4х4»): **18** (пт) 14.40, 16.50, 19.00, 21.00.
«Пусты дом»*** («Кінафармат 4х4»): **19** (сб) 14.40 (іл), 16.50, 19.00, 21.00.
«Японская гісторыя»*** («Кінафармат 4х4»): **20** (ндз) 14.40 (іл), 16.50, 19.00, 21.00.

**«Піянер»** (227-64-87)
«Начная варта»***: **18** (пт) 14.40, 18.50; **19, 20** (сб, ндз) 14.20, 18.40.
«Пярэпалах у інтэрнацэ»***: **18** (пт) 17.00, 21.10; **19, 20** (сб, ндз) 16.40, 21.00.

**«Цэнтральны»** (200-34-16)
«Прафэсіяналы»: **18** (пт) 11.00, 12.50; **19, 20** (сб, ндз) 11.00 (іл), 12.50.
«Японская гісторыя»*** («Кінафармат 4х4»): **18** (пт) 14.40, 16.50, 19.00, 21.10.
«Новыя казкі братоў Грым»**** («Кінафармат 4х4»): **19** (сб) 14.40, 16.50, 19.00, 21.10.
«16 год. Каханьне. Перазагрузка»*** («Кінафармат 4х4»): **20** (ндз) 14.40, 16.50, 19.00, 21.10.

(іл) — ільготны сэанс (зьніжка 50% для ўсіх гледачоў)
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

## ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

**Тэатар юнага гледача**

**18** (пт), **24** (чц) — «Тарас на Парнасе».
**19** (сб) — «Маленькія трагедыі».
**19** (сб) — «Каліф-шавец» (эксьпэрымэнтальная сцэна).
**20** (ндз) — «Папялушка».
**22** (аўт) — «Палачанка».
**25** (пт) — «Паганага нораву варты плён».
**26** (сб) — «Шлях на Батлеем».
**27** (ндз) — «Маленькі лорд Фаўнтлерой».

**Тэатар беларускай драматургіі**

**20** (ндз) — «Айбаліт, Бармалей, пра жывёл і Брадвэй».
**26** (сб) — «Хрустальны туфлік».

**Балет**

**20** (ндз) — «Тры парасяці».

**Музычны тэатар**

**20** (ндз) — «Залатое кураня».

**Моладзевы тэатар**

**19** (сб) — «Давайце жыць дружна».

**«Дзе я?»**

**19** (сб) — «Новыя прыгоды старых знаёмых».

**Кіно для дзяцей**

**«Аўрора»**
«Шчаўкунок»: **18** (пт) 14.30; **19, 20** (сб, ндз) 12.00.
**«Дружба»**
«Геркулес»: **18** (пт) 12.00, 14.00; **20** (ндз) 11.00, 13.00.
«Каманда-33»: **19** (сб) 13.00.
**«Масква»**
«Алёша Паповіч і Тугарын Зьмей» («Выхадны — усёй сям'ёй!»): **19, 20** (сб, ндз) 12.00.
**«Мір»**
«Маленькія ўцекачы»: **18** (пт) 14.30 (сустрэча з творчай групай); **19, 20** (сб, ндз) 15.00.
**«Піянер»**
«Горад чарадзеяў»: **18** (пт) 11.00; **19, 20** (сб, ндз) 10.30.
«Гарэзы»: **18** (пт) 12.50; **19, 20** (сб, ндз) 12.20.

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Пусты дом для бадзяжнага дамавіка

Маўклівы юнак (Йе Хі) пранікае ў чужыя пустыя дамы. Там ён адпачывае, мые гаспадарскую бялізну, рамантуе зламаныя рэчы — і фатаграфуе сябе побач зь сямейнымі партрэтамі. Раніцай бадзяга зьнікае, нічога ня ўзяўшы. У адной з кватэр юнак сутыкаецца зь пекнай фотамадэлькай (Лі Сын-Ён).

Дзяўчына, уцякаючы ад злоснага мужа, далучаецца да дзівака — і яны пачынаюць вандраваць разам. Але калісьці вандроўкі скончацца: героі знаходзяць у пакоі труп...

Карціна Кім Кі Дука (ён да ўсяго і аўтар сцэнару), расьпешчаная ўзнагародамі Вэнэцыянскага кінафэстывалю, — пекная, паэтычная і гарманічная прыпавесьць, драма-загадка, дзе схаваны тайны — і ўсё навідавоку.

Для каханьня не патрэбны словы, таму міжсобку героі маўчаць — хлопец за ўсю карціну ня вымавіць ні слова. А ці ёсьць ён насамрэч, гэты бадзяжны дамавік, ці не прытрызьніўся гераіні?

Герой карціны выглядае рэальным. Спачатку гледачы бачаць яго бадзяжным матацыклістам. Потым — ён дробны злодзей, які пранікае ў кватэры. Але нашы тлумачэньні абмежаваныя — і мы трапляем у пастаўленую для нас пастку звыклага. Злодзей ня крадзе нічога, акрамя чужой хатняй утульнасьці, акрамя далучанасьці да сям'і ў пустым доме. Так цішком і руплива вядзе сябе дамавік, які ўпотайкі дапамагае гаспадарам і клапоціцца пра сямейнае шчасьце.

«Пусты дом» («Bin-jip»)
Паўднёвая Карэя — Японія, 2004, каляровы, 95 хв.
**Жанр:** драма, прыпавесьць.
**Адзнака:** 8 (з 10).



Але дамавік Кім Кі Дука — бадзяга і карыстаецца матацыклам. «Бесклапотны яздок», як і мае быць у маладосьці, заняты пракаветным клопатам хатніх памагатых і мае свае звычкі. Адна зь іх — гольф. Ангельская назва карціны — «3-Iron», што часам перакладаюць як «Клюшка для гольфу №3».

Герой і возіць з сабой клюшку — лупіць па мячыку для гульні, калі ёсьць такая магчымасьць. Мячык прывязаны — каб не палцеў, але аднойчы ён зрываецца, прабівае шкло ў машыне і, здаецца, насьмерць забівае жанчыну.

Адны з самых уражальных сцэн — сцэны ў турме, дзе бадзяга праз фізычныя практыкаваньні набывае здольнасьці быць зданьню, дваймком, чалавекам нябачным. Толькі закаханае сэрца здольнае ўбачыць яго.

У гэтай карціне Кім Кі Дук тактоўны, акуратны, стрыманы. Няма нічога лішняга.

Рэжысэр надзвычай удала выкарыстоўвае двайную экспазыцыю, а пацалунак юнака й дзяўчыны праз абдымкі мужа, які ні пра што не падазрае, — гэта трапная скульптурная расстаноўка, мэтафарычная й відавочная адначасова. Усё магчыма, калі кахаеш.

Кім Кі Дук даў такое тлумачэньне сваёй карціне: «Кожны з нас — пусты дом, які з трывогай чакае, каб хтосьці адкрыў нас і скраў...»

Крадзеж у «Пустым доме» прыводзіць да зьяўленьня пачуцьцяў.

**Андрэй Расінскі**

ЛЕВЫМ ВОКАМ



# Сьвята сярэдняга бізнэсмэна

Ідэал мужчыны сёньня — спонсар, гарант бясьпекі і бацька сямейства. Але ўжо праз 10 гадоў дзень 23 лютага нефармальна будзе ўспрымацца як сьвята абаронцы кампутара ад вірусаў. Прагноз **Лёліка Ушкіна**.

23 лютага — самае нелягічнае сьвята ў беларускім календары. Калі верыць афіцыйным крыніцам, фармальна мы сьвяткуем дзень, калі паўстала «рабоча-сялянская Чырвоная Армія» РСФСР. Я добра стаўлюся да РСЧА, але мне не падабаецца, што чырвоныя беларусы актыўна мачылі бел-чырвона-белых беларусаў — слуцкіх інсургентаў ці «балахоўцаў». Апроч таго, прынцыпы фармаваньня РСЧА абсалютна не нагадваюць сучаснага беларускага войска: Мальцаву ў галаву ня прыйдзе адмяніць вайсковы статут, павыганяць праваслаўных папоў і, урэшце, надаць жаўнерам права выбіраць камандзіраў ды міністра абароны.

Дзень абаронцаў Айчыны даўно ўжо страціў першапачатковы сэнс — прафэсійнага сьвята чырвонаармейцаў. І гэта ня першая мэтамарфоза 23 лютага. На працягу сваёй гісторыі канцэпцыя сьвята мянялася мінімум тройчы.

Да пачатку ІІ сусьветнай маштабы сьвяткаваньня не перасягалі межаў казармаў Чырвонай Арміі. Прычым у той жа дзень сьвяткавалі і экзатычны Дзень Чырвонага ліста.

У часы зэніту савецкага таталітарызму 23 лютага стала адзначацца як дзень усіх мужчын, бо ўсе яны раней ці пазьней праходзілі ці меліся прайсьці службу ў арміі. Нарэшце, у постсавецкі час, калі інстытут войска дэградаваў, 23 лютага стала сьвятам нейкіх якасьцяў, зьвязаных з мужчынскай біялёгіяй.

Як вядома, мужчынскі канон у грамадзтве фармуецца праз:

— канатацыі ў масавай культуры (кіно і літаратура);

— сымбалічнае значэньне дзяржаўнай палітыкі ў выяўленьні маскуліннага і фэміннага;

— працэс сацыяльна-эканамічнай вытворчасьці, які выражаны ў культурных рэпрэзэнтацыях.

На экранах у нас дамінуе «Антыкілер», на першых палосах газэт месьціцца самі ведаеце хто, а кабеты ад беспрацоўя згодны гуртам і ўраздроб прадавацца ў сэксуальнае рабства. Такім чынам, ідэальны мужчына сёньня — спонсар, гарант бясьпекі і бацька сямейства.

Калі шукаць прыблізны сацыяльны тып, які пасуе згаданым крытэрам, то гэта, на маю думку, будзе нейкі бізнэсовец сярэдняй рукі.

Чувак гэты пачаў «круціцца» яшчэ на досьвітку перабудовы, гэтак званыя бандыцкія часы — адсюль фізічная моц. Потым легалізаваў бізнэс і мае зь яго дастатковы навар, каб набыць жонцы норкавае футра. Нарэшце, будучы дзіцем савецкай патрыярхальнай культуры, ён лічыць, што сапраўдны мужык можа рэалізаваць сябе як асоба толькі праз інстытут сям'і (натуральна, ня швэдзкай).

Дзіўна тады, чаму б так і не назваць сьвята 23 лютага — Дзень сярэдняга прадпрымальніка?

Прызнаўшы факт зьмяненьня канцэпцыі сьвята ў часе, не магу ўстрымацца ад яшчэ больш правакацыйнага пытаньня: як доўга пратрымаецца згаданы мужчынскі канон, які адвочна зьяўляецца прадуктам цяжкіх часоў постсавецкай разрухі?

Ва ўмовах няспыннага росту ВУП, павелічэньня беспрацоўя, хуткай фэмінізацыі і росту аўтарытэту жанчын (вунь іх у парлямэнце аж 25%), трыюмфу новых тэхналёгій у бізнэсе, якія не патрабуюць удзелу ў разборках, ня можа не сфармавацца новы мужчынскі ідэал.

Мой прагноз сумны: праз дзесяць гадоў дзень 23 лютага нефармальна будзе ўспрымацца як сьвята абаронцы кампутара ад вірусаў.




Сучаснае беларускае мастацтва. Старонка 8.

Сябры спачуваюць Аляксею Янукевічу з прычыны сьмерці маці.
Смуткуем разам з табой.

Запрашаем у падарожжа
**20 лютага** (нядзеля)
**Менск—Смургонь—Жодзішкі—Гервяты—Міхалішкі—Варона—Варняны—Тракенікі—Астравец—Гудагай—Менск**.
20000 тыс.
**26—27 лютага**
**Вільня—Трокі—Меднікі**.
35 эўра (уваходзіць гатэль, віза, страхоўка, праезд, інфармацыйнае забесьпячэньне).
Т.: 232-54-58, 279-05-85, 622-57-20 (Зьміцер)
264-12-38, 776-24-35 (Павал)

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### СПАЧУВАНЬНЕ

**Аляксею Янукевічу**, які страціў МАЦІ, нашы шчырыя спачуваньні. Аляксей, трымайся! Сябры-фронтаўцы

### ВІТАНЬНІ

**Віншую Зьмітра Кухлея** і яго сынулю Люцыяна з днём народзінаў. Радасных, пераможных дзён Вам. Сяргей

**Алесь і Каця!** Віншую вас з Народзінамі! Добра, што вы ёсьць! Малады ненавуковец

### КАНТАКТЫ

**Хто любіць** сьпяваць пад гітару ці так — завітвайце! «Сьпеўнік беларускі» ў сеціве: bs.studenty.org

**Беларускія дыскатэкі** ў Баранавічах будзе ладзіць грамадзкая арганізацыя «Творчае згуртаваньне «Сьвятліца». Просім падзяліцца досьведам, зьвесткамі пра гурты і сьпевакоў, запісамі. Т.:0163-45-49-31, пасьля 21-й. E-mail: svtl@tut.by

**Куплю** ўзнагароды БНР, БЦР, БКА, манэты ВКЛ, Рэчы Паспалітай, фота ваенных (беларускія нацыянальныя фармаваньні ІІ сусьветнай вайны). E-mail: zmagar@yahoo.com. Т.: 722-46-04

**Цікавіць інфармацыя**, дакумэнты, фота, зьвязаныя з Булак-Балаховічам, «Зялёным дубам», «Чорным катом», беларускай партызанкай. Электронны адрас: zmagar@yahoo.com. Т.: 722-46-04

### КНІГІ

**Беларускія кнігі** можна знайсьці ці замовіць штодня на кніжным кірмашы ў к/з «Менск» (10:00—18:00). Т.: 637-38-41

**Прадам ці абмяняю** кнігі па гістарычнай тэматыцы, розныя нумары газэт ды часопісаў. Дапамагу знайсьці патрэбную кнігу. Т.: 753-91-96

**Вялікі выбар** дзіцячых кніжак, відэа, аўдыё, CD на Румянцава, 13 (ТБМ) ад панядзелка да пятніцы (12:30 — 18:30)

**Прадам кнігі**: «Археалёгія і нумізматыка Беларусі»; «Пан Тадэвуш»; «Наша Ніва» 1910; «Армія Краёва на Беларусі»; «Быкаў на Свабодзе»; «Дуліна ад Барадуліна» ды іншыя па этнаграфіі, гісторыі, паэзіі. Т.: 753-70-05

**Куплю** 4-ты том «Энцыкляпэдыі гісторыі Беларусі». Т.: 288-14-52 (увечары) ці 402-56-78

### ПРАЦА

**Беларускія** народныя строі: пашыў, аздоба. Т.: 201-39-75. Юлія

**Пошук працы**: набор, пераклад, выкладаньне, выдавецкія праекты, падрыхтоўка рукапісу, рэдактура, дызайн, распаўсюд, журналістыка, адміністрацыйная дзейнасьць. E-mail: alesknigi@mail.ru

Прыватную абвестку ў «НН» (ня больш за 15 словаў) можна падаць звычайным лістом (а/с 537, 220050, Менск), а таксама электроннай поштай на адрас nn@promedia.by або разьмясьціўшы на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

Наша Ніва
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| фотарэдактар | Арцём Лява |
| карэктарка | Настасься Мацяш |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
Наклад 3515. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 22.00 16.02.2005.
Замова № 805.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а